«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.
— Асобная кніжка — 50 гр. Заграніцу 3 зл. 20 гр. —

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.

«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.

«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Зьмест кніжкі 4 (17) „Калосься“

Бачына

1. Міхась Машара: З цыклю — Ваколіца сініх балот . . . . 193—195
2. Хвёдар Ільляшэвіч: Цымбалы 196
3. Максім Танк: З рубяжоў . . . . 197—198
4. М. Васілёк: Я сягоньня вызначыў спатканьне сонцу 198
5. Уладзімер Чэмер: Вялікі скарб нашай старасьвеччыны . . . . . 199—206
6. Сяргей Хмара: Палесьсе . . . . 207—208
   „ „ Ўюны . . . . 208—210
   „ „ Калыхала зыбку маці 211
7. Анатоль Іверс: Залацілася раніца 210
   „ „ На бруку 210
8. Я. Крыга: Шый, ды шый 211
9. С. Грынкевіч: „Учора“ і „сяньня“ . . . . . 212—217
10. Паўлюк Сірата: Таварышу маёй вёскі . . . 217
11. С. Каліна: Літаратура ў дадносінах да жыцьця 218—224
12. А. Дубровіч: Гэй, віхор шырокакрылы . . . 224
   „ „ Каліісь любові хмель вясьняны . 232
13. Ад. Станкевіч: З літуанізмаў у белар. мове . 225—226
14. М. Шкялёнак: Прадмет беларускай гісторыі . 227—232
   „ „ Сынтэза беларускай гісторыі (паводле праф. М. Доўнар-Запольскага) . . . . 233—237
15. Я. Шутовіч: 10 год літаратурнае творчасьці Міхася Машары . . . . 238—242
16. Я. Станкевіч: Мова крывіцкага (беларускага рукапісу XVI стаг. „Аль кітаб“ 243—252
17. Ул. Чэмер: М. І. Забэйда-Суміцкі ў Вільні . . 252—253
18. Хроніка . . . . 254—256

Вокладку запраектавала і выканала В. Пракаповічанка

Drukarnia Białoruska im. Franciszka Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

Кніжка 4 (17) 1938 г. Год IV

МІХАСЬ МАШАРА

З цыклю —

Ваколіца сініх балот

* * *

У сініх балот ёсьць крыніца,
там семдзесят восем вазёр.
Там пробуе ноч утапіцца
дажджом ападаючых зор.

І слухае сьпеў лебядзіны
хварбуючы воды зара,
калі над ваколіцай сіняй
сны сеяць
прыходзіць пара.

Зьвязалі вазёры пратокі
містэрным узорам адным,
а з ветрам сіта і асокі
гутораць, як з хлопцам жывым.

Адзін толькі месяц у чоўне
плыве тут па плёсе вады,
з затокі ў затоку з прасоньня,
як невад спусьціў павады.

Няма тут ні сьцежак ні тропаў
таптаных людзкою нагой,
а неба апёрлася стропам
над краем балот і вадой.

* * *

Прасторы, прасторы, прасторы, —
дзьмі вецер, гарцуй і скачы!
Вароты усе на запоры, —
зацíхла усё у начы.

Вандроўныя вольны дарогі,
ў прасторах ня зблудзіш нідзе,
над сьветам, як хмара, трывога
і нейкая немач брыдзе.

Спускаючы з прывязі слова
(бяз песьні ніяк не магу),
з нядоляй і доляй гатовы
спаткацца на кожным шагу.

Так сэрца прастору прасіла,
як птушку падкінь — паляціць.
Чаму-ж у ваколіцы сіняй
вясёлая песьнь ня зьвініць?

* * *

Дзяўчаты,
сялянкі,
сяляне,
чаму ў вёсках сяньнека ціш?
Мо' гора якое над вамі? —
Выносьце у поле на крыж.

Прастор ваш мо' спуталі межы,
мо' плён несабраны з палёў,
мо' чуеце з зорнае вежы
нябачныя звоны званоў?

Мо' кінуў на вас нагаворы
праходзячы міма чужы? —
Страсіце усё у прасторы,
хай з ветрам у далі бяжыць.

Чаго вашы сумныя вочы
шукаюць па голых палёх?
Мо' вецер штосьць вам напрарочыў
і смуткам на твары залёг?

* * *

Я ня знаю, пашто
і адкуль ты прышоў,
гэты сяньняшні, сумны, нярадасны дзень.
Восень лісьця і травы хварбуе у кроў,
на вясёлыя песьні паклаў нехта цень.

У гары —
там, пад сонцам, крычаць журавы,
заглядзеўся сасьняк у вазёрную сінь.
Сэрца сьціхні...
ня рвіся кудысь без пары,
мы — бяз скрыл —
мы за імі у даль не ляцім.

Там у сініх балот верасы адцьвілі,
а на мху восень жоўты заткала узор.
Мы застанемся тут —
на заціхшай зямлі —
лічыць будні
і сум ападаючых зор.

Адляцяць журавы і ў сівых туманох
ападзе на зямлю жоўталісьце усё, —
толькі будні адны
будуць мець на вачох
і нямую зямлю
і людзкое жыцьцё.

* * *

Сіні туман закурыў над балотам,
нечым варожыць у даль плывучы.
Што нас спаткае за першым зваротам:
радасьці сонца,
ці сумы начы?

Радасьць прыходзіць, як смутак і гора...
Часам на іх не чакаеш ані.
Грэхам ёсьць быць без патрэбы пакорным,
грэх ёсьць тушыць
без патрэбы агні.

Мы цяпер верыць старому — ня верым,
іншы затканы на кроснах узор.
Жыць калі хочыш,
то мусіш быць сьмелым,
сьмелыя сяньня
займаюць прастор.

Людзі усходзяць на іншыя сьцежкі...
Сэрцу ня трэба
ні кволасьць, ні дрож.
Шчырае праўды ня збрудзіш насьмешкай,
шчырая праўда
ня зьгіне усё-ж!

Дзікава. Восень 1938 г.

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Цымбалы

Тады — я памятаю — ў вуліцах аквечаных
ішлі ў сярмягах вы, ў сьвяточны дзень якраз.
Ніхто не згатаваў вам гучнае сустрэчы,
ніхто ня кінуў нават кветкаю у вас.
І з пальцаў вашых анясьмеленых
цымбалаў ураджайных хмель
і скрыпак сок рабінавы ня ўсьпеніўся вясельлем,
і ня буяніў брук, як хлопцы у сяле.
Віно вясковае у струнах зачараваных
вы панясьлі назад, пад крык хрыплівых труб,
у беларускія, шумлівыя дубровы,
дзе разьлівае рэха вашых струн тугу.
Зарана вы прыйшлі.— Над роднымі загонамі
ня ссыпаўся яшчэ нядолі жоўты ліст,
яшчэ ўсё сумным тонам ў лесе, у сасновым
хтось плача, як калісь...
Зарана вы прыйшлі.

Як пойдзем з тварамі сур'ёзнымі
ў расплаўленую песьняй звонкай даль —
разьвесім сонца мы над кожнаю бярозай,
раззвонім струны аж да сьнежных Альп.
Ўрачыста панясём цымбалы многазвонныя,
затопім жудзь вякоў у пене струн,
і будуць слухаць з падпёртай галавою
усе народы нашую ігру.

Я памятаю, як цяпер, — у вуліцах аквечаных
ніхто вас не спаткаў, ня кінуў кветку на'т...
Віно вясковае на пахудалых плячах
ў напеўныя дубровы вы нясьлі назад.

МАКСІМ ТАНК

З рубяжоў

прысьвячаю Таварышам Літоўцам

Гэта песьня прайшла праз гады і муры,
павуціньне парваўшы калючых дратоў.
Гэта песьня гарэла ў начы і гарыць —
і таму на цымбалы кладу яе зноў,
і таму — што сплываюць дні шумам з бяроз
на этапаў шляхі засыпаючы сьлед,
там, дзе месячным вецер зьвініць серабром
у разьвеенай раньняй імгле.
Сяньня пеніцца — бродзе рабінавы хмель
у грудзёх і у жылах мазолістых рук.
Толькі ўскінеш чупрыну — вішнёвая бель
ападае на
звонкае
полымя струн.

Засьцілайце сталы — валатоўкі зарой!
Дайце месца паганскім напевам сівым!
Мы за край апаясаны Нёмнам-ракой,
за вясну,
што на крыльлях
нясуць журавы
і за моладасьць даўніх баянаў-пяўцоў,
і за моладасьць нашу,
за дружбу і шыр
небасхілу, за даль неапетых шляхоў —
падымаем з гарачаю брагай каўшы!..

А за тых, каго вырай збудзіць не магла
з пад заломаных сумам
дарожных бяроз,
без пары чыя моладасьць перацьвіла,
чые вецер галосячы думы разьнёс, —
рана пойдзем нарогі стальныя вастрыць,
і па хвалях ральлі сеяць зоры зярнят,
каб напоўніць каўшы пенай жытняй зары
і над новым жыцьцём, і над сонцам падняць!

Толькі ў гэткія дні, трэба ў струнаў лады,
перастроіўшы, ўліць волі сталь, тонаў медзь, —
каб ад цьвету вачэй
і ад шчасьця яны
ня рвучыся маглі зіхацець і грымець.
Бо ўжо з нашых апошніх жыцьця рубяжоў
сокал межаў ня ўбача, гусьляр і ратай,
толькі стэп на усходзе ў агні каласоў,
а на захадзе —
мора сінеючы край.

Вільня, 11.XI.38.

М. ВАСІЛЁК

* * *

Я сяньня вызначыў спатканьне сонцу,
яго гарачы твар хачу расцалаваць!
На заклік твой, краіна, наша маці,
я сяньня вызначыў спатканьне сонцу...

З дзіцячай радасьцю і зыркасьцю арлінай
сачу я кожды міг, лічу шагоў удары —
ты, сонца, не марудзь—расплаў старыя дні нам!
Уквецім прышласьць мы... мінулае — з пажарам...

УЛАДЗІМЕР ЧЭМЕР

Вялікі скарб нашай старасьвеччыны*)

(*750 угодкі «Слова аб палку Ігаравым»*).

Цудоўная паэма, захапляючая сваей красой мільёны чытачоў, даваўшая натхненьне найлепшым мастаком паэзіі, высоўвае адначасна цэлы рад цікаўных і важных *навуковых* праблем і загадак, якія імкнецца вырашыць гісторыка-літаратурная крытыка. Тут пытаньні і аб аўтары паэмы, аб месьце, асяродзьдзі і часе яе паўстаньня; аб яе вусна-народных і літаратурных, родных і замежных, крыніцах, урэшце, — як гэта ня дзіўна гучыць, — аб яе аўтэнтычнасьці... Наколькі ўсе гэтыя пытаньні складаюць зложаную важную і навуковую праблему, відаць з таго, што навокал яе спарадзілася цэлая вялізарная дасьледчая літаратура, якая ўсьцяж расьце. Даволі сказаць, што ў зьвязку з юбілеем „Слова" слаўны французскі вучоны-славіст, праф. Андрэ Мазон, распачаў у канцы мін. году ў Парыжы цэлы спэцыяльны курс, прысьвечаны паэме, якога ня скончыў яшчэ да бягучых дзён. Праф. Мазон якраз належыць да вельмі ўжо рэдкік у нашыя часы прадстаўнікоў так званай „сцэптычнай школы", якая, коратка кажучы, не прызнае „Слова" памяткай XII веку, але ўважае паэму, так ці йнакш, „падробленай" ці мат пазьней—на падставе цэлага раду іншых памятак, краёвых і замежных.

Ня маем тутака магчымасьці спыняцца на ўсіх гэтых, вельмі скамплікаваных, пытаньнях. У гэтай юбілейнай стацьці разгледзім з іх толькі адно, якое хіба-ж найбольш зацікавіць шырокія кругі нашых чытачоў-беларусаў, пытаньне — *аб месьце і асяродзьдзі паходжаньня паэмы*. Адказ на гэтае пытаньне адкажа нам адначасна і на пытаньне аб тым, *да каго належыць гэтая паэма, які народ у нашыя часы можа з найбольшым правам залічыць да скарбніцы сваей літаратуры гэты непараўнанай красы і цэннасьці твор*.

Трэба ведаць, што свае правы і прэтэнсіі на паэму, як на выключную ўласнасьць сваей культуры і паэзіі, заяўляюць, таксама, як мы, беларусы, — і расейцы і украінцы; заяўлялі ня так даўна нават — палякі ды чэхі.

„Найпрасьцей" вырашаюць гэты „спор славян между собою" расейцы. Паэма, кажуць яны, паўстала бясспрэчна — або на Чарнігаўскай зямлі, або на Кіеўскай. Але-ж Кіеў, як пісаў яшчэ летапісец, — „мать городов русских"; Чарнігаў — малодшы брат Кіева. Абодва ляжаць на „адзінай Рускай Зямлі", аб якой усьцяж кажа сам аўтар „Слова", а якая належыць цяпер

*) Глядзі № 2(15)—3(16) „Калосься".

да Расеі. Дык — ясна-ж, як сонца: „Слова“ — уласнасьць Расеі, расейскай нацыі, гісторыі яе літаратуры і культуры, як і ўсё іншае, што спарадзілася на яе шырокіх прасторах.

Можа ўсё гэта было запраўды вельмі „ясна і проста“, пакуль „адзіную Рускую Зямлю“ пакрывала таксама адзіная і аднолькавая афіцыяльная расейская дзяржаўнасьць, культура і літаратура, — *пакуль не адрадзілася да новага жыцьця асобная нацыянальная сьведамасьць беларускага ды украінскага народаў, якая ставіць сабе задачай адбудову ды далейшую разбудову свайго ўласнага культурна-нацыянальнага дый дзяржаўнага сьвету.* Таму расейскія навукоўцы, зрабіўшы нямала для навуковага вывучэньня паэмы, не паглыблялі „залішне“ гэтае праблемы. У нашыя часы цікавячае нас пытаньне разраслося ў цэлую вялікую і зложаную праблему, над высьвятленьнем якой працуе навуковая думка — ўжо ня толькі расейцаў ды чужынцаў, але і беларусаў і ўкраінцаў. У глыбіні сваей адроджанай нацыянальнай душы, зьвязанай з найдалейшай гісторыяй сваіх родных зямель, з душою іх старадаўнага жыхарства, украінскія і беларускія дасьледчыкі знайшлі новыя жаролы інтуіцыі, новыя сугуччы паміж роднай сучаснасьцю і роднай мінуўшчынай — для высьвятленьня і вытлумачэньня тых фактаў, міма якіх праходзіла думка расейскіх і замежных навукоўцаў, не зварочваючы на іх належнай увагі.

Расейскія дасьледчыкі, задавольваліся, так сказаць, „палітычнай лёкалізацыяй“ паэмы — у межах „адзінае Рускае Зямлі“, адзінага „рускага народу“. Беларускія і ўкраінскія — зірнулі глыбей. Яны, першым чынам зьнялі, так сказаць, праблему з гэтага грунту — *неіснаваўшага ў тыя часы „адзінага рускага народу“*, — дый перанесьлі яе — больш навукова — *на грунт рэальна існаваўшых тады плямёнаў і іх яшчэ вельмі слабых палітычных аб'яднаньняў.* Такім чынам — *на першы плян выплывае пытаньне аб тых плямёнах, з якіх зложылася тая ці іншая група „ўсходніх славян“:* расейская, украінская і беларуская, — якія ў нашыя часы *ўсе* дасьпелі ўжо да сьведамасьці і становішча *народу-нацыі.*

Калі мы так падойдзем да праблемы, паставіўшы пытаньне, *на абшары якіх плямёнаў спарадзілася наша паэма, дык акажыцца, што спрэчка аб правы ўласнасьці абмежыцца ўжо толькі двума прэтэндэнтамі — украінцамі ды беларусамі.*

У апошнія часы асабліва разьвілася так званая „філёлёгічная мэтода“ досьледаў у галіне гісторыі. Гэтая мэтода і аказалася ў руках беларускіх дасьледчыкаў тэй непамыльнай прыладай, якая бясспрэчна вырашае наша спрэчнае пытаньне на карысьць беларусаў. Чытачы нашага часапісу, пэўне-ж, памятаюць зьмешчаную ў яго першай кніжцы (1935—№ 1) стацьцю д-ра Я. Станкевіча пад наз. „Северане — беларускае племя“. Ядсылаючы чытача да гэнага артыкулу нашага філёлёга, напомнім тутака коратка, што ён, апіраючыся галоўным чынам на ведамай працы праф. Растаргуева аб беларускім дыялекце Чарнігаўшчыны і Трубчэўшчыны,*) высьвятліў, можна сказаць, з канчальнай яснасьцю, сваю тэзу — *аб беларускім характары племя Северан.*

„Значэньне належнасьці Северан да беларускага народу вельмі вялікае, кажа аўтар у заключэньні, — дзякуючы гэтаму, гісторыя беларускага народу і гісторыя яго культуры ладне багатшая й размавітшая. Прыкладам, *найслаўнейшы ў усей Славяншчыне ў сяр[эд]нявечу эпічны твор „Слова аб палку Ігаравым“ паўстаў у Северска[й] зямлі. Гэта паэма — аб паходзе Северскіх князёў на Полаўцаў. Ведаючы, што Северане — беларусы, нельга сумлявацца, што „Слова“ — твор беларускі“.*

Інакш даходзіць да таго-ж самага канчальнага вываду ранейшы беларускі дасьледчык, ведамы гісторык культуры, В. Ластоўскі.

„Ядкінуўшы ўсякія меркацыі, навеянымі фальшыва-патрыётычнымі пабудкамі, піша ён, „Слова аб палку Ігара“ не зьяўляецца творам народным“..., але „тыповай песьняй князёўскага трубадура, які і ў нас, як і на Захадзе, ішоў разам з князям на вайну, прыглядаўся да ўсяго, і сьпісываў вершам пахвалу свайму князю“. „Князі-русы былі патомкамі Норманаў і яны ў сваіх паступках стараліся ўва ўсім патвараць заходня-эўрапэйскаму рыцарству“.**)

Найбольшую цікавасьць для нашага пытаньня становіць у паэме тое, што яна шмат месца і ўвагі прысьвячае беларускім князём, землям, местам і справам. Аўтар дасканала ведае палітычны стан і падзеі Кіеўшчыны і Чарнігаўшчыны, а таксама пасобных княстваў, князёў-учасьнікаў паходу, што зусім ня дзіва, бо-ж ён і сам — учасьнік і пясьняр паходу гэных князёў, блізкіх крэўнякоў кіеўскага вялікага князя. Але — важнейшае, для нас, беларусаў, тое, што пясьняр *ноўгарад-северскага князя дасканала ведае гісторыю і тагачасны стан рэчаў Полаччыны, Меншчыны, Горадзеншчыны, аб беларускім пляменным характары* якіх не паўставала ніколі ніякіх паважных сумліваў і спрэчак. Цэлых *шэсьць* абзацаў, некаторыя з іх нават й вельмі значныя, прысьвячае аўтар „Слова“ князём і справам гэтых беларускіх зямель, укладаючы ў апавяданьне аб гэных сумных падзеях — і на Дзьвіне і на Нямізе — рацэ — нянменш сардэчнага жалю, як і ў слаўны на ўвесь сьвет „плач“ сваей Яраслаўны з Пуціўля.

Я гэта-ж, тым больш паказальна і важна для нашай беларускай тэзы, што Полаччына, Меншчына і Горадзеншчына ня былі зусім зьвязаны з Кіеўскім цэнтрам, як была Чарнігаўская зямля, якая ахоплівала абшары князёў, прыймаўшых учасьце

*) „Северско-белорусский говор“. Исследование в области диалектологии и истории белорусских говоров. Ленинград. 1927 г.

**) В. Ластоўскі — „Гісторыя Беларускай (Крыўскай) Кнігі“. Коўна 1926 г., бач. 48.

ў паходзе Ігара. Тры гэныя абшары даўно стварылі свой уласны палітычны цэнтр у Полацку, жылі самастойным жыцьцём і, як відаць нават з самога „Слова", вельмі варожа адносіліся да Кіеўскага цэнтру ды рэшты „Рускае Зямлі". Уяўленая ў „Слове" спроба князёў сярэдняга паміж Кіевам і Полацкам абшару,— аднак таксама бясспрэчна беларускага пляменнага характару— *спроба выламацца з-пад гегемоніі кіеўскага нэнтру* набывае, у зьвязку з усім, што сказана вышэй, асабліва цікаўнага для нас сэнсу і значэньня.

Зусім правільна дзеля гэтага В. Ластоўскі паклікаецца ў заключэньні на словы ведамага зьбіральніка і дасьледчыка народных беларускіх песьняў, Безсонава, што — „тварэц „Слова аб палку Ігара" — ураджэнец, выхадзец, або нават жыхар Беларускага краю". „Бо толькі выхадзец або жыхар краю, — дадае В. Ластоўскі ад сябе, — мог так горача апяваць мясцовых герояў, хоцьбы і па былінах старых часоў, і так добра быць пасьвячоным у мясцовыя падзеі і інтэрэсы. Гэткім чынам, „Слова аб палку Ігара", — канчае ён, — будучы помнікам не народнай, а дружыннай паэзіі, дзякуючы яго паўстаньню на нашай тэрыторыі і апяваньню ў ім падзей з нашай гісторыі, павінна быць залічана да помнікаў крыўскай (беларускай) пісьменнасьці".*)

Трэба, аднак, як нам здаецца, узяць справу яшчэ крыху глыбей, а адначасна — шырэй. Аналітычна паглыбіць, а адначасна — сынтэтычна пашырыць агульныя вывады. Дазволім сабе, наколькі здолеем, зрабіць гэтую спробу.

Пляменна - тэрыторыяльнае паходжаньне паэмы—блізу бясспрэчна. Зямля, краёвы грунт, пляменны „субстрат" пад гэтай, хай сабе — „не народнай", але „рускай", гэта значыла тады: *княжска-дружыннай* паэмы — таксама блізу бясспрэчна — беларускія. Даведзена навукова — бясспрэчна (Растаргуеў, Станкевіч і інш.), што Северане — беларускае племя, як беларускім пляменным зьяўляецца і блізу ўвесь абшар князёў-учасьнікаў паходу. Але-ж гэта далёка *ня тлумачыць усяго ў нашай паэме.* Спароджаная на беларускім абшары, тэрыторыяльным і пляменным, *паэма выходзіць далёка па-за межы гэтага абшару.* Ня менш, калі ня больш, важны ў ёй якраз яе *княжска-дружынны, ці, як вязалі тады з гэтым, — „агульна рускі сэнс"*, які выразна вядзе аўтара і яго твор — з Северскай, ці Чарнігаўскай зямлі — *да кіеўскага цэнтру...* І якраз на гэтым шляху, ці на гэтым скрыжаваньні шляхоў, і трэба шукаць — *ідэю ўсяго твору, шукаць яго запраўднага зьместу і сэнсу.*

Найбліжэйшы *да сэрца* аўтара герой яго паэмы—бясспрэчна — северскі князь Ігар. Яго імя носіць уся паэма. З ім жыве, яго кахае, з ім нанова ў паэме перажывае сугучна ўсе яго ра-

---

*) В. Ластоўскі, ibidem, бач. 50.

дасьці і трыумфы, як роўна беды і жахі, яго баявы таварыш, яго пясьняр — аўтар паэмы. Ігар —запраўдны герой гэтага беларускага абшару, з яго цэнтрам у Ноўгарад-Северску, зьвязаны з роднай Зямлёй-Прыродай. Таму — за яго так моцна стаіць уся Зямля-Прырода — і неба, і зямля, і вецер, і рэкі, і зьвяры-на і птушкі... Ігара кахае ня толькі яго дружына, але і ўвесь народ. „Сумна Рускай Зямлі бяз Ігара"... „Веселы краі і месты", калі Ігар вяртаецца з палону жывы дамоў. Дружыньнік-пясьняр захапляецца *асабістай адвагай* свайго князя, рызыкай яго паходу, яго імкненьнем здабыць, на свой страх, славу сабе, сваім падручным князём і сваей дружыне... Ува ўсім гэтым відаць жывую душу — мясцовага, северскага, удзельнага, бунтуючага, разам із сваім фэодальным князям,— проці кіеўскага сюзэрэна (гаспадара) — дружыньніка-патрыёта. Жывая душа песьняра разумее і высока цэніць гэтую буйную волю, свайго князя, хоча верыць у яго, як кажуць „шчасьлівую зорку".

Але-ж ня ў гэтым усім запраўдны сэнс паэмы. І тут выступае, так сказаць, „другая душа", ці „другая палавіна" душы аўтара.

Запраўды-ж, як Гётэ, у ведамым сваім вершы, і наш аўтар мог-бы сказаць, што ў ім жывуць дзьве душы, адрываючыся балюча адна ад аднэй...

Тады, як адна душа песьняра Ігарава кахае свайго героя, другая душа, ці, скажам, „дух" яго — *строга судзіць яго за яго кардынальныя грахі і памылкі...*

Адносіны аўтара да свайго героя ламаюцца. Сваей *неразважнай адвагай* герой паэмы нарабіў шмат вялізарных бедаў — і сваей зямлі і ўсей „Зямлі Рускай"... Гэта — герой трагічны, і яго „трагічную віну" добра разумее аўтар паэмы. І тут набірае сілы тое, што трэба назваць *„кіеўскай орыентацыяй"* аўтара „Слова", разумеючы пад „Кіевам" *палітычны, а мо' вярней „ідэолёгічны" цэнтр усяе тагачаснае княжскае сыстэмы аб'ядпаньня „Зямлі Рускай"*, номінальнае адзінства якой, як ведама, усьцяж крывава нарушалася спрэчкамі ды войнамі „аднакроўных" князёў.

Як бачым, гэнае „адзінства", як *палітычная ідэя,* знаходзілася ў пастаяннай вострай супярэчнасьці з *жывой палітычнай рэальнасьцю* тадышніх часоў, як аб гэтым сьведчыць хацяжбы самае „Слова".

Але-ж ня можна пярэчыць таму, што і сама ідэя адзінства, ці аб'еднаньня мела ў сабе вялікую сілу пераконаньня і дзейнасьці.

Як мы казалі, палітычны, ці ідэолёгічны цэнтр „адзінае Русі" аўтар бачыць у Кіеве. Кіеўскі вялікі князь таму зьяўляецца ў яго вачох высокім, законным носьбітам гэтай ідэі. А стуль вынікае, што — побач з найбліжэйшым *да сэрца,* да *кахаючай* палавіны яго душы, першым яго героям, Ігарам, — вырастае за ім, а нават *і над ім — другі герой паэмы, вялікі князь кіеў-*

скі Сьвятаслаў. „Другая палавіна душы“ аўтара падвойна захопліваецца гэтым сваім героем і веліччу яго пасаду і яго асабістай развагай і павагай. Вял. кн. Сьвятаслаў зьвяртаецца з заклікам да валадароў усяе „зямлі рускай“ — ад (Суздальскага) князя Усевалада, які „можа Волгу вясламі раскрапіць, а Дон шаломамі выліць“, да Галіцкага князя Яраслава Осмомысла, які „падпёр горы Угарскія сваімі жалезнымі палкамі“ дый мае ў сваіх руках ключ ад брамы дунайскай. Зьвяртаецца, як маючы на гэта і права і абавязак...Характэрны і важны, для агульнага разуменьня паэмы, той жудасны сум, з якім аўтар, як быццам праз вусны вял. кн. кіеўскага, сьцьвярджае, што, нажаль, гэтаму носьбіту ідэі „адзінства Русі“ *няма да каго зьвярнуцца ў Полацкай зямлі...* Жудасны абраз таго стану разрухі і спусташэньня, да якога давялі Полаччыну — „Яраслаў і ўсе ўнукі Усеслававы“, належыць да найлепшых па гістарычнай праўдзе, па мастацкаму характару і па сіле ўражаньня — абразоў паэмы. У дужках адзначым ізноў, што так сумаваць, кахаючы, можна толькі над роднай, а прынамсі над вельмі блізкай зямлёю...

Як і Ігара, і Сьвятаслава кіеўскага аўтар надзяляе надпрыроднай магічнай сілай. Ён — блізу вяшчун, яму сьніцца „вешчы сон“. За ім — гістарычная слава грознага пераможцы паганых полаўцаў.

Калі Ігар ноўгарад-северскі выступае ў паэме, як „трагічны герой“, якога дадатнія староны і заганы якраз і ствараюць завязку і ўсю драматычную *дынаміку* паэмы, Сьвятаслаў кіеўскі выступае, як носьбіт нікаторага *статычнага* мамэнту, — закону, нормы, ідэі. *Таму — праз вусны гэтага другога героя — аўтар выказывае ідэю ўсяе паэмы,* аб гэтым і кажа знамянітае „залатое слова“ Сьвятаслава, „зьмяшанае са сьлязамі“... Яно прызнае і адвагу малодшых князёў, — „сыноўцаў“ вялікага князя, і іх права „шукаць сабе славы“... Але трэбуе, каб усё гэта рабілася *„чэсна“*... Каб, шукаючы сабе славы, яны не нарабілі бяды Зямлі Рускай, ні ганьбы павазе („сярэбранай сівіні“) вялікага князя кіеўскага... Трагічная памылка Ігара і яго таварышоў — у тым, што яны захацелі *„похітімі“* сабе славу, гэта значыць — незаконна, *„ня чэсна“*, як кажа „залатое слова“ Сьвятаслава, ухапіць яе для сябе, каб пасьля „падзяліцца“ гэтай славай з іншымі князямі... Памылка Ігара і яго таварышоў была ў тым, што яны асобна, ад іншых князёў Зямлі Рускай, а галоўна — цішком ад адказнага прадстаўніка яе адзінства — наладзілі паход на полаўцаў, які скончыўся — *бо-ж павінен быў, па думцы аўтара, у зьвязку з ідэйнай канцэпцыяй яго паэмы, скончыцца — катастрофай...* Адтуль і „сьлёзы“ гэтага „залатога слова“ Сьвятаслава.

Ясна, што ў гэтай сваей агульнай ідэі паэма мае бясспрэчна „кіеўскую орыентацыю“. І толькі ў такім сэнсе можна прызнаць прэтэнсіі на яе з боку ўкраінцаў. Пры такой разьмяжоўцы, здаецца, даволі лёгка было-б пагадзіцца нам з нашымі паўдзённымі братамі. Бо-ж — ані на кіеўскае „праваднрства“, ані на „адзінства Рускае Зямлі“ беларусы наагул ня маюць ніякае прэтэнсіі.

„Дух“ паэмы — кіеўскі, ці ўкраінскі, але яе „душа“, яе сэрца, як яе месца нарадзінаў, яе племенны грунт, блізу ўся „яе эпічная тэматыка, увесь яе дынамічны драматызм—бясспрэчна беларускія.

Родная аўтару Севершчына ляжала якраз паміж дзьвумя найвялікшымі, *а галоўнае — найбольш рознымі асяродкамі даўнейшай,* у сьведамасьці аўтара „Слова“ — *„адзінай Русі“.* Полацкі цэнтр меў з *заходу,* ад сваіх літоўцаў блізу зусім такія-ж клапоты, як кіеўскі — з *усходу*, ад полаўцаў. Першы цэнтр, з усімі „цягнуўшымі“ да яго абшарамі, быў выразна беларускім, як другі — у большасьці — украінскім. Полацкая Зямля, у шырокім сэнсе слова, жыла зусім асобным жыцьцём. І гэта вельмі ярка адбіваецца і ў самай паэме. Полаччына, як відаць і з летапісаў, блізу ня была зьвязанай з „Кіеўскай Русьсю“. Чаму-ж гэта ў нашым „Слове“ яго аўтар — ня толькі ведае і апавядае з задзіўляючай дакладнасьцю ўсе падзеі Полацкага абшару, але яшчэ і з роўным сардэчным жарам і жахам сумуе над лёсам Полаччыны, быццам над лёсад роднай Маткі-Айчыны?.. Вось гэты бясспрэчны факт, як нам здаецца, спараджае наймацнейшыя сумлівы адносна тэзы аб „украінскай вылучнасьці“ паэмы. Родная аўтару Севершчына, лежачы паміж гэнымі племенна і палітычна рознымі абшарамі і цэнтрамі — Кіеўшчынай і Полаччынай—і *душою неяк разрывалася паміж імі.* З гэтуль павінна была выплываць, з неабходнасьцю, і тая супярэчнасьць паміж „дзьвюмя палавінамі душы“ аўтара паэмы, якую мы сьцьвердзілі на падставе аналізы зьместу яго паэмы. Але, як і ў вершы Гётэ, „абедзьве душы“ аўтара — адначасна — і жывуць у ім і імкнуцца адарвацца адна ад аднэй. „Кіеўская“ душа аўтара, душа княжскага дружыньніка-песьняра, хоча ахапіць усю Рускую Зямлю ў адзінае цэлае; северская душа яго выяўляе сэпаратныя імкненьні свайго абшару і яго князёў. На гэтай *антытэзе* — ідэолёгічнага, палітычнага адзінства „Рускай Зямлі“ (выплываўшага сьпярша — з адзінства варажскага пануючага слою) і сэпаратызмаў паасобных яе земляў, розных і племенна і „гео-палітычна, — і пабудавана ўся ўнутраная дынаміка паэмы. У гэтым, як бачым, глыбака ляжачым у прыродзе рэчаў гістарычным канфлікце — увесь драматычны „патос“ паэмы. Норма адзінства — статычная ідэя паэмы—рэзка супярэчыць факту—жыцьцёвай дынаміцы тагачасных падзей. У гэтым жывая гістарычная праўда паэмы.

Нам астаецца толькі паказаць, як усё гэта адбілася — з неабходнасьцю — на тым, што можна назваць, у шырокім сэнсе

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

слова — *„стылям“* паэмы. Дасьледчык паэмы Добрынін („Полымя Рэвалюцыі“, 1937 — XI) кажа, што яе аўтар, як у агульнай будове паэмы, таксама ў яе жывой тканіне, шырака карыстаецца *„фігурай антытэзы“*. Запраўды-ж, антытэза зьяўляецца як быццам галоўнай стылістычнай мэтодай паэтыкі аўтара „Слова“. Ведамы афорызм Бюффона кажа: „стыль, гэта—чалавек“. Такім чынам, ідучы ад твору к тварцу, мы ізноў прыходзім да разгледжанай вышэй супярэчнасьці абедзьвюх душаў аўтара: северскай і кіеўскай.

Верны свайму князю, ён — яшчэ больш верны сваей ідэі палітычнага адзінства Русі. Нарушэньне князям Ігарам закону гэтага адзінства, паміма фатальных рэзультатаў яго палажэньня, адкрывае ў душы аўтара „драматычную пэрыпэтыю“, якая разрывае на палавіны яго душу. З гэтага раздваеньня і выплывае ўся драматычная *антытэтычнасьць* паэмы, якая якраз і састаўляе ўсё жыцьцё, усё дынамічнае адзінства паэмы, яе рух, патос.

Антытэза — фігура, якая выражае, ці адбівае — спрэчку, канфлікт, барацьбу. Барацьбу паміж супярэчнымі зьявамі, ідэямі, паняцьцямі, абразамі, якія, аднак, нейкай сілай і сувязяй злучаны паміж сабой... Ясна, якую сілу павінна здабыць гэтая фігура ў стылі паэмы, якая ня толькі вонкавым зьместам сваім мае вайну, але па сваёй унутранай сутнасьці, па самай сваей „рацыі быту“ —драматычную сутычнасьць цэлага раду такіх супярэчных, але адначасна зьвязаных у „пары“ паняцьцяў: адзінства і частковасьць, мір і вайна, самаволя і дысцыпліна, норма і факт адвага і развага, сэрца і розум, князі і ханы, перамога і паражэньне, паход і ўцёкі, палон і воля і г. д. Такіх „параў“ можна ў паэме налічыць без канца... І іх унутраны дынамізм з задзіўляючай сілай, з непараўнаным паэтычным мастацтвам, з бліскучай яркасьцю стылістычнаю — контрастнага эфэкту — умее выкарыстаць геніяльны мастак стылю — няведамы аўтар „Слова“. І гэта, зразумела, таму, што гэты драматычны кантраст, гэтая прынцыповая антытэза — найглыбейшая аснова ня толькі ўсей паэмы, ня толькі ключ да жывой, але падзеленай на дзьве супярэчныя палавіны душы аўтара, але—у найглыбейшым сваім корані — рэальная гістарычная аснова, палітычна пляменная антытэтычная падстава тых падзей, якія аўтар узяў тэмай для сваей паэмы.

СЯРГЕЙ ХМАРА

Палесьсе

Спавітае сінім туманом, дрэмле залітае люстранымі бязьмежжамі вод таёмнае, маўклівае Палесьсе.

Вырвецца раптам з балот, быццам стогн з набалеўшых грудзёў, палешуцкая песьня:

Ой кувала зязюленька,
кувала, кувала,
як паншчына-дарэмшчына
ішла, варачала —

і ізноў мёрлая цішыня... Толькі ў сініх, туманных далях плача песеннае рэха...

Палесьсе!

Шмат гаворыцца аб Палесьсі. Шмат аб ім пішацца. А якжа! Ведаюць аб ім і турыстычныя праваднікі розных турыстычных арганізацыяў. Ведаюць аб ім ня толькі Варшавякі. Ведаюць і лёрды з далёкае Англіі і Амэрыканцы.

Палесьсе.

Край цудоўнай экзотыкі. Край паляўнічых раскошаў.— Алені, лосі, нат мядзьведзі. Хмары воднага птацтва, калёніі баброў.

Рай для каякоўцаў.

Азалёвыя палі пад Давід-Гарадком. Вадзяны гарэх у вазёрах Піншчыны... Шляхта „Загродова“. Выгаптаваныя сарочкі на расовых заходнягаліцыйскіх абліччах „паляшукоў“ на палескіх таргох.

І Палеская песьня з Баранавіцкай радыёстанцыі: „Umarł Maciek, umarł...“

Палесьсе.

. . . .

А там, у шэрай бяздоннай нэндзы, у балючых скрутах роспачы, у безпрасьвецьці зьвярынага нідзеньня, сярод непраходных балот расьселася другое Палесьсе: —

Раздольле галоднага тыфусу, гішпанкі, каўтуна, непадзельнае панаваньне трасцы-мухлі і шмат іншых „экзотыкаў“!

63 тысячы карлаватых сялянскіх гаспадарак.

На 800 тысяч сялян — 1,317 тысячаў гактараў зямлі, — балот і пяску.

І на 500 абшарнікаў — 1,700 тысячаў гактараў.

Давід-Гарадоцкае Радзівілаўскае каралеўства, Скірмунтаўскія лімузыны і сялянскія чаўны-душагубкі.

Экзотыка!

Гэй ты доля, наша доля,
дзе ты заляцела,
чы ў балоце затанула
чы ў агні згарэла—

сьпявае паляшук выглядаючы лепшай долі.

А долі няма. —

І так, як тысача год таму, падымае зробленай з саснова-га карча сахой свае худыя палеткі. Бо плуг — мрыя!

Так, як і тысяча год таму назад папулярная патрава каплун, гатаваная вада, цыбуля, шчопці солі...

Гэта Палесьсе. Палесьсе — краіна сівых туманоў і мільёна шэрых поўзадушаных вечнаю бяздоліцай сялян.

Ўюны

Махвей уварваўся ў хату разам з клубамі сівое пары і яшчэ ад парогу крыкнуў голасам вібруючым ад радасьці:

Нашоў! Заўтра выбіраемся па ўюны! На Чорным заводзе*) і ў Бабровай бухце аж кішаць. Лёд перацяў пярэсмыкі ад ракі і яны душацца без паветра.

Калі пашанцуе, будзе што есьці, і на соль хопіць! — заціраючы зьмёрзлыя рукі, аброшшы цэлы шэраньню, гаварыў Махвей сям'і і сабраўшымся суседзям.

Нават стары дзед зьлез з халадзеючай ужо печы.

— Кажаш, —відаць, —запытаў ён.

— Відаць пад самы лёд падыйшлі і хочуць у адным месцы аддушыну працерці, кішма-кішаць. Цераз лёд відна. Але лёд грубы!

— Вось, дзякаваць Богу,— мароз памог!

Дзеці плешчучы ў далоні скакалі па хаце, выкрыкваючы на ўсе лады:

Ўюны... ўюны... ўюны...

Бо-ж такім прысмакам будзе для іх мяса ўюна па вечнай няшчымнай бульбе і каплуну.

. . . .

Сонца ўсходзіла распаленай зялезнай коткаю. Дваццаціградусны мароз патрэскваў вуглямі хаты. Дзень запавядаўся на славу.

Сівая кабылка выцягнула з варот сані напоўненыя знарадзьдзямі лоўлі ўюноў. Мужчыны беглі каля саняў у сваіх лазовых выкладзеных сенам і саломаю пасталох і ў кароткіх кажушках з нацягнутымі на іх сівымі сардакамі.

За поясам у кожнага тырчэла сякера. Здалёк паказалася лядовае люстра Бабровай бухты.

Вось і яна.

Мароз схапіў яе ў свае сталёвыя абыймы, прахватваючы плыткую бухту аж да дна. У глыбейшых мясцох—ямах пад прасьвечваючым лёдам чарнеўся ўюні вір. Яшчэ раньняю восеньню спрытныя паляшукі забясьпечыліся ад будучых спробаў уцяканьня ў раку ўюноў і закідалі плыткі перадзел з наноснага пяску аддзяляючы бухту ад цёку ракі ламатою высечанага лазьняка

*) Завод—затока.

у тых мяйсцох ласьне пры першых моцных марозах перапыніў лядовы еж да дна мур дарогу ўюнам да ратунку. Вады і паветра ў бухце рабілася што раз менш, што раз душней рабілася ўюнам і яны зьбіліся ў глыбшых ямах.

— Ну, а цяпер пам'ай Бу'*) — плюнуўшы ў далоні крэкнуў Махвей і схапіўшы плюшню**) пачаў даўбці ёю палонку, другія памагалі сакерамі.

Лёд быў прарубаны. Але ў палонцы ня было вады. Там была нейкая чорная гатуючая жывая каша. — Гэта ўюны. Пазбаўленыя так доўга сьветлага паветра раскашаваліся ім, ня ведаючы, што разам з ім прышоў іхны канец.

Калыска з лазы, у каторай Махвеева жонка яшчэ ўчора калыхала дзіця, лазовыя кошыкі — ўсе рыбацкія знарадзьдзя на ўюноў.

Чарпальнікі працавалі без перарыву вывальваючы здабычу з кошыкаў на лёд. На лёдзе распоўзваючыся ўва ўсе бакі паволі застыгала пад цяцьцем марозу чорная жывая гушча.

Палонка была пустая. Скасьцянелых крышачыхся пад рукамі ўюноў запакавалі ў мяшок.

І зноў пачала ахаць плюшня прабіваючы чарговую палонку.

Мароз прыцінаў.

На Чорным заводзе было глыбей... Ад вірыўшай пры зломе вады прабіліся апарыны — журла, тут ўюн меў чым дыхаць, ня лез сам у палонку.

Але нашто ў Махвея быў прыпасены на санёх гаршчок з гатаваным гарохам.

Падае ў ваду залатымі зёрнамі — гарох. Сыпнула на смачную ежу галодная ўюніна братва.

А тут ужо лазовы венцер***) на шнурох са дна падымаецца.

Смачны гарох. Лёгкі ўваход у венцер. Але цяжка з яго выйсьці!

. . . .

Весела бягуць паляшукі каля саней расьціраючы касьцянеючыя рукі. Аблядзела вопратка. Мароз лютуе. — Ня чуюць.

Радасьць расьпірае сэрцы. Вось уюноў! Пашанцавала! Чатыры мяхі ўюноў! Запэўнена зіма і галодная вясна! — нат' і на махорку будзе!

. . . .

Прыехалі.

У хаце суседзкая жаночая сустань.****) Сустаньню лавілі — сустаньню і дзяліць будуць. Кожны атрымае сваю дзель-бонду.

Зьмёрзлыя, крышачыся пад рукамі ўюны пачынаюць у цяпліні хаты ў мяшкох ажываць і ціха папіскваючы вылазіць

*) Пам'ай Бу' — палескі дыялект=памагай Бог.
**) Плюшня — дубовы кол, лом з абабітым жалезным гострым канцом.
***) Венцер — лазовы мяшок рыбацкая прылада.
****) Сустань — рыбацкая арцель, супалка па Палесьсі.

з мерак-кошыкаў. Але ратунку няма. Прабівае дзеравяная ігла з ніткаю пад жабры, расьце нізанка. — Гэта ў печ на сушэньне. Пойдзе потым на продаж у горад — па ½ гроша, па грошу штука — на соль, на махорку, на падаткі, а рэшта — жывыя — ў бочку, саліць.

Пішчаць — страхліва пішчаць — пасоленыя жывымі. —

А потым на стапе зьявяцца чаркі, задыміць патэльня, поўная смажаных ўюноў на закуску, і пачнецца рыбацкі, убогі баль на чэсьць уюна,—гэтага хлеба і мяса палескае беднае вёскі. —

АНАТОЛЬ ІВЕРС

Залацілася раніца

Залацілася раніца ападаючым шэлестам,
вецер лістам іржавым дарогі прыслаў,
і ня бачылі мы, як зара загарэлась там —
восень дробную ймглу на палёх растрасла.

А ў далі патухала рабінавым полымям
нашых бедных палёў набалеўшая сінь, —
гэтак ніклі у цьму дні жыцьця — невясёлыя
паміж соснаў зялёных і голых асін...

Мо' прыдзецца яшчэ зімаваць недагрэтымі —
хмары воўкам кудлатым паўзуць з-за Карпат..
Але песьню сваю дапяём недапетую
сярод ніў залатых, пад напевы сярпа.

На бруку

Штось закралася ў душу — ня знаю, —
мо' трывога за лёс нашых сёл.
Шэрай восеньню з песьняй па краю
я паеду аддаць ёй усё..

Беларусь.. Не! ня будзеш ніколі
паза межамі з торбай хадзіць!
Сёньня ў даль з-за густых частаколаў
на сінеючу даль паглядзі.

Гэта зоры разсееные густа,
каб прарэзаць туманаў плыты,
каб калосьсе зары з нашых пустак
зашумела ў вагнёх залатых.

Ці ня радасьць прыдзе пасьля суму,
ці ня ўдараць ў званы пасьля сну?...
Ня нам думу горкую думаць
спать.каючы нашу вясну!...

С. ХМАРА

Калыхала зыбку маці

Калыхала зыбку маці,
калыхала.
Ой, бяды ня будзеш знаці, —
мне пяяла.

Будзеш сонцу усьміхацца
залатому,
сэрца цешыць, любавацца
грошаў звонам.

Будзеш ты вялікім панам
над панамі,
у палацы жыць цагляным
са слугамі.

Ой, пяяла, ракавала,
ня мылілась.
У палацах жыву стала,
з слугаў сілай.
Табе й дзьверы адчыняюць,
есьці носяць,
абмываюць, адзяваюць,
ў спацыр просяць.

. . . .

Ды аднога не ўганула
мая маці:
няма сонка залатога
усьміхацісь,
і ня цешу сэрца звонам
купай грошаў —
звоняць іншым, ў дзень і ў ночы
сон палошаць.

1935 г.

Я. КРЫГА

Шый, ды шый...

Млеюць рукі й ногі пры рабоце —
шый, ды шый, ды шый!
Ломіць сьпіну боль і сьлепіць вочы
гнісь, працуй, маўчы!
Трэбаж, ой, як многа трэба!
дзецям і сабе —
на аптэку, на падаткі, трэба —
ні канца бядзе.
Шый, ды шый, ды шый, шчэ трэба многа!
Ноч вяліка, гэй!
Высьпішся ў другім жыцьці, нябога, —
сон гані з вачэй!
Шый, ды шый... ах! укалола йголка,
паказалась кроў,
разыгралася ў вачох вясёлка...
Ах! — ўкалола йзноў...
Кроў!... Ці сон яно, ці ява?
Кроў во ручаём —
залівае стол, машыну, лаву
і усё, ўвесь дом...
Выбіць шыбу, крыкнуць — мо пачуюць...
Гэй!!... Ах, што за мара — сон!
Цёмна. Лямпа згасла. Вецер дуе,
вые за вакном...

С. ГРЫНКЕВІЧ

„Учора" і „сяньня"

Спрэчкі філёзофаў і лёгікаў, ці ёсьць абсалютная праўда (ня толькі ў плошчы рэлігійнае праблемы) былі і будуць заўсёды жывымі. Ці пагодзяцца рэлятывістыя з прыхільнікамі пагляду, што ўчарашняя праўда на заўсёды астанецца праўдаю такою самаю для ўсіх, якою была ўчора, — няма ведама.

Калі-б праўда існавала, паскольки яе ўяўляла-б адзінка, дык была-б яна надта хісткаю. Адзінкаю ўладаюць сэнтымэнты розныя, настроі. Ад настрояў і сэнтымэнтаў ды ад рознаякіх практычных мяркаваньняў залежала-б тады і праўда!...

Даволі красамоўна бачым адлюстраваньне рэлятывізму праўды ў аднэй з апошніх кніжак ведамае польскае пісьменьніцы Н а л к о ў с к а е. Назоў кніжкі *„Благая любоў"* *). Чаму гутарка аб гэнай кніжцы якга на бачынах беларускага часапісу? Дзеля таго — ў першую чаргу, — што пісьменьніца некалькі разоў закранае беларушчыну, беларускага мужыка. Не разглядае плянова нічога асобна беларускага, а спыняецца над гэным пытаньнем пастолькі, паколькі ёй трэба паказаць на перамены ў польскім грамадзянстве даваенным і сучасным. Беларушчына выступае, як асноведзь, на якой лягчэй, больш пуката можна пабачыць гэньня перамены.

Зьмест „Благое любові" ня важны дзеля нас. У аповесьці ёсьць некалькі аснаўных ніцяў раману, ніцяў мясцамі вельмі заблытаных, паміж тымі самымі і рознымі людзьмі. Акцыя праводзіцца ў адным з „крэсавых" мястэчак, якое пасьля вайны вырасла на сталіцу ваяводзтва. На арэне выступаюць урадоўцы (як прыватныя адзінкі), абшарнікі, грамадзкія дзеячы, даволі вялікі сьцяг дамаў і панячак, найчасьцей прадстаўнічак пасьляваеннага ўжо пакаленьня. Гэная рыса — проблематыка душы жанчын, аналіза нутранога іхняга жыцьця — вельмі характэрная дзеля творства Налкоўскае агулам.

Бацька аднае з дамаў, доля загнала якую ў ролі жонкі ўрадоўца ў гэнае глухое мястэчка, чалавек з вялікага сьвету. Гэта адзін з дзеячоў перадваенных, чалавек блізкі да тых, што давялі да незалежнасьці Польскае дзяржавы. Гэны Валевіч глядзіць быццам об'ектыўна на тое, што робіцца ў канкрэтных умовах жыцьцёвых, і наскольки можа падсумоўвае перамену ад учора да сяньня нікаторых лёзунгаў і сам дзівіцца, што сапраўды робіцца з людзьмі і ідэямі. Ці людзі мяняюцца, ці ідэі — гэта пусты толькі гук, ці мо' толькі ўчарашняя праўда ў сяньняшнім аспэкце мае іншы воблік?....,

Глядзіць ён на людзей кіруючых гэным куском зямлі і рознаякія рэфлексыі лезуць плоймамі яму ў галаву. — „Вось прыкладам Валевіч думаў калісь, як аб нечым надта простым і бязсумліўным, што кожны народ павінен мець сваю зямлю і свае граніцы, хаця-б народ быў найменшым. У сапраўднасьці гэта ня было ані простае ані бязсумліўнае. Вось сьвет здрыгануўся, задрыжаў на сваіх фундамэнтах і гэныя словы, гэная простая праўда азначала ўжо цяпер зусім нешта іншае.

Калісь гэныя словы — свая зямля і свае граніцы — гэта была Польшча, гэта была ейная незалежнасьць і магутнасьць. Сяньня гэта азначала-б абнядужаньне Польшчы і меншыя ейныя граніцы".

Як працяг гэных думак, бачым сказы такія:... „калісь, у тыя часы, Валевіч глыбака браў да сэрца лёс людзей, якія за сваю дзейнасьць ідэйную лучалі ў вязьніцы... Ён быў з тых, якія цьвёрда дзяржаліся пагляду, што ніхто ня можа адбіраць свабоды за пагляды і за гэныя пагляды вешаць на шыбеніцах. Думаў ён, што сапраўды на душы ляжала яму думка аб агідзе ламаньня духа чалавечага ў ягоных шляхотных імкненьнях. Думаў, што сапраўды рупіўся ён заўсёды да супроцьстаўленьня сабе ідэі і гвалту. А вось вышла цяпер пры новай коньюнктуры, пасьля вялікага зруху ў фактах рэчаіснасьці, што гэныя словы, гэныя собскія, дарагія лёзунгі, яму прыдаюцца цяпер бяз сэнсу ды проста агідлівымі".

„Былі яны сапраўды дэмагогічным сказам, як казалі калісь ягоныя праціўнікі, адкуль пачалі ўцелаішчаць нешта іншае, адкуль пачалі яны прадстаўляць нешта варожае і небясьпечнае.

Каб усё гэта ўявіць, трэба было пераўжыць перамогу свае ідэі".

Быццам перадумаўшы ўсё гэта, Валевіч цераз аўтарку снуе гэткія думкі: „зьдзейсьненьне кажнае гістарычнае ідэі азначае такія ейныя суадносіны з сапраўднасьцю, каб новая ідэя была найбольш сходная з тым, на месца чаго яна прышла. І толькі тады яна можа валадаць і трываць, калі закараніцца ў тых самых мясцох зямлі, з каторых вырвала яна ранейшыя, калі ўвальлецца ў выемкі колішняга жыцьця і да гэных выемак датарнуецца найстульней.

Дык вось цяпер іншыя, новыя людзі сядзелі ў вязьніцах, бо вязьніцы...... ня могуць быць парожнімі. І яны, гэныя ўжо людзі, казалі, што нельга зачыняць людзей за ідэі. І зноў пасуседзку зусім, за межамі краіны, дзе іх крыўдзілі, у рэвалюцыйных вязьніцах былі зачынены тыя, каторыя маглі па гэтай старане граніцы зачыняць у вязьніцах.

Ня толькі словы, ня толькі ідэя і лятуценьне ў вечнай абнове сьвета было нечым іншым. Нечым іншым робіцца і самое зьдзейсьненьне. Ды нат' зямля і граніцы кажны раз азначалі нешта іншае".

І трудна сказаць, з сумам ці з іроніяю пісьменьніца пытаецца: „Мо' Малевіч зусім не перамяніўся, мо ня трэ' сароміцца яму за сваю маладосьць. Мо' гэта толькі бязупынна мяняўся

*) „Niedobra Miłość". Nałkowska. — Romans prowincjonalny.

сьвет, і дзеля гэтага ягонае месца за кажным разам было іншае (бач. 69 — 71).

Аўтарка вельмі крытычна і востра судзіць і ацэнівае шмат якіх пасьляваенных прадстаўнікоў „крэсовага грамадзянства". „Учарашняе" гэных людзей не дае часта, на пагляд аўтаркі, ім дазволу глуміць людзей і думкі і пагляды. Паказывае яна тыпы і вайсковых і дзеячоў самаўрадавых і ўрадоўцаў. Сымпатыя ейная па старане дэмакратыі. Усякім адхілам ад дэмакратыі, ад справядлівасьці не шкадуе яна вострае сатыры. Не шкадуе яна вострых слоў для прадстаўнікоў учарашняга дня, якія ня імкнуліся да зьдзейсьненьня сяньняшняга дня, якім учора надта любае. Да такіх вось тыпаў належыць старая графіня Осенецкая.

Гэтая асоба намагаецца, датарнаваўшысь па меры магчымасьці да сучаснасьці, вярнуцца да мінуўшых дзён. „Пані Осенецкая добра ўпраўляла сваімі маёнткамі. У ейных маленькіх ручках людзі ўвіхаліся з натугаю і сьпехам, працавалі да сёмага поту. Тое самае было і з жывёлаю, ды нат плугі, машыны, трактары і тыя працавалі быццам да апошніх мераў магчымасьці.

Дзерла яна з зямлі не для сябе праўда. Ды за тое і не для сваіх людзей. Стогнучая служба ледзь-ледзь магла дастаць належныя ёй ардынарыі. Служба наракала на немагчымае памешканьне, гэная служба прымушана была таргавацца за грошы, якія зарабіла".

Гэная п. Осенецкая ведала аб парадках у сваіх маёнтках. Уважала, што йнакш ня трэба, ці мо' інакш нат' і немагчыма. Сама калісь расказывала: „Я ніколі не хаджу да іхніх (службы) хатаў. Ведаю, што ў іх жудасна, я абсалютна не магу на гэта глядзець. Дзеці там сядзяць у холадзе і макраце, сьцены там дзіравыя, цераз стрэхі цячэ"...

Пані Осенецкая бачыць, што мужыкі маюць вочы, што яны ўмеюць ацаніць належныя да іх адносіны. Аўтарка гаворыць: „усе найміты неахвотна хадзілі на панскае поле. Ведалі, што чалавечыя сілы будуць там выкарыстаны да апошняга, да таго-ж гэныя людзі думалі аб землях, якія абраблялі, як аб нечым, што належаціме да іх (бач. 87)".

Пані Осенецкая быццам мела калісь іншыя пагляды на гэных мужыкоў-„хамаў". Быццам яна ўмела хадзіць да іхніх цёмных сьцюдзёных хатаў, насіла ім лекі, памагала ўсяляк. Сяньня яна ведае, „што гэта злосныя, дурныя барбары, гэта тая маса, з каторае вышаў забойца ейнага малодшага сына".

Осенецкія ніяк не маглі пасьпець за пераменаю ў парадку і ладзе пасьляваенным, не дапускалі думкі, што „урад, сам урад адчыняе мужыкам школы ў роднай мове, што гэны ўрад з публічных грошаў, народных грошаў утрымлівае настаўнікаў у гэных школах, настаўнікаў тутэйшых, аўтохтонаў"... (бач. 88). І ў сапраўднай роспачы і аканчальным зьнявераньні пытаецца Осенецкая: „ці можна ўявіць, ці можна падумаць, каб нешта

такое рабіла Англія... У нас не разумеюць, што толькі моцная рука, толькі вострая ўлада можа ўсё гэта неяк трымаць у парадку".

На пагляд п. Осенецкае, добры пан не карыстаецца ніякім аўторытэтам. Калі, скажам, такі пан пазычае сялянам прылады гаспадарчыя, калі дае ім лепшае зярно, калі не бярэ грошаў за занятую жывёлу, дык мужыкі тады думаюць, што гэткі пан баіцца іх, што ён быццам сядзіць не на сваём, „а мужыка трэба біць, застаўшы яго ў шкодзе, трэба трымаць пагрозамі, тады толькі ён будзе паслухмяны і пакорны, тады ня вырасьце з яго разбойнік".

Уся натуга графіні ідзе на тое, каб найбольш высмактаць з зямлі. На сапраўдны зьдзек выглядае, што ўсе тыя прадукты, якія мужыкі цяжкаю працаю выпрадукавалі з зямлі, ішлі на стол жыдоўскіх кансумэнтаў, якія адны толькі маглі купляць розныя ласушкі. А грошы ішлі заграніцу да сына, які меў падтрымаць высокія амбіцыі панскага роду.

Ня ўсе людзі са сфэры бліскае да графіні думаюць аднолькавымі з ею катэгорыямі. Прыкладам, іншым чалавекам будзе жонка ваяводы. Ваяводзіха заглядаецца на сытуацыю графіні, што тая магла-б інакш жыць. Паводле ваяводзіхі можна на вёсцы знайсьці падыход да сялян, можна паказаць народу добрае сэрца і цераз гэнае сэрца выклікаць давер...

Такіх людзей новых, як ваяводзіха, яшчэ вельмі мала. Землеўласьнікі сабраўшыся ў графіні ўмеюць толькі наракаць на ўрад, на малую апеку над імі, на патуражаючую ім парцэляцыю, на мужыкоў, радыкальна настроеных. Наракаюць, што настроі сялянства ня сустракаюць больш рашучага адпору са стараны ўладаў.

Усё гэта высказывалі ў такі спосаб, быццам гэта былі праблемы агульныя, грамадзкія, у якіх усе зацікаўленыя. Сапраўды аднак выходзіла на тое, што наракалі яны на свае клопаты, што хацелі выкарыстаць сытуацыю, каб абгаварыць іх у прыватным памешканьні з урадавымі дзейнікамі замест зьвяртацца да апошніх да афіцыяльнага бюро.

Гэныя людзі ня ўмелі датарнавацца да новых умоваў жыцьцёвых, баранілі сваіх колішніх прывілеяў і ў змаганьні за штодзенныя дробязі гублялі свой аснаўны тып, мянялі свой характар (101).

Жыцьцё штораз больш крутое сьціскала іх быццам абцугамі. Культура іхняя, традыцыі, мінуўшчына на сяньня ня былі здавальняючым аргумэнтам. Былі яны яшчэ арыстократыяю. Косьці іхнія былі крыху танчэйшыя, апранываліся яны часта лепш. За тое мянялась тое, што было найбольш сутным, іншая была ў іх ужо мэнтальнасьць, структура псыхічная. Клопаты, дробныя раструскі, неабходнасьць змаганьня за кусок хлеба — ўсё гэта было або нечым, да чаго яны ня прывыклі, або ад чаго адвыклі ў цэлым сьцягу пакаленьняў. Новы лад выклікаў у іх

новы сьветапагляд, мяняў адносіны да жыцьця. Згубілі яны панскую пэўнасьць і адчачасна тую нейкую бязінтэрэсоўнасьць, якую можна наглядаць і ў сытага сабакі ў адносінах да галоднага цюцькі-бадзякі.

Сяньня ў іншых сфэрах вялісь гутаркі аб каханьні, аб мастацтве, аб прыгожых жанчынах, кніжках і падарожах, аб усіх прадметах, мо' і зусім непатрэбных, якія зьяўляюцца крыніцаю псыхічнае роскашы.

Вывад і аканчальны прысуд аўтаркі, — што ў сфэры „крэсавых" земляўласьнікаў спробы эканамічных клопатаў ня выдзержала культура інтэлектуальная.

Іншы тып паказаны аўтаркаю — сыновая Осенецкае, амэрыканка з паходжаньня. Лучыла „да нас" з таго асяродзішча, дзе ў пасьляваенную пару „былі модныя гуманітарныя адносіны да права кажнага народу, да собскага жыцьця паводле нерэальнае ідэолёгіі Вільсона". Блізка да сэрца Флёр „чужыя меншасьці нацыянальныя, прыгнечаныя ў чужых дзяржавах"... Гэная чужаземка выказывала свае пагляды шчыра, ня гледзячы, ці каму мо' гэта зусім не ўспадобу. Цікавілась усім, езьдзіла з мужам па маёнтках і ваколіцах. Езьдзіла ня дзеля спорту, а каб усё паглядзець. Навучылась хутка пазнаваць селяніна беларуса ад паляка. Шмат чаго ёй не падабалась у краёвай рэчаістасьці.

Флёр са сваім цьвёрдым падыходам да жыцьця не магла зразумець шмат якіх зьявішчаў, якія нагпядала. У аднэй з гутарак са старою Осенецкаю апошняя казала ёй аб знатнасьці роду, аб вялікіх ягоных заслугах у мінуўшчыне, ужо хаця-б дзеля таго толькі, што „пільнаваў" свайго гнязда.

Пытаецца Флёр: „а што гэта такое "датрываць на становішчы?" Ці гэта азначае, што яны радзілісь і паміралі на гэным месцы па тое, каб якга „датрываць"? І адказвае, што аканчальна найлягчэй, калі чалавек якга жыве і працуе там, дзе радзіўся. Гэта і робіць кажны тутэйшы селянін і ніхто не захопліваецца тым, што селянін „датрываў", што не пакінуў свае мовы беларускае".

Старая графіня паклікаецца тады на пралітую кроў продкаў, на заслугі іхнія і змаганьні ў паўстаньнях. Гэта мала зразумела паамэрыканску ўзгадаванай маладой графіні. На ейны пагляд зусім ня трэба выступаць проці свае ўлады. „Аб тым (паўстачьні) гаворыцца тутака — геройства. Тыя-ж сяляне, што забілі Валерага (другі сын Осенецкае) так сама імкнулісь да нейкае незалежнасьці і яны змагалісь за зямлю. Толькі што ў іх гэта называецца азьвярэласьць. Ці-ж вы ўсётакі ня бачыце, што гэныя зьявішчы сходныя з сабою?"

Ці аўтарка добра ведае ўмовы і лад сялянскага жыцьця тых ваколіцаў, якія выводзіць у сваёй повесьці, сказаць трудна. Хутчэй аднак што не, ня ведае. Калі ведае, дык з птушынага лёту. Яна хоча быць аднолькава об'ектыўнаю і да маладое і да старое Осенецкае і да Валевіча і да ўсіх іншых тыпаў. Об'ектыўная яна між іншым і да праблемы беларускае. Яна стаіць за аснаўныя правы да жыцьця кажнае адзінкі, кажнага народу, яна за права кажнага станавіць самому аб сваім лёсе.

І мо' дзякуючы таму, што ня ведае яна тутэйшага жыцьця ў дэталях, дзякуючы таму, што яна далёкая, ня тутэйшая, пачуцьцёва не зацікаўлена, — дзякуючы гэтаму змагла прадставіць бяз большых пахібаў адну са старон краёвага жыцьця. Яна ня злоўжывае інтэлекту. Аб гэным злоўжываньні гаворыць яна вельмі красамоўна. „Калі падумаць над дзейнасьцю інтэлекту, дык гэта ён паясьніе, апраўдывае тое, што зьдзейсьніла даўно пачуцьцё. Інтэлект па тое, каб абаснаваў нашае дзеяньне, каб успакоіў нашыя сумлівы. Дзеля матывіроўкі, можна казаць, служаць усячія лёзунгі" (бач. 208).

Съведамасьць аб ролі інтэлекту высказаная ў форме даволі рызыкоўнай, амаль што не парадоксальнай, хай нам паможа знайсьці адказ на сумлівы, як паясьніць такія вялікія разыходжаньні паміж людзьмі ды лёзунгамі дзён „учарашніх" і „сяньняшніх".

ПАЎЛЮК СІРАТА

Таварышу маёй вёскі

Можа нашым шляхом ня зыйсьціся, мая дарагая,
іх блакітна-імглістую даль загубілі адзін і другі.
Хай паэт у палоне і ў песьнях сваіх дагарае
і вясьнянае сэрца бароніць ад жудаснай сьліскай тугі.

Мне з вясной разьвітацца і сэрца ня хопіць і нельга, —
я радзіўся з вясны, каб вясьнець да нябыту хвілін.
Помню, помню: мы некалі пышную ружу сустрэлі
і ня ведалі: ружа цьвіла, ці сустрэча і вочы цьвілі.

З тэй сустрэчы цьвітучай сарваў я на памятку радасьць
і да сэрца як бант успамінам на век прышпіліў,
і нясу праз жыцьцё непакорны ні бурам, ні здрадам,
каб і сэрцу цяплей, каб сінелі прыветней палі.

Будзе песьня губіцца ў расьпененых студзеням далях,
да цябе даляціць, — ты хоць раз сірату прытулі.
Цёплай сейбіцкай жменяй мы шчыра жыцьцё раськідалі,
каб вясна расьцьвіла для людзей на пакутнай зямлі.

С. КАЛІНА

Літаратура ў адносінах да жыцьця

(Глядзі кн. 2(15) і 3(16) „Калосься")

Даходзім такім спосабам да асьвятленьня найважнейшага для нас пытаньня. З дасюлешніх разважаньняў відаць ясна, што ўсякія спробы надаваць літаратурнай творчасьці той ці іншы кірунак супярэчны зь яе істотай не прынясуць пажаданых рэзультатаў, але толькі шкоду. Літаратура, як і кожнае мастацтва, будучае найдасканальшым творам людзкога таленту, павінна быць вольная й незалежная ад ніякіх штучных і нязгодных зь яе характамам агранічэньняў. Будучая мастацкім адбіцьцём жыцьця і ягоператварэньнем у апрычоны артыстычны сьвет, можа з гэтага жыцьця выбіраць свабодна патрэбны для сябе матар'ял. Каліж у дадзеным жыцьцёвым асяродзьдзі, зь якім зьвязаны аўтар, разьвіваюцца і дасьпяваюць тыя ці іншыя ідэі, нейкія грамадзкія праблемы становяцца асабліва важнымі, то і так знойдуць яны належнае адбіцьцё ў літаратуры і будуць мець бясспрэчную перавагу над тымі матывамі, якія ў запраўдным жыцьці зьяўляюцца ў дадзены мамэнт усяго толькі другараднымі й пабочнымі. Што літаратурнае мастацтва само сабой рэагуе перадусім на тыя пытаньні, якія ў жыцьці знаходзяць перавагу, зьяўляюцца найбольш дасьпелымі і балючымі, найлепей можа аб гэтым пасьведчыць уся беларуская літаратура. У сваім дасюлешнім разьвіцьці мела яна ў сабе цэлы рад спэцыфічных і вельмі характэрных рысаў, якія выдзялялі яе спасярод многіх іншых літаратураў, як апрычоную цэласьць. Асноўной такой асаблівасьцяй нашае літаратуры, зь якой выцякалі ўсе іншыя, было шчырае яе зрадненьне з народным жыцьцём. Можым нават цьвердзіць, што літаратура нашая была нятолькі верным адбіцьцём жыцьця народу ўва ўсіх найважнейшых яго праявах, але так-жа ў вялікай меры рэпрэзэнтавала й заступала тыя галіны народнага жыцьця, якія ў іншых абставінах зь літаратурай мелі-б мала чаго супольнага. Яшчэ да нідаўняга часу адраджэньне й разьвіцьцё літаратуры ідэнтыфікавалася ў нас часта з адраджэньнем і разьвіцьцём народу наагул, — бо ў значнай меры выперадзіла гэтае апошняе — а ідэі і прызывы, выказываныя ў літаратурнай творчасьці, кляліся ў васнову ідэолёгічнай праграмы нацыянальнага й палітычнага руху. Было ўсё гэта падыктаванае ходам самога жыцьця, а ня дзеілася пад уплывам вонкавых дырэктываў і настаўленьняў. Падобны-ж характар мелі таксама некаторыя літаратуры іншых народаў, якія, гэтак як і нашая, пераходзілі этапы свайго адраджэньня раўналежна з адраджэньнем народнага жыцьця.

Ясна тады, што літаратурнае мастацтва, будучае сама ў сабе асобным артыстычным сьветам, не адгараджваецца ад рэальнага жыцьця, але цесна зь ім вяжыцца і чула рэагуе на

ягоныя праявы. Усьвядамляючы сабе гэтую яго асаблівасьць, ня трэба аднак забываццa, што, ня гледзячы на ягоную арганічную сувязь з жыцьцём і выдатны ўплыў на апошняе, мусіць быць яно ў першую чаргу мастацтвам, адказуючым усім ведамым ягоным варункам і вымаганьням. Грамадзка-жыцьцёвыя праблемы, зьмешчаныя ў літаратурным творы, павінны быць разгляданыя аўтарам не як вартасьці ад літаратуры незалежныя, але выключна, як адныя із мастацкіх элемэнтаў твору, як тыя або іншыя ягоныя матывы ці сымболі, апрацаваныя згодна з артыстычнымі вымаганьнямі і арганічна павязаны зь іншымі элемэнтамі твору. Такая мэтода ёсьць канечнай ня толькі з гледзішча на артыстычную вартасьць твору, але служыць яна так-жа лепшаму выражэньню яго ідэолёгічнага зьместу, надае яму большую трываласьць і глыбіню, павялічае ягоную запладняючую сілу. Ідэйны элемэнт, выражаны ў літаратурным творы, апрача сваей функцыі соцыёлёгічнай, мусіць так-жа выконываць функцыі артыстычныя, як адзін із арганічных элемэнтаў твору, а ня нейкая прычэпка ці надзвычайны дадатак да гэтага апошняга. Дзякуючы гэтаму будзе ён мець у творы вартасьць непрамінаючую нават і тады, калі б дадзеная ідэя ці праблема перастала быць у жыцьці актуальнай. І наадварот — ідэолёгічны элемэнт, уводжаны ў літаратуру із выразнай шкодай для яе мастацкасьці, будзе мець мельмі малую, усяго толькі публіцыстычную вартасьць самую ў сабе, якая зьгіне бясьсьледна, як толькі перастане існаваць дадзеная праблема.

Гэтыя апошнія ўвагі зьяўляюцца, думаю, яснымі й ачавіднымі кожнаму, бо вельмі выразна пацьвярджаюцца яны на многіх прыкладах з нашай літаратуры. Цэлае мноства твораў яшчэ з часоў „нашаніўскіх", у якіх дэклямавалася праз усе склоны й на розныя лады аб Беларусі (прыкладам: „Беларусь, ты не загінеш, Беларусь, ты не памрэш!..." і г. д) і ўважалася, што хопіць гэтай дэклямацыі, каб верш быў надрукаваны, а аўтар ягоны дастаў дыплём добрага паэта — як-жа бледнымі й мізэрнымі прадстаўляюцца сяньня. А з другога боку патрыётычныя вершы Купалы, аб якіх была ўжо гутарка, зьяўляюцца таксама перападанымі ідэолёгічным зьместам, аднак ня гледзячы на гэта нятолькі ня згубілі ані троха із сваей вартасьці, але касуюць сабой усе іншыя ягоныя творы. Другім вымоўным прыкладам, як можна ўдала пагадзіць ідэйныя элемэнты твору зь яго артызмам, зьяўляецца ўся творчасьць Танка, аб чым шырака мы высказаліся на іншым месцы. Купала й Танк прадстаўляюць вельмі цікавы прыклад „упоэтызаваньня" ідэйнага зьместу яшчэ дзеля таго, што конкрэтызуюць яго ў сваіх творах зусім розна: ідэі Купалы выступаюць у творах беспасярэдна ў форме магутных лёзунгаў і прызываў, тады, калі ў Танка пераважна выплываюць яны арганічна із намаляваных у творы абразоў і сытуацыяў. Ня гледзячы на гэтыя розьніцы, так адзін, як і другі умеюць містэрна падпарадкаваць іх артыстычным вымаганьням твору.

Далейшай справай, зьвязанай з гэтым пытаньнем, якую тут трэба закрануць, ёсьць нутраное настаўленьне аўтара адносна апісвана а ім жыцьця, яго асабістыя псыхолёгічныя адносіны да праблемаў і зьявішчаў, якія стараецца паказаць у літаратурным творы. Справа ў тым, што ўсё тое, аб чым аўтар гаворыць, што апісывае і да чаго заклікае, мусіць выплываць зь яго глыбокіх асабістых перакананьняў, як вартасьць ім самым пераэжытая і пачуцьцёва яму блізкая. На гэты апошні мамэнт клаў асаблівы націск нядаўна памёршы выдатны ангельскі пісьменьнік Язэп Конрад, які пісаў 28.X. 1895 г., да Эдварда Нобля, што артысту трэба „кожнае ўражаньне, кожную думку, кожны абраз папросту выціснуць зь сябе — бяз літасьці і без астачы. Трэба перапрэсьці найцямнейшыя куткі свайго сэрца, апошнія каморкі свайго мозгу; трэба ўсё гэта прасачыць, гонячыся за абразом, даючым поўную оптычную ілюзію, за адпаведным выражэньнем. І трэба рабіць гэта за ўсякую цану шчыра; трэба паступаць так, каб з канцом дзеннае працы чуўся вычарпаным, апарожненым з усякага пачуцьця, з усялякай думкі, з пустой галавой і з балючым сэрцам, з адчуцьцём, што нічога — зусім нічога не асталося ўжо ў табе“.

Ды ня толькі павінен згаджацца з самым сабой, із сваім сумленьнем паэт ці пісьменьнік, рэалізуючы свае мастацкія пляны, але ў ня меншай так-жа меры мусіць ён быць у згодзе з акружаючым жыцьцём, а не цягнуцца ад яго з-заду або замыкацца ў штучна створаным абстракцыйным сьвеце. Літаратура ў тым толькі прыпадку будзе мець вялікую творчую сілу і трывалкасьць, калі вырастае беспасярэдна з жыцьцёвых нетраў і ў разьвіцьці сваім не адрываецца ад магутных хваляў жыцьця, якія бурляць у масах. Усякі-ж ненатуральны адскок ад ходу жыцьцёвых працэсаў зьяўляецца роўназначным з упадкам літаратуры, у найлепшым-жа прыпадку — вядзе яе на бездарожжа. Гэтае апошняе зьявішча можам назіраць з асаблівай яркасьцю ў розных буржуазных літаратурных кірунках, якія разьвіваюцца сярод слаёў грамадзянства, што з гледзішча грамадзкага зусім ужо пераэжыліся і адарваліся ад здаровых каранёў бягучага жыцьця. Літаратура такая, згубіўшы сувязь з рэальнасьцю, зьяўляецца бясплоднай і ня мае аніякага творчага ўплыву на грамадзянства. Пераважна бывае яна пазбаўленая шчырага й сьвежага эмоцыянальнага падкладу, над якім пераважаюць сухія інтэлектуальныя элемэнты; калі-ж і прабіваюцца часамі некаторыя пачуцьці, то бываюць яны пераважна конвэнцыянальныя, у большай ці меншай меры штучныя, заакцэнтаваныя ўсяго толькі для асягненьня вонкавага эстэтычнага эфэкту. З такога падыходу да літаратуры выплываюць знаныя сяньня кірункі, якія, зусім адарваўшыся ад жыцьцёвага зьместу, займаюцца ўсяго толькі фармальнымі экспэрымэнтамі.

Беларускай літаратуры фактычна яшчэ не пагражала і не пагражае гэтая небясьпека, бо была яна заўсёды арганічна

зьвязанай з найважнейшымі працэсамі, якія разьвіваліся ў народзе. была заўсёды творчая й паступовая ў вадносінах да праяваў і патрэбаў рэальнага жыцьця. Тая невялічкая частка нашага грамадзянства, якая з тых ці іншых прычынаў зрывае сваю арганічную лучнасьць з жыцьцём, што бурліць у народных масах, дзякуючы спэцыяльным сяньняшнім абставінам перастае гэтым самым быць беларускім грамадзянствам, дык і ня можа мець ані беспасярэдняга ўплыву на літаратуру. Пры гэтым, каб быць беларускім паэтам у сяньняшніх варунках, трэба праўдзівага геройства, дык ясна, што ніхто зь пішучых не заглядаецца на сваю працу выключна, як на нейкі вырафінаваны экспэрымэнт, пазбаўлены глыбейшага жыцьцёвага сэнсу. Але паколькі ня можа быць сяньня ў нас мовы аб нейкай дэгэнэрацыі літаратурнага мастацтва альбо яго сьвядомым адрываньні ад найважнейшых плыняў цякучага жыцьця, патолькі здараюцца часамі выпадкі неразуменьня таго, што трэба сьмела глянуць жыцьцю ў вочы і браць яго такім, якім яно ёсьць. Замыканьне вачэй на некаторыя праявы нашага сяньняшняга жыцьця, хаця й жудасныя й балючыя, і ўцяканьне ад яго ў выабражаны шчасьлівейшы сьвет вядзе іменна да аслабленьня альбо й разарваньня сувязі літаратуры з жыцьцём. Гэтак сама мала ўсяго толькі кідаць актуальныя грамадзкія прызывы і дэкламаваць аб народных балячках і патрэбах, калі ўсё гэта не знаходзіць моцнага апорышча ў ідэйным падкладзе цэлага твору альбо ў псыхічным настаўленьні самога аўтара.

3

Крытэрыі артыстычнае ацэны літаратурнага твору

Літаратурны твор, якога заданьнем зьяўляецца выклікаць у чытача тыя ці іншыя эстэтычныя пераэжываньні, можа так-жа, як бачым, закранаць розныя жыцьцёвыя праблемы і ідэі і іх накідаць чытачу. Наперакор некаторым тэорыям, баронячым „чыстасьці“ мастацтва, многія аўтары стараюцца рэалізаваць у сваіх творах іменна гэтае другое пытаньне, прыступаючь да пісаньня маючы наўвеце гатовую ўжо праблему, якой сьвядома хочаць надаць нятолькі эстэтычнае выражэньне, але роўналежна з гэтым ці пры помачы гэтага — зрабіць уплыў на грамадзянства. З усім гэтым, ясна-ж, трэба лёяльна лічыцца, а не ваяваць зь вятракамі, адмаўляючы ўпорыста аднэй ці другой эвэнтуальнасьці права да жыцьця.

У сувязі з гэтым астаецца яшчэ адно вельмі важнае пытаньне, на якое пастараемся крыху кінуць сьвятла. Дзеля таго, што існуюць літаратурныя творы зь ідэолёгічным зьместам, якія, апрача сваей эстэтычнай вартасьці, даюць чытачу адпаведнае асьвятленьне важных для яго жыцьцёвых пытаньняў, і творы, пазбаўленыя ідэолёгічнага элемэнту, то можна зрадзіцца шмат у каго перакананьне, што павінны існаваць крытэрыі ацэны літаратурнага твору з гледзішча ўсяго толькі на ягоную тэматыку,

г. зн. з гледзішча на тое, аб чым гаворыцца ці апісваецца ў творы. Сучасная навука аб літаратуры, бяручы пад увагу яе аўтаномічнасьць, г. зн., што літаратура сама ў сабе прадстаўляе апрычоны мастацкі сьвет, ня бачыць у гэтым аніякай розьніцы, цьвердзячы, што артыстычная вартасьць твору не залежыць ад таго, што ў ім сказана, але выключна ад таго, як сказана, г. зн. ад спосабу і характару мастацкага апрацаваньня твору. Ня можа гэтаму запярэчыць нават і той факт, што, як часамі на першы пагляд можа выдавацца, тэмы, зусім арыгінальныя й новыя ў літаратурным творы, могуць прадстаўляць ужо гэтым самым большую вартасьць за тэмы агульназнаныя, паўтараныя ў цэлым радзе літаратурных твораў і дзеля гэтага — збаналізаваныя. Ня трэба аднак забывацца, што гэтая „банальнасьць“ залежыць выключна ад спосабу артыстычнага апрацаваньня тэмы, а не ад яе самой. Вельмі добра гэта пацьвярджае сучасная літаратура, якая любіць аднаўляць старыя тэмы й матывы, знаныя й характэрныя для даўнейшых літаратурных эпохаў. З мастацкага гледзішча ня можна ім аднак нічога закінуць, бо спосаб іх артыстычнага апрацаваньня і ўняцьця зьяўляецца зусім новы й арыгінальны, які ня мае нічога супольнага з апрацаваньнем традыцыйным.

Каб усьцерагчыся непаразуменьняў, трэба адцеміць, што гаворачы ўсьцяж аб вартасьці літаратурнага твору, маем наўвеце толькі літаратурную ягоную вартасьць, а ня нейкую іншую. Што нікаторыя літаратурныя творы могуць так-жа мець вартасьць пазалітаратурную, як вартасьць грамадзкую, нацыянальную, маральную, этычную і г. д., у залежнасьці ад таго, ці апісываюць і ў належны спосаб асьвятляюць успомненыя праблемы, гэтага ня маем патрэбы пярэчыць. Напасьледак была ўжо аб гэтым мова вышэй. Калі-ж аднак задзержываемся так доўга над гэтым заблытаным пытаньнем, то ходзіць толькі аб тое, ці літаратурны твор, дзякуючы свайму ідэолёгічнаму зьместу, мае, апрача тэй ці іншай пазалітаратурнай вартасьці, так-жа большую вартасьць артыстычную, ці, разьвіваючы перад чытачом нейкую блізкую яму праблему, выклікае гэтым самым глыбейшае эстэтычнае перажываньне?

Каб адказаць на гэтае пытаньне, няма патрэбы шукаць спэцыяльных доказаў, бо мусілі-б тады паўтарыць амаль усё вышэйсказанае. З дасюлешніх разважаньняў аб істоце літаратуры і яе аўтаномічнасьці сярод іншых зьявішчаў, будучы плодам людзкога таленту, вынікае ясна, што ня можа быць ніякай *абсалютнай* розьніцы ў вартасьці літаратурнага твору ў залежнасьці толькі ад таго, што гэты твор у сабе апісывае. Затое ў некаторых прыпадках можа быць між імі розьніца *адносная,* калі апісаны ў творы факт ёсьць сам па сабе для нас асабліва блізкім, прамаўляе глыбей да нашай пачуцьцёвасьці і выклікае багатшыя перажываньні. Гэтак напрыклад *Тры песьні* Танка, якія для кожнага будуць выдавацца творам няштодзеннай мастацкай

якасьці, асабліва зьяўляюцца блізкімі беларускаму чытачу, бо закранаюць пытаньні нязвычайна для яго балючыя й важныя. Іншая справа, што сам спосаб прадстаўленьня гэтага пытаньня зьяўляецца ў Танка нязвычайна сугэруючым, што ўжо адносіцца да артыстычнага апрацаваньня тэмы. У кожным прыпадку няма сумлеву, што літаратурны твор, аснованы на матар'яле пачуцьцёва блізкім чытачу, выкліча ў ім глыбейшыя й багатшыя эстэтычныя перажываньні.

Гэты „матар'ял пачуцьцёва блізкі чытачу“ не абавязкава мусіць агранічвацца ўсяго толькі да ідэолёгічнага зьместу твору ці нейкай праблемы, асабліва важнай у грамадзкім жыцьці. Наадварот, паняцьце гэтае можа ахопліваць вялікі круг розных іншых зьявішчаў, якія для чытача прадстаўляюць асаблівую пачуцьцёвую вартасьць. У кожным аднак прыпадку зьяўляецца гэтая вартасьць адноснай, бо тое, што можа аднаму выдавацца пачуцьцёва блізкім, другому будзе раўнадушным, а яшчэ іншаму зусім далёкім і чужым, а ведаем, што з чыста суб'ектыўных паглядаў і адчуваньняў ня можым выводзіць ніякіх абсалютных увагульненьняў, роўна абавязуючых кожнага. З другога боку энтузыястам ідэйнасьці літаратуры не зашкодзіць ведаць, што нятолькі творы із выразным ідэолёгічным зьместам могуць выклікаць адказуючыя яму перажываньні ў чытача, але нярэдка так-жа й такія творы, каторыя зьяўляюцца яго пазбаўленыя. Не заўсёды лёгка ў сувязі з гэтым азначыць, што іменна зьяўляецца ідэйным элемэнтам літаратурнага твору, а што не, бо й гэтыя два паняцьці зьяўляюцца да некаторай меры даволі адноснымі. Гэтак напрыклад выжэй пералічаныя вершы Купалы бясспрэчна вызначаюцца глыбокім ідэйным элемэнтам, які дзякуючы мастацкай канкрэтызацыі нязвычайна жыва прамаўляе да чытача. Але часамі ня меншыя выклікае ў нас грамадзкія пачуцьці й беларуская народная песьня, апісаньні беларускіх краявідаў у *Новай зямлі* Коласа і Танкавай *Нарачы,* хаця ў вапісаньнях гэтых ідэйнага элемэнту ў тым значэньні, як у Купалы, ня знойдзем із сьвечкай.

Гэты просты прыклад, але як-жа вымоўны, пераконывае нас, што ня можна звужаць і ўпрошчываць некаторых паняцьцяў, якія ў істоце сваей зьяўляюцца даволі скамплікаваныя і вымагаюць больш далікатнага да іх падходу. Гэтак і ў дадзеным прыпадку: — зь вершаў Купалы выліваюцца думкі й пачуцьці беспасярэдна, іншыя-ж творы, прыведзеныя тутака, родзяць у нас адпаведныя перажываньні толькі дзякуючы блізкім асацыяцыям між тым, што ў іх апісываецца, а тым, з чым зьяўляюцца ў прычыновай сувязі: артыстычна паказанае вонкавае хараство Беларусі, а так-жа блізкая кожнаму з нас мэлёдыя народнай песьні актуалізуюць нашую любоў і пачуцьцёвую сувязь з родным краем.

* * *

З усіх нашых разважаньняў аб адносінах літаратуры да канкрэтнага жыцьця і аб адбітай у ёй запраўднасьці выплывае яшчэ адна пасярэдняя ўвага, але ня менш важная. Літаратура, як мы ўжо бачылі, адбівае ў сабе рэальны сьвет у вельмі розных і багатых аспэктах, гэтак сама і яе становішча адносна гэтага сьвету і ўплыў на яго зьяўляюцца вельмі скамплікаванымі і не зьмяшчаюцца ў вадных і тых самых рамах для кожнага новага прыпадку. Кожны літаратурны твор, а нават кожнае ў ім зьявішча, хаця й падлягаюць аснаўным законам, кіруючым мастацкім жыцьцём, зьяўляюцца самыя ў сабе зьявішчамі адзінымі й непаўтаральнымі, бо кожныя наступныя будуць мець іншы характар, іншыя асаблівасьці. Дык і ў інтэрпрэтацыі і ацэне іх трэба заглядацца на кожны літаратурны твор, як на вартасьць да некаторай меры зусім новую і ад іншых незалежную, высьцерагаючыся ўсякіх упрошчываньняў і схэматычнасьці.

(Канец)

А. ДУБРОВІЧ

* * *

— Гэй, віхор шырокакрылы,
падарожнік няпрытульны,
дзе зьвіваў ты хмарам грывы,
дзе спраўляў свой лёт разгульны?

Раскажы, што ў сьвеце бачыў,
скрось—на захадзе й на ўсходзе, —
крумкачы аб чым дзе крачуць,
аб чым весткі ў сьвеце ходзяць? —

— Быў далёка я за морам,
цалаваўся з акіянам,
на сваіх сьняговых горах
я гуляў з вясельлем п'яным.

І на захадзе й на ўсходзе
сьвет грыміць і звоніць стальлю,
сьмерць шалёны скок заводзе,
жыцьцё ломячы бяз жалю.

Гэй, там ёсьць чаму паўчыцца!..
сам вучыць — ня маю часу...

І віхор далей імчыцца
без спачынку, без папасу.

АД. СТАНКЕВІЧ

З літуанізмаў у беларускай мове

В.

Вушак—верхні брус, наддзьверны касяк; літ. **ušokas**—тое-ж.

Выметвацца — выкідвацца, выкручвацца, скакаць бяз толку, махаючы галавой, рукамі, нагамі й усім целам; непаважны гэта хлапец: выкідваецца ён, выметваецца; літ. **mesti**, (meta, metė) — кідаць, кінуць, выкінуць, выкідваць, адкідаць, адкінуць, **metus** — няўежджаны, ськіваючы з сябе чалавека, конь.

Вайдаваць, вадзіцца — спрачацца, гневацца (з кім), калаціцца, у нязгодзе з кім жыць; літ. **vaidas** — звадка, калатня, спрэчка.

Вайцяць — прабіраць, лаіць каго, крычаць на каго; літ. **vaitoti** — стагнаць, наракаць.

Венцер, венцяры — рыбалоўная прылада з ніцяной сеткі на абручах; літ. **venteris** — тое-ж.

Віляць — махаць, выкручваць чым; сабака хвастом віляе; ня быць шчырым у гутарцы, у паступках, укрываць праўду; ён нешта віляе, праўды ня кажа; літ. **vilioti** (vilioja, viliojo)—вабіць, падманваць, спакушаць, **vilius** — абман, злы намер, падход з ашуканствам.

Валіць сукно ў валюшы, намачваць і ўбіваць; літ. **valyti** — чысьціць, ачышчаць, прачышчаць; **velėti** — біць пранікам, мыючы хусьцё, мыць, калаціць.

Валюш — будынак, дзе прылады, каб валіць; літ. **veliušis.** Хоць валіць і валюш могуць паходзіць ад славянскага: валіць, звальваць у кучу, адгэтуль расейскія **валенкі.**

Вэркі — меснасьць пад Вільняй: літ. **verkti** — плакаць, легенда кажа, што Вітаўт Вялікі палюючы, калі тут былі непрайдзімыя лясы, знашоў у лесе пакінутае плачучае дзіця і затым гэту меснасьць назваў Вэркамі.

Вяпла — разявяка, апоўзьлік, разінка; літ. **vėpla** — тое-ж.

Вашкель, Вашковіч — прозьвішчы; літ. **vaškas** — воск. Хоць можа быць ад **Іван** — **Івашка.**

Валэндацца — дарма час траціць, нічога не рабіць, бадзяцца, цягацца з мейсца на мейсца; літ. **valanda** — гадзіна, праводзіць гадзіны.

Г.

Гіль — авадзень, гілёсы, гіляваць; літ. **gyloti**, **gylinoti** — гіляваць, бегаць падчас сьпекі (аб скаціне), гарачыня — скаціна гілюе; літ. **gylys** — авадзень, жыгала, **gilti** — калоць, раніць тонкім вострывам, жыгаць, джгаць, стрыкаць, адносіцца да пчалы, зьмяі, крапівы.

Гейстуны — сяло недалёка ад Барун; літ. **geisti** — сільна чаго жадаць, прагнуць, **geistinas** — той, каго трэба жадаць.

Грэбля — гаць, насып, стаў; літ. **gruoblė** — купіна, **gruoblyne**, **gruoblins** — поўнае купінаў, выбоінаў месца, дарога. Апрача гэтага ў Беларусаў гэтае слова абазначае так-жа дарогу ці месца агулам нізкое, балотнае.

Гаўя — чыгуначная станцыя недалёка ад Ліды; літ. **gauja** — таўпа, мноства людзей, стада (сабак, ваўкоў), банда, шайка.

Гайлешы — сяло Крэўскай вол.; літ. **gailėtis** — каяцца, раскайвацца, жалець чаго, шкадавацца.

Гудаўшчына — сяло Гальшанскай вол.; літ. **gudas** — Беларус, **Gudai** — Беларусы, **Gudija** — Беларусь, **gudėti** — беларусець, словам **gudas** літоўцы часам называюць не-літоўцаў агулам, прынамсі так было даўней.

Гурштын (овіч) — прозьвішча ў в. Шутавічы пад Смургонямі і ў в. Арленяты ў Крэўскай вол.; літ. **gursti** (gursta, gurdo) — не сьпяшыць, ацягвацца, траціць час, вянуць, слабець, гінуць, дохнуць.

Груца — ячменныя буйныя крупы, крупяная каша, крупнік; літ. (з нямецкага) **gruce** — ужываецца ў тым-жа самым значэньні.

Гнібіць — уціскаць, крыўдзіць, гнясьці; літ. **gnybti** — шчыпаць, шчапіць, сьціскаць шчыпцамі. Але так-жа можа быць ад слова — **гнёт, гнясьці**.

Гуня, гунька — суконная посьцелка, пераважна для накрываньня коней. Пакрый гунькай (гуняй) каня; літ. **gunia** — значэньне тое-ж самае.

Гулта — сьвіная пасьцель, папраў сьвіням гулта. Твая пасьцель, як сьвіное гулта; літ. **gultas, (gulta)** — пасьцель, ложка, лаговішча, **gulti** — легчы, класьціся, налягаць, зьлягаць.

Граўжышкі, Гроўжышкі — мястэчка ў Ашмянскім пав.; літ. **graužikas** — грызун, **graužymas** — дакоры сумленьня, **graužynas** — пяшчанае месца, шчэбель.

Гервяты—мястэчка на ўсход ад Вільні; літ. **gervė** — жураў.

Грыгеляны — сяло на ўсход ад Ашмяны; літ. **Grigas** — Рыгор.

Гінеўцы, Гінёўцы — сяло там-жа; літ. **gynioti** — бараніць, абараняць, забараняць.

Гудзеняты — сяло між Ашмяной і Барунамі; літ. **gudinti** — прывучаць, **gudiniai** — дробная цыбуля.

Гарэцкаўшчына — двор і сяло Гальшанскай вол., між Багданавам і Барунамі; літ. **garėti** — параваць (калі пара з чаго выходзіць), выдыхацца, сохнуць (аб чалавеку), **gorė** — гаршчок з тлеючымі вуглямі, **gorėti** — пячы ў горле, калі што вострае зьесьці, пяршыць.

Гàліцца — сільна чаго жадаць, упорыста да чаго імкнуцца. Карскі выводзіць ад літ. **galeti** — магчы, быць у сіле, **galimas** — магчымы.

Галіна — ветка; літ. **galinis** — канцавы, канчатны, крайні: **galinis** — мізінец.

Гудагай — чыгуначная станцыя за Нова-Вялейкай; літ. **gudas** і бел. **гай**: беларускі гай.

М. ШКЯЛЁНАК

Прадмет беларускае гісторыі

Што мае быць прадметам гісторыі Беларусі? У прынцыпе адказ на гэта пытаньне ёсьць просты: *беларуская гісторыя павінна даць абраз мінуўшчыны беларускага народу і з гэтай мэтай заняцца сыстэматычным вывучэньнем гістарычных фактаў, павязаць іх ніткай прагматызму, а напасьледак даць сынтэтычны агляд гістарычных падзеяў.* Практычнае апрацаваньне гэтых задачаў напатыкае, аднак, на перашкоды падвойнага характару, якія прымушаюць беларускага гісторыка, прынамся сучаснага, ісьці ў кірунку агранічэньня менаваных заданьняў. Першая перашкода дыктуецца агульным станам гістарычнае навукі, ясьней — гістарычнае мэтодолёгіі, другая залежыць ад варункаў спэцыфічна беларускіх: стану жаролаў беларускае гісторыі, дасюлешняе беларускае гісторыёграфіі.

Сутнасьць першае прычыны зьмяшчаецца ў тым, што гістарычная мэтодолёгія яшчэ не дайшла да тае дасканаласьці, якая-б дазваляла гісторыку безаглядна ёй карыстацца. Нясучы сьвятло ў цёмныя закуткі мінуўшчыны, гісторык павінен пільна зважаць, ці ён ідзе тым шляхам, які найлепш дазваляе ўбачыць гэтыя куткі, а значыцца павінен усьцяж аглядацца на тасаваны ім мэтад.

Значэньне апошняга выяўляцца ўжо пры пляновай сэгрэгацыі гістарычнага матарыялу, ад якой залежыць паўніня малюнку мінуўшчыны, а яшчэ ў большай ступені пры шуканьні залежнасьці між здарэньнямі, інакш пры іх тлумачэньні. Дасьледчык, нават нацыянальнай гісторыі, мае перад сабой вялікае мноства гістарычных фактаў, важных і няважных, якія трэба разьбіць на групы і выбраць найбольш характэрныя для намалёваньня абразу перажытых народам падзеяў. Але гэта групаваньне павінна адбывацца паводле пляну, абыймаючага тыя кірункі жыцьця народу, якія ў сваей суцэльнасьці далі-б найбольш дасканальны і праўдзівы малюнак мінуўшчыны.

Якія-ж гэта маюць быць кірункі?

На працягу шэрагу стагодзьдзяў зацікаўленьне гісторыкаў абмяжоўвалася толькі палітычнымі падзеямі, войнамі, рэвалюцыямі і адпаведна да гэтага дабіраліся гістарычныя факты. Сама гісторыя разумелася, як літаратурнае апавяданьне аб менаваных здарэньнях, з тэндэнцыяй да навучаньня сучасьнікаў. Гэткі стан гісторыі ёсьць характэрны для клясычнае Грэцыі, Рыму, сярэднявечча, гуманізму аж да пары францускага рацыяналізму з канца XVIII ст. Філёзафы-рацыяналісты не займаліся гісторыяй, як такой, а бачылі ў ёй толькі адзін з сродкаў да пазнаньня жыцьця чалавецтва, галоўна яго сэнсу і кірунку. З гэтай мэтай яны сыстэматызавалі адпаведна і гістарычны матарыял, адкіда-

ючы тую яго частку, якую лічылі нехарактэрнай, чым абясцэньвалі масу гістарычных фактаў. З другога аднак боку гэткі пагляд на гісторыю прымушаў рацыяналістаў пашырыць яе рамы ў кірунках дагэтуль ігнараваных. Яны заінтэрасаваліся ня толькі фактамі палітычнага і ваеннага характару, але і эвалюцыяй навук, мастацтва, звычаяў і г. д. Запраўдным зьместам гісторыі падаўнейшаму былі палітычныя і ваенныя падзеі, але ўсё часьцей да апавяданьняў аб іх дадаваліся агляды „поступаў чалавечага духу“. Дасьледваючы агульны сэнс жыцьця чалавецтва, рацыяналісты ня шукалі яго ў самой гісторыі, а толькі ў сваіх філёзофічных канцэпцыях. Гэты знойдзены „сэнс“ яны ўносілі ў гісторыю і адпаведна да яго сыстэматызавалі гістарычны матарыял. На гэтай аснове працы іхнія ёсьць тэндэнцыйнымі, але сам факт увядзеньня сыстэматызацыі гістарычнага матарыялу і пашырэньне межаў заінтэрасаваньня гісторыі ёсьць вялікай заслугай філёзафаў-рацыяналістаў.

Раз выйшаўшы з традыцыйнага кругу зацікаўленьня, гісторыя ўжо не затрымоўваецца ў пашырэньні яго межаў і абхоплівае найшырэй праявы жыцьця народу.

Сяньня ад нацыянальнае гісторыі вымагаецца вывучэньня ня толькі войнаў і палітычных падзеяў, але і *матарыяльных умоваў жыцьця народу, яго культуры, эканамічнага быту, грамадзкіх і гаспадарственных установаў*. Пашырэньне ў гэтых кірунках гістарычных досьледаў дасьць у рэзультаце больш менш поўны абраз перажытага народам. Само праз сябе разумеецца, што пасьпех гістарычных досьледаў абмяжаваны колькасьцю і якасьцю дайшоўшага да нас матарыялу. Найлепшыя пляны астануцца толькі плянамі, калі няма матарыялу. *Гісторыя Беларусі павінна абняць менаваныя галіны народнага жыцьця*, каторыя з гледзішча сучаснае мэтодолёгіі і патрэб грамадзянства дастаткова характарызуюць абраз мінуўшага.

Азначэньне межаў заінтэрасаваньня гісторыі, пляновая сэгрэгацыя гістарычнага матарыялу — гэта першае заданьне гісторыка. Наступным будзе тлумачэньне гістарычных фактаў, інакш шуканьне між імі прычыновае сувязі. Толькі ў вадносна рэдкіх прыпадках запраўдныя прычыны гістарычных фактаў пераказалі нам тагачасныя наглядчыкі. У большыні прыпадкаў гісторык сам павінен шукаць гэтых прычын, каб павязаць факты ніткай прагматызму. Гэта важная мэтодолёгічная квэстыя перажыла вялікую эволюцыю, зь якой неабходна пазнаёміцца, каб на яе фоне ўцяміць дасюлешнія памылкі гістарычнае мэтодолёгіі з гэтага гледзішча і азначыць шлях найбольш правільнага навукова способу шуканьня прычын гістарычных фактаў.

Ад пачатку гісторыі і амаль да палавіны XIX ст. гісторыкі тлумачылі факты, як рэзультат дзеяньня нейкіх надпрыродных сілаў. Гэткім парадкам паўстала некалькі тэорыяў, апёртых на шуканьні прычын гістарычных зьявішчаў не ў самой гісторыі, а навонкі яе. Найстарэйшая зь іх — *тэолёгічная*, меўшая сваіх

прадстаўнікоў нават да апошніх часоў,—лічыць, што гістарычнымі зьявішчамі кіруе надпрыродная, боская сіла, якая вядзе ўсё да празначанай Богам мэты. Але гісторык не патрабуе шукаць першае прычыны або апошняе мэты існуючага.

З гэтага мэтафізычнага жарала выплывае і гэгельянская *тэорыя ідэй*, каторыя зьдзейсьніваліся ў гісторыі паступова за пасярэдніцтвам зьмяняўшых адзін другога народаў. Гэтыя ідэі, як-бы жывыя істоты, мелі быць прычынамі гістарычных падзеяў. Тэорыя гэта аджыла свой век, але водгукі яе існуюць яшчэ і сяньня ў форме г. зв. гістарычных місыяў, прыпісваных народам, або асобным адзінкам.

У лучнасьці з тэорыяй ідэй была і *тэорыя разумнага характару гісторыі, або тэорыя няўхільных прычын*, каторая казала, што ўсялякі рэальны гістарычны факт адначасна ёсьць разумным, г. ё. згаджаецца з разумным плянам усяго існуючага. Паводле гэтай тэорыі ўсякі сацыяльны факт мае raison d'etre у разьвіцьці грамадзянства, інакш, што ўсё дзеіцца выгадна для грамадзянства. Тэорыя гэта надта аптымістычная, але не навуковая, бо сама нават абсэрвацыя існуючага хутчэй даказвае праціўнае.

Гэткай-жа аптымістычнай ёсьць і *тэорыя бязупыннага і неабходнага прагрэсу чалавецтва*, выплываючая з таго-ж самага паняцьця аб разумным кіраваньні сьветам. Хоць гэта тэорыя была прынята пазытывістамі, але ейны мэтафізычны характар аж надта відавочны. „Прагрэс“ у звычайным разуменьні ёсьць ня што іншае, як суб'ектыўнае выражэньне, якім азначаюцца карысныя для нас зьмены. Але калі-б узяць гэта слова і ў ваб'ектыўным сэнсе („павялічэньне размавітасьці і каардынацыі зьявішчаў“—як кажа Спэнсэр), дык вывучэньне гістарычных фактаў не паказвае на бязупынны прагрэс чалавецтва, а толькі на чародныя поступы, побач з заняпадам, і не дае ніякіх асноў прыпісваць гэтыя поступы нейкай сталай прычыне, свомай усяму чалавецтву, а не шэрагу мясцовых прыпадковых здарэньняў.

Пералічаныя тэорыі, аб'ясьняўшыя гістарычныя факты з помаччу мэтафізыкі, былі разьбіты г. зв. „гістарычнай школай“ у Нямеччыне, якая стварыла собскую тэорыю, шукаўшую прычын не ў надпрыродных сілах, *а ў самым грамадзянстве*. Тэорыя гэта пэрсоніфікавала грамадзянства, прыпісвала яму спэцыяльны *тэмпэрамэнт*, асаблівы *геній* нацыі або расы, каторы праяўляецца ў розных галінах людзкой дзейнасьці і тлумачыць іхнюю ўзаемную сувязь. Гэткім парадкам прычын гістарычных зьявішчаў, перажытых паасобным народам, паводле прадстаўнікоў гістарычнае школы, трэба шукаць у істоце самога народу. Гэткі пагляд быў значным поступам, але прадстаўнікі гістарычнае школы, пэрсоніфікуючы грамадзянства і прыпісваючы яму, быццам жывой істоце, асобную сілу да разьвіцьця, ня стрымаліся на гэтым і пачалі ажыўляць іншыя адарваныя паняцьці (напр. закон, слова, абрад, догмат). Гэтыя ажыўленыя абстракцыйныя

паняцьці мелі як-бы собскую сілу, пхаючую іх да эволюцыі. Пачалі казаць аб жыцьці і выміраньні слоў, догматаў, установ і г. д. Гэткім парадкам побач з гістарычнымі фактамі ствaрыўся цэлы сьвет фікцыйных істотаў. Каб пазбыцца гэтай мітолёгіі, ня трэба шукаць прычын гістарычных фактаў у вадарваньні ад іх канкрэтнае асновы — думаючых і дзеючых індывідуумаў. А калі і карыстацца абстракцыйнымі назовамі, дык трэба асьцерагацца ўсякае мэтафоры, якая прыпісвала-б ім дзеяньні жывых істотаў.

Побач з гэтымі мэтафізычнымі і мэтафорычнымі тлумачэньнямі гістарычных працэсаў былі спробы пры дасьледваньні прычын тасаваць клясычны мэтад прыродных навук — *параўнаньне раўналежных радоў* наступаючых па сабе фактаў дзеля выясьненьня, каторыя зь іх спатыкаюцца заўсёды разам. Аднак, існаваньне двух фактаў у некалькі радох не даказвае яшчэ, што адзін зь іх ёсьць прычынай другога, бо абодвы могуць быць рэзультатам нейкай іншай прычыны.

Напасьледак трэба зацеміць, што даволі паважнае значэньне ў тлумачэньні гістарычных фактаў здабыў сабе *эканамічны* мэтад, каторы прымушае шукаць прычын перажытых дадзеным грамадзянствам падзеяў у яго эканамічнай структуры.

Ужо само павярхоўнае пералічэньне спосабаў, якімі гісторыкі стараліся і стараюцца тлумачыць гістарычныя факты, паказваюць на іхнюю разнаякасьць, а гэтым самым і на іхнюю недасканальнасьць. Мэтодолёгічнае дасьледваньне прычын якогась факту патрабуе аналізы варункаў, у якіх ён адбыўся, да чаго патрэбна добрая знаёмасьць гэтых варункаў. А падобнае знаёмасьці ў гісторыі якраз і нямашака, дзеля чаго прыходзіцца адмовіцца ад выясьненьня прычын з помаччу простага мэтоду, як гэта адбываецца ў іншых навуках. Аб прычынах фактаў гісторыкі даведваюцца або ад аўтараў дакумэнтаў, наглядаўшых факты, або па аналёгіі з прычынамі, дзеючымі ў сучаснасьці і нагляданымі кожным з нас. Аўтары дакумэнтаў перaказалі прычыны толькі *паасобных* нагляданых імі фактаў. Не маглі яны перадаць прычын *агульных* перамен, *агульных* фактаў. Каб дасьледваць прычыны агульных фактаў, гісторык можа карыстацца толькі *аналёгіяй* між сучаснасьцю а мінуўшчынай, пры помачы беспасрэднага нагляданьня перамен у сучасных грамадзянствах.

Мэтад гэткага дасьледваньня, прапагаваны ў Францыі праф. Ланглуа і Сэньёбос'ам, хоць яшчэ ня зусім скрысталізаваўся, але ў васновах сваіх выдаецца найбольш правільным. Галоўныя яго асновы паводле гэтых вучоных зьмяшчаюцца ў наступным:

1) Каб дабрацца да прычын узаемадзеяньня розных прывычак у грамадзянстве, трэба адкінуць абстракцыйную форму, якую гэтыя прывычкі прыймаюць у мове дакумэнтаў (догмат, закон, установа), а дабрацца да рэальных, канкрэтных цэнтраў, якімі заўсёды ёсьць думаючыя і дзеючыя людзі. Толькі ў іх лучацца розныя роды дзейнасьці, азначаныя абстракцыйнымі паняцьцямі. Узаемадзеяньне гэтых родаў тлумачыцца або нейкай пануючай *прыкметай* чалавечае натуры, або *сытуацыяй* людзей, каторая адбіваецца на праявах іхняе дзейнасьці. Узаемная залежнасьць ня можа быць аднолькавай між рознымі родамі дзейнасьці: яна будзе вялікшай там, дзе адзінка знаходзіцца ў цеснай сувязі з масай (эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае жыцьцё) і слабейшай у галінах умысловае дзейнасьці, дзе асабістая ініцыятыва праяўляецца свабадней (мастацтва, навукі).

2) Каб дабрацца да прычын эволюцыі, трэба так-жа зьвярнуцца да адзіных істотаў, каторыя могуць пасьлядоўна разьвівацца, паіменна да людзей. Прычынай усякае эволюцыі ёсьць перамена або ў *матарыяльных абставінах існаваньня* або *прывычаеньнях людзей*. Адносна апошняй трэба зацеміць, што абсэрвацыя паказвае нам дваякія перамены: або людзі астаюцца тыя самыя, але зьмяняюць свае прывычкі, або людзі, якія трымаліся старых звычаяў, сходзяць са сцэны і замяняюцца іншымі, каторыя ўжо ня трымаюцца звычаяў сваіх папярэднікаў. Гэткая зьмена пакаленьняў выдаецца ў нашыя часы найбольш істотнай прычынай эволюцыі. Існуе тэндэнцыя думаць, што тое самае было і ў мінуўшчыне: эволюцыя адбывалася тым вальней, чым больш маладыя пакаленьні трымаліся звычаяў сваіх продкаў.*)

Напасьледак трэба зацеміць, што на гістарычныя здарэньні ўплываюць бязумоўна расавыя розьніцы між народамі, але гісторыя не дае магчымасьці дасьледаваць гэтых уплываў.

Гэткім парадкам мы азначылі круг зацікаўленьня беларускага гісторыка пры досьледах над гісторыяй собскага народу і пазнаёміліся з сутнасьцю першай перашкоды агульнага характару — сучасным станам гістарычнае мэтодолёгіі. Але беларускі гісторык павінен лічыцца з іншымі труднасьцямі, якія дыктуюцца сучасным станам досьледаў над беларускай гісторыяй. Побач з пералічанымі на пачатку заданьнямі, беларускі гісторык павінен мець на ўвазе яшчэ адно: — *зьбіраньне гістарычных матарыялаў*. Стан беларускае гісторыёграфіі да гэтай пары такі, што прымушае беларускага дасьледчыка проста зьбіраць факты і даваць ім першую навуковую апрацоўку. Беларускія гістарычныя матарыялы раськіданы па ўсей Эўропе, а нават Сібіры. Толькі частка іх апублікавана, значная-ж частка і дагэтуль ёсьць трудна даступнай, схаванай у розных чужацкіх установах, або прыватных архівах, дзе іх у літаральным сэнсе слова трэба адкрываць. І толькі там, дзе факты ўжо сабраны і асьветлены, беларускі гісторык можа здабыцца на агульнейшыя гістарычныя высновы, характарыстыку таго ці іншага гістарычнага працэсу і нават даць абраз тае пасьлядоўнасьці, у якой разьвіваліся асноўныя факты ў гісторыі Беларусі.

Паддаючы навуковай апрацоўцы гістарычныя матарыялы,

*) Ланглуа и Сеньобосъ. Введеніе въ изучэніе исторіи. Переводъ Серебряковой, С.П.Б. 1899 г.

беларускі дасьледчык надта часта спаткаецца з распрацаваньнем гэтых матарыялаў чужымі гісторыкамі. Нармальна ня было-б дзіва, каб гісторыяй Беларусі займаліся ня толькі Беларусы, але і чужынцы. Аднак розныя спэцыфічныя дзейнікі выклікалі тое зьявішча, што вялікая бальшыня працаў чужых гісторыкаў аб Беларусі ёсьць тэндэнцыйнай, а гэтым самым не навуковай. Таму беларускі гісторык павінен усьцяж гэтыя тэндэнцыі мець на ўвеце і шляхам крытыкі зь імі змагацца.

Неабходнасьць зьбіраньня матарыялаў і першае іхняй апрацоўкі ня выключае аднак магчымасьці пісаньня гісторыі Беларусі ўжо цяпер. *Касьцяк эволюцыі гістарычнага працэсу Беларусі ў галоўных нарысах распрацаваны,* што і дае беларускаму дасьледчыку легітымацыю да агульнай працы над гісторыяй Беларусі. Новыя матарыялы могуць толькі выясьніць няясныя маманты ў гісторыі, некаторыя асьвятліць інакш, або паўней, але ня зьменяць ужо распрацаваных асноў белар. гістарычнага працэсу.

Навуковае апрацаваньне беларускага гістарычнага працэсу мае і вялікае практычнае значэньне. Паводле старога афорызму, нацыянальная гісторыя ёсьць шляхам да нацыянальнага самаасьведамленьня. І запраўды, веда мінуўшчыны памагае зразумець сучаснасьць і вытлумачыць заданьні будучыні. Народ, ведаючы сваю гісторыю, жыве сьвядома, ёсьць чулы на акружаючую сапраўднасьць і разумее яе. З гэтага гледзішча заданьнем кожнага нацыянальнага гісторыка ёсьць даць свайму грамадзянству абраз мінуўшчыны ў праўдзівым аспэкце. Паказаўшы грамадзянству галаўнейшыя маманты яго гістарычнага жыцьця, беларускі гісторык гэтым споўніць сваю задачу. Практычнае прытарнаваньне гэтай веды ад яго не залежыць.

Гэткім парадкам з усяго вышэйменаванага відаць, што як тэорэтычны гэтак і практычны пункт гледжаньня ставяць гісторыі Беларусі аднолькавую задачу: *сыстэматычнае прадстаўленьне таго гістарычнага працэсу, каторы прывёў беларускую нацыянальнасьць да яе сучаснага палажэньня.*

<u>*А. ДУБРОВІЧ*</u>

Калісь любові хмель вясьняны

Калісь любові хмель вясьняны,
што на калосьсі віс красой,
пілі мы сэрцам аж да п'яна,
сьмялялась радасьць нам расой.
Расталісь мы: на шлях змаганьня
адзін я без цябе пашоў,
цябе жыцьця маніла раньне,
магілай веяў звон акоў.
Я йшоў нямала ў непагоду...
І зноў мой край, і знова ты,
насустрач мне твой твар пагодны,
ўсё такжа сьвежы, малады.
Адно,—што зьменнага я бачу:
вачэй агонь раўней гарыць;
ня раз мо' выпілі бяз плачу
сьлязу, што ў сэрцы накіпіць?
А мо' ты сэрцам зразумела
цану нявыбітых дарог?..
Дык дай руку! і разам з верай,
пайдзём да слаўных перамог!

<u>*М. ШКЯЛЁНАК*</u>

Сынтэза беларускае гісторыі

(паводле праф. М. Доўнар-Запольскага)

Хто з Беларусаў, хоць крыху знаёмы з досьледамі над роднай гісторыяй, не спатыкаўся з прозьвішчам праф. Доўнар-Запольскага, вялікім і дарагім ня толькі дла беларускага гісторыка, але наагул для кожнага Беларуса! Праф. Доўнар-Запольскі — гэта запраўды нашая гордасьць. Працы яго, прысьвечаныя гісторыі Беларусі ад найдаўнейшых часоў, ведамы загранічнаму навуковаму сьвету. Няўтомны працаўнік, праф. Доўнар-Запольскі выпусьціў у сьвет шмат капітальных працаў у мове расейскай і беларускай аб сваей бацькаўшчыне-Беларусі. Але ня толькі ў гэтым зьмяшчаецца яго заслуга ў беларускай гісторыі, як навуцы. Шмат хто з ведамых гісторыкаў пісаў аб мінуўшчыне Беларусі, аднак значэньне іх ёсьць куды меншае. Заслуга праф. Доўнар-Запольскага галоўная ў тым, што ён першы палажыў фундамэнты сынтэзы беларускай гісторыі і вывеў асновы яе будучага прыгожага будынку. Бязупынныя студыі над мінуўшчынай свайго народу дазволілі праф. Доўнар-Запольскаму дасканальна апанаваць гістарычны матарыял і зірнуць, калі так скажам, з птушынага ўзьлёту на беларускую мінуўшчыну. Беларускім гісторыкам астаецца толькі ісьці шляхам, паказаным праф. Доўнар Запольскім. Ясна, што гэты шлях патрабуе яшчэ ачысткі, магчыма, што ў некаторых мясцох яго трэба будзе выпраставаць, але кірунак яго ёсьць ужо азначаны. А гэта самае галоўнае.

Гэтая сынтэза нашае мінуўшчыны выражана ў працы паважанага прафэсара „Асновы дзяржаўнасьці Беларусі", хоць думкі скондэнсаваныя ў ёй ня трудна знайсьці ўва ўсіх яго працах манаграфічных.

Пазнаёмімся із зьместам разгляданай працы. На пачатку трэба заценіць, што праца гэта зьявілася ў пэрыяд расейскай рэвалюцыі, калі ўсе народы б. расейскай імпэрыі, а ў іх ліку і Беларусы, імкнуліся да збудаваньня собскае гаспадарственнасьці, калі паўставалі Польшча, Латвія, Літва, Чэхаславаччына і інш. новыя дзяржавы. Вось-жа праф. Доўнар-Запольскі падаў гістарычныя асновы да будаванай тады ў Менску беларускае гаспадарственнасьці і адначасна выказаў і свой пагляд на беларускую гісторыю, даючы яе кароткі сынтэтычны агляд.

Спыніўшыся над этнографічным абшарам, займаным беларускім народам, праф. Доўнар-Запольскі кажа:

„Беларуская нацыянальнасьць шчыльна жыве на гэтым абшары, а ў яе асяродзьдзі як кроплі спатыкаюцца іншыя нацыянальнасьці, згрупаваныя пераважна ў гарадах і мястэчках, і прадстаўляючыя сабой наплыўшы элемэнт".

Гаворачы як-бы аб прычыне, выклікаўшай яго працу, праф. Доўнар-Запольскі кажа:

„Нярэдка чуюцца як бы няпэўныя і сумлiўныя галасы, ці беларуская нацыянальнасьць можа тварыць асобнае самастойнае гаспадарства, або, прынамся, увайсьці як фэдэратыўная частка ў саюз гаспадарстваў. Гэтыя няпэўнасьці і сумлевы апіраюцца на няведаньні роднай гісторыі і на недастаткавай ацэне культурнае трываласьці беларускага народу".

А далей пераходзячы да сынтэзы нашай гісторыі зацемлівае:

„Часам наіўна выказваюць сумлеў, што беларускага гаспадарства ня было. Гэта правільна: пад гэткім назовам гаспадарства ня было, як ня было да паўстаньня гаспадарства італьянскага, бэльгійскага і г. д. Але беларуская нацыянальнасьць прадстаўляе сабой моцна збудаванае гаспадарства із плямёнаў Літоўскай Русі, г. ё. тэй часткі Русі, каторую абыймала Літоўскае Княства. І Беларусь, як зараз пабачым, адносна нядаўна згубіла азнакі быўшае сваей гаспадарственнасьці, моцнай, трывалай, якая адрозьнівалася гэткімі асновамі разьвіцьця, якімі мы можам толькі гардзіцца... Асновы гаспадарственнай самастойнасьці глыбака заложаны ў беларускай нацыянальнасьці і апіраюцца на дзейніках гістарычных, этнографічных, лінгвістычных і эканамічных. Гэтыя дзейнікі захварбоўвалі ўсю гісторыю Беларусі"...

Далей праф. Доўнар-Запольскі выказвае пагляд, які ўсё больш здабывае прыхільнікаў у навуцы, што:

„Беларусы зьяўляюцца амаль адзіным славянскім племенем, за выняткам хіба палякоў, якое здаўна жыве ў сваей старонцы, нікуль сюды ня прыходзіла і ня ўбрала ў сябе чужых элемэнтаў. Дзеля гэтага Беларусы паводле гістарычных і этнографічных асаблівасьцяў зьяўляюцца найбольш чыстым славянскім племенем".

Гэтым самым праф. Доўнар-Запольскі адкідае пагляд аб прыходзе беларускіх плямёнаў з „агульна-славянскай" або „агульна-рускай" прарадзімы. Гаворачы аб асноўнай рысцы ў ваднoшаньні Беларусаў да свае гаспадарственнасьці ў мінуўшчыне, аўтар кажа:

„Імкненьне да гаспадарственнай самастойнасьці, уменьне бараніць гэтую самастойнасьць, імкненьне да свабоднага дэмакратычнага ладу, зьяўляюцца аснаўной рыскай гістарычнае мінуўшчыны беларускага народу. І мы ня ведаем другога славянскага племені, у якога-б гэтая рыска натолькі яўна праяўлялася, як у нашых продкаў".

Гэта вельмі важная агульная тэза, да якой праф. Доўнар-Запольскі дайшоў у сваіх студыях. У далейшых разважаньнях праф. Доўнар-Запольскі робіць памылку, калі вылічае Крывічоў, Дрыгавічоў і Радзімічаў, як беларускія плямёны, а не ўспамінае аб Вяцічах і Северанах. Але тады, калі аўтар пісаў разгляданую працу, ня было яшчэ досьледаў праф. Растаргуева і інш., даказаўшых беларускасьць гэтых плямёнаў. Ідучы-ж за навейшымі працамі, беларускія гісторыкі павінны абняць сваім зацікаўленьнем Севершчыну і, зразумела, Пскоўшчыну, як заселеную Крывічамі. З гледзішча гістарычнага разьвіцьця беларускае гаспадарственнасьці праф. Доўнар-Запольскі разрозьнівае пачаткава існаваньне трох самастойных беларускіх гаспадарстваў: *Полацкага, Смаленскага і Турава-Пінскага,* падчырківаючы, як характэрную азнаку, існаваньне ў Полацку асобнай ад кіеўскай дынастыі — Рогваладавічаў. Пераходзячы да гэнэзы — Вялікага Княства Белар.-Літоўскага, праф. Доўнар-Запольскі адкідае распаўсюджаную тэорыю аб г. зв. „літоўскіх падбоях", паводле якой Вялікае Княства было збудавана шляхам падбою этнографічна-літоўскім элемэнтам беларускіх гаспадарстваў:

„Гэтак гістарычная навука рашуча зьбівае ўсе азнакі заваяваньня беларускіх земляў літоўскім князем".

Працэс злучэньня беларускіх земляў адбываўся дабравольна—шляхам умоваў, або жанімства князёў. Выказаная тут думка нязвычайна характэрная і сьмелая. Але апошнія досьледы ў поўнай ступені яе пацьвярджаюць. Археолёгічныя раскопкі ў Горадні, ведзеныя польскім археолёгам Ёдкоўскім (Jodkowskim) пацьвярджаюць, што існавала магутнае беларускае горадзенскае княства над Нёманам, якое было ў сутычнасьці з беларускім Наваградкам. У гэтых княствах паўстаў новы беларускі цэнтр, зь якім злучыліся на аснове шырокае фэдэрацыі іншыя беларускія гаспадарствы, творачы адну дзяржаву.

Праводзячы далейшую сынтэзу, праф. М. Доўнар-Запольскі паклікаецца на цэлы рад аргумэнтаў, якія доказваюць беларускі характар новага гаспадарства. Аргумэнты гэтыя мы абмінаем, бо яны ёсьць агульна ведамыя ўсім, хто хоць павярхоўна знаёмы з нашай гісторыяй.

На прыкладах Казіміра, Аляксандра, Жыгімонта Казіміравіча, Жыгімонта Аўгуста праф. Доўнар-Запольскі апірае сваю тэзу, што і Палякі выбіралі нашых гаспадароў сваімі каралямі і што гэта пэрсональная вунія ні ў чым не нарушала сувэрэннасьці Вялікага Княства. Не нарушала гэтай сувэрэннасьці і Люблінская вунія 1569 г., бо гэта быў дагавор роўных з роўнымі.

Прычыны заняпаду беларускай гаспадарственнасьці праф. Доўнар-Запольскі бачыць у Берасьцейскай рэлігійнай вуніі 1595 г., якая прынясла ў Беларусь рэлігійную вайну. Гэта вайна нішчыла ўсе сілы народу. Побач з гэтым пачаліся польскія ўплывы на беларускую шляхту і магнатаў. Гандаль і прамысловасьць занялалі, сялянства, дзякуючы ўзросту шляхоцкіх прывілеяў, трапіла ў поўную залежнасьць ад паноў. Беларуская мова ўступала паступова месца польскай або лацінскай.

Аднак, калі вышэйшыя слаі насельніцтва паддаваліся полёнізацыі, дык сялянства і ў значнай ступені мяшчанства ўпорыста баранілі свайго права на самастойнае рэлігійна-нацыянальнае жыцьцё.

Калі Беларусь трапіла пад Расею, у ёй пачалі ўвадзіцца расейскія парадкі. Расейскі рэжым змагаўся з палітычнымі ўплывамі апалячанай шляхты, палітыкуючым каталіцызмам, аднак, кажа праф. Доўнар-Запольскі:

„Гэта барацьба вялася няўдала, груба і несыстэматычна. Расейскі ўрад амаль да 60 гадоў дрэнна разумеў, што ён мае справу з бе-

ларускім краем. Ён не дагадваўся, ды па сутнасьці кірунку сваей палітыкі і ня мог апёрціся на дэмакратычныя элемэнты: на сялянства і мяшчанства. Дзеля гэтага, як ня дзіўна, полёнізацыя і пад Расеяй мела вялізарныя поступы, бо расейскі ўрад пасьпеў адтаўкнуць ад сябе ўсе тыя элемэнты, якія адзначаліся беларускім нацыянальным духам".

Гэткая палітыка зьнеахвоціла да сябе Беларусаў і таму яны, імкнучыся да вызваленьня ад расейскага рэжыму, прыймалі актыўны ўдзел у паўстаньнях 1831 і 1863 г. г.

Характарызуючы асновы гаспадарственнага і сацыяльнага ладу Беларусі, праф. Доўнар-Запольскі піша гэтак:

„Найдаўнейшы пэрыяд гісторыі Беларусі характарызуецца панаваньнем дэмакратычных ідэяў у сацыяльным і гаспадарственным ладзе. Найвышэйшую ўладу мела веча, якое выбірала князёў. Клясавага падзелу ня было, панавала ідэя роўнасьці".

Гэткі парадак існаваў да пачатку XVI ст., калі дыфэрэнцыяцыя сацыяльных клясаў, ішоўшая з Польшчы і этнографічнай Літвы, падзяліла і беларускае грамадзянства на тры клясы: шляхту, мяшчанства і сялянства. Гаспадарственны лад Беларуска-Літоўскае дзяржавы праф. Доўнар-Запольскі характарызуе, як рэспубліканскі, з выбіраным на ўсё жыцьцё прэзыдэнтам, званым вялікім князем, гаспадаром. Гэты лад вытварыўся шляхам эволюцыі даўнейшага вечавога парадку. На гэтыя дэмакратычныя парадкі Беларусі зьвярнуў вялікую ўвагу расейскі рэжым. У б. расейскай імпэрыі ня было правінцыі, да якой урад аднасіўся-б гэтак варожа, як да Беларусі. Расейскі ўрад зьліквідаваў дасюлешняе школьніцтва і ўзамен фактычна ня даў нічога. Гэткія меры расейскага ўраду спрычыніліся да далейшае полёнізацыі беларускае інтэлігенцыі, бо ўсе выдатнейшыя адзінкі, якія імкнуліся да палітычнае свабоды, далучаліся да польскага руху, скуль чакалі хутчэйшага вызваленьня. Пагардліва адносячыся да сялянства і мяшчанства, расейскі рэжым не даваў магчымасьці да разьвіцьця нашай інтэлігенцыі. Тым, што выходзілі з гэтых чыста беларускіх клясаў, не давалі працы ў краі, а высылалі ў глыбіню Расеі. У Беларусь наплывалі вялікарускія ўрадоўцы.

Змагаючыся з беларускай культурай і яе прадстаўнікамі, расейскі ўрад інстынктыўна або і сьведама разумеў самастойнасьць гэтай культуры і баяўся яе.

А запраўды, з культурнага гледзішча беларуская нацыянальнасьць — кажа паважаны аўтар — можа з гордасьцю ўспамінаць сваю мінуўшчыну. Праф. Доўнар-Запольскі вылічае вялікіх прадстаўнікоў беларускай культуры, пачынаючы ад XII ст., у галіне асьветы, літаратуры, права, над чым мы ня будзем спыняцца, бо гэтая вядомыя ёсьць ведамай шырэйшаму беларускаму грамадзянству і ня толькі беларускаму. Рэлігійнае змаганьне аслабіла, праўда, разьвіцьцё самабытнай беларускай культуры, але, кажа аўтар:

„Важна тое, што беларускі народ перанёс гэту пару змаганьня і ў значнай ступені гарады ды ўсё сялянства асталіся вернымі сваей нацыянальнасьці. Брацтвы далі вытрывалы прыклад змаганьня за сваю нацыянальнасьць. Яны абаранілі беларускую культуру, літаратуру, асьвету і беражна давялі нацыянальныя традыцыі, пачуцьцё нацыянальнае самабытнасьці да пачатку XIX ст., калі рэлігійная барацьба згубіла свой сэнс".

Беларуская культура на працягу навейшай сваей гісторыі мела шмат стратаў, узбагачваючы польскую і расейскую. Касьцюшка, Сыракомля, Крашэўскі, Адам Міцкевіч (дададзём ад сябе — Дастаеўскі) — гэта па паходжаньню Беларусы, якія працавалі на карысьць чужых культур.

Ідэя беларускага адраджэньня набрала асаблівага размаху ад 80 гадоў мін. стагодзьдзя, ня гледзячы на вялізарныя перашкоды з боку ўлады. Адрадзілася беларуская літаратура, ідэя беларускае гаспадарственнасьці. Усё гэта паказвае:

„на жывучасьць беларускай нацыянальнасьці"...

У канцы сваей працы праф. Доўнар-Запольскі, сумуючы высновы, кажа, што гісторыя беларускага народу ёсьць бліскучым доказам існаваньня яго гаспадарственнай самастойнасьці, яго выробленай стагодзьдзямі культуры, літаратуры, этнографічнай і языковай апрычонасьці. Упорыстае-ж змаганьне беларускага народу за сваю нацыянальнасьць сьведчыць аб жывучасьці, пругкасьці і здольнасьці яго да ўсебаковага разьвіцьця.

Гэтак выглядае сынтэза беларускай гісторыі паводле глыбокага яе дасьледчыка праф. М. Доўнар-Запольскага. Апрача ўспомненых вышэй засьцярогаў, да яе нічога ня можна дадаць. З прыемнасьцю трэба толькі адцеміць, што беларускія гісторыкі ў сваіх досьледах пайшлі па шляху паказанаму гэтым вялікім нашым вучоным, якога справядліва можна назваць бацькам беларускае гісторыі, як навукі.

Карыстаючыся з аказіі, падаём, што Мітрафан Доўнар-Запольскі да расейскае рэвалюцыі быў прафэсарам Кіеўскага Унівэрсытэту імя сьв. Уладзіміра, а калі ў Б. С. С. Р., у Менску, паўстаў Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, ён перанёсься сюды. Аднак, калі ў Б.С.С.Р. пачалася русыфікацыя, маскоўскія ўлады высялілі яго з Беларусі. У вапошніх гадох Масква загадала перачыркнуць дасюлешнія працы беларускіх гісторыкаў, як шкодныя. Гісторыю Беларусі маюць напісаць маскоўцы, або іхнія найміты, у якой мае быць даказана, што беларускі народ толькі тады пачаў „шчасьліва" разьвівацца, калі трапіў пад Расею. Гэтае „шчасьлівае" разьвіцьцё ён заўдзячвае апецы „старэйшага брата" — вялікага расейскага народу. Аб гэтых новых „асновах" да гісторыі Беларусі шырака піша між іншым „Літаратура і Мастацтва". Гэта новая „гісторыя" Беларусі павінна зьмясьціцца ў рамах агульна-расейскае гісторыі і мае быць доказам адзінасьці імкненьняў народаў С.С.С.Р., а так-жа палітычнае і культурнае перавагі „старэйшага брата"— расейскага народу. Аляксандра Неўскі, цар Іван III, Пётра I маюць быць і героямі Беларусі.

Гэтак мае быць „перароблена" наша гісторыя, каб быць у згодзе з камуністычна-расейскай палітычнай доктрынай. Трэба адзначыць, што нават царскі рэжым не адважваўся на падобны цынізм.

Я. ШУТОВІЧ

10 год літаратурнае творчасьці Міхася Машары

„Я ня жыву — гару, уздымам п'яны,
сную, ...пяю я песьні звонкія, часамі
горкія, Табе мой край, каханы.
(Із зборніка „На сонечны бераг").

1928 год. „З пакаленьня працоўна-сялянскага, Беларусаў прыгонны ўнук", Міхась Машара ў вастрозе, у віленскіх Лукішках. Папаў сюды „прыпадкам", у сувязі із справай „Грамады", ведамай беларускай масавай палітычнай, зьліквідаванай у 1927 годзе, арганізацыі. Варункі вастрожнага жыцьця, больш чым якія, выклікаюць у вязьняў глыбейшыя перажываньні, рэфлексыі над сабой і над акружаючым сьветам. І наш вязень, пазьней шырака ведамы, папулярны паэт, — натура ўражлівая, чулая і інтэлігентная, праз 30 месяцаў прабываньня ў вастрозе, пераважна адзіночкай, шмат перажыў, перадумаў, шляхам самаадукацыі інтэлектуальна разьвіўся, а галоўнае пазнаў сябе, як паэта — выкрыў у сабе літаратурныя здольнасьці.

О, ты вастрог!
У сьцянах тваіх панурых,
у час даўгой, даўгой начы,
вучыўся я змагацца з бурай
і крыльлі тут расьціў душы.

Тут рос мой дух... мацнела вера,
ў тваіх мурох пазнаў сябе,
і песьню першую нясьмела
тут прапяяла муза мне.

(З цыклю „Падарожжа" № 2 (5) „Калосься" 1936 г.).

Паэт пачаў пісаць і друкавацца. Апроч многіх дробных вершаў, напісаў у вастрозе і маленькую, высока-мастацкую лірычную паэмку „Валачобнае" (надрук. у „Нёмане", III, 1932 г.), якая ёсьць ня чым іншым, як гімнам роднай Беларусі, яе адраджэньню, — гімнам вясьне, сонцу, свабодзе, вольнай думцы, — а так-жа ня менш мастацкую паэмку, вытрыманую ў бадзёрых, радасных тонах — „Радаўніца" („Нёман" IV).

Першы зборнік вершаў „Малюнкі" выйшаў з друку ў 1928 годзе. Сёлета, такім чынам, мінае 10 гадоў літаратурнае творчасьці Міхася Машары. З гэтай нагоды прысьвячаем нашаму юбіляру гэты скромны артыкул.

Улюбленым жанрам літаратурнага творства Машары — вершаваная паэзія, пры гэтым лірыка. Ня чужая яму і мастацкая проза, а так-жа драматургічны жанр.

Машара — плодны, творчы талент. Міма пэрманэнтна трываючых, няспрыяючых матарыяльных і духовых варункаў жыцьця, напісаў за 10 год адносна многа твораў, дробныя вершы лічацца сотнямі. Асобныя выданьні, апрача ўспомненых „*Малюнкаў*" з 1928 г., вышлі дагэтуль такія: „*На сонечны бераг*" — зборнік вершаў, 1934 г.; „*Вось тут і разумей*", драматычны абразок, 1934 г.; „*Сьмерць Кастуся Каліноўскага*", гістарычная паэма, 1934 г.; „*Вясельле*", апёртая на народным абрадзе — вясельлі — паэмка, 1934 г.: зборнік вершаў „*На прадвесьні*", 1935 г.; „*Мамчына горка*", паэма, абаснаваная на фольклёры, 1936 г.; сцэнічны абразок з сялянскага жыцьця „*Чорт з падпечча*", 1936 г.; драма ў трох актах „*Лёгкі хлеб*", 1937 г; зборнік вершаў „*З пад стрэх саламяных*" (сканфіскаваны), 1937 г. Паводле разьмеру, фармат 8°, маленькія гэтыя выданьні. Колькінаццаць, колькідзесяць бачын. Толькі адно апошні зборнік вершаў — „З пад стрэх саламяных" налічае 100 з лішнім бачын. Многа вершаў паэта, надрукаваных у беларускіх часапісах, не ўваходзяць у вылічаныя зборнікі.

Вось і ўся дасюлешняя надрукаваная літаратурная прадукцыя нашага песьняра. Мала й многа: мала — з увагі на багацьце душы і творчыя магчымасьці таленту песьняра, многа — з увагі на жудасныя варункі ягонага жыцьця і працы, а так-жа з увагі на выкліканыя вонкавымі мамэнтамі варункі беларускай выдавецкай працы, дзеля якіх нікаторыя творы песьняра яшчэ і дагэтуль, або зусім ненадрукаваныя, або надрукаваныя ў розных часапісах ня вышлі асобнымі выданьнямі.

Ня будзем тут разглядаць усяго творства Машары. Разгледзім толькі паэзію.

Машара — паэт-гамадзянін. Як і ўсе амаль нашыя паэты і пісьменьнікі, ён далёкі ад пагляду „мастацтва для мастацтва", ягонае творства, выражаючы соцыёлёгічныя мамэнты, — пранітавана элемэнтамі беларускага нацыянальна-грамадзкага утылітарызму, ідэолёгіяй нацыянальнага адраджэньня і сацыяльнага вызваленьня.

Беларусь, яе адраджэньне, у Машары зьяўляецца прадметам сваеасаблівага, як-бы рэлігійнага культу, крыніцай творчага натхненьня, оптымізму, мэтай і радасьцяй жыцьця.

І гэта зразумела:

„Ты мне многа дала маць-зямліца:
агонь сэрца і жар пачуцьця...
У маім целе юнацкім я чую
увесь творчы разгул тваіх сіл,
ўсе імкненьні... тугу векавую
ад пачатку, — да цемры магіл".

(„З пад стрэх саламяных", бач. 23).

„Толькі Ты, мая Матка-Краіна,
радасьць песьціш у сэрцы адна;
ні зашто Тваю жудзь не спакіну,
буду піць з Табой чарку да дна".

(„На сонечны бераг", бач. 37).

Шчыры, глыбокі патрыётызм, любоў Бацькаўшчыны, беларускай вёскі, вера ў адраджэньне Беларусі і ў лепшую будучыню народу — асабліва ярка выражаны ў многіх вершах праграмна-дэкляратыўнага тыпу, у вершах на вясковыя тэмы, у непазбаўленых дэкляратыўнага характару прыродаапісальных вершах, а так-жа ў натхнёнай, успомненай ужо намі паэмцы „Валачобнае".

Паэт, безгранічна любячы і аддаючы ўсе свае сілы Беларусі за жыцьця, не перастае яе дзейна любіць і па сьмерці:

„З пад зары тужыць зарніцай
па табе, мой родны край,
буду з Богам я сварыцца
за цябе там часта — знай.

За грахі мае цяжкія
буду ў раю пастухом —
пасьціць зоры вагнявыя,
спаць пад воблачным кустом.

На зарніц дрыжачай грыве
ноччу неба аб'яжджаць
і на млечнай сонцаў ніве
табе песьні гадаваць.

Край сярмяжны, сэрцу мілы!
Жаль растацца мне з табой.
Я жадаўбы цябе сілай
зацягнуць у рай з сабой".

(„З пад стрэх саламяных", бач. 37).

Будучы паэтам-грамадзянінам, апяваючы адраджэньне Беларусі і заклікаючы народ ісьці наперад „пад знакам Пагоні сьвятым", Машара ня ёсьць чалавекам партыйным:

„Ня знаем мы: — нацдэмаў і хадэкаў,
ніякіх „філаў" ані „ізмаў"

(„Падарожжа" — „Калосьсе" № 2, 1936 г., бач. 79).

Ён не тасуе крытэрыяў партыйна-палітычных пры ацэне грамадзкай дзейнасьці Беларусаў — „ня знаем лепшых і благіх" (ібідэм, бач. 78), — паэт, які выражае агульна-нацыянальную ідэолёгію, любіць усіх дзяцей працоўнай Беларусі.

Характэрнай асаблівасьцяй беларускай літаратуры ад Багушэвіча да нашых дзён, нават і савецкай беларускай літаратуры да 1930 — 1931 г., ёсьць тое, што ў ёй элемэнт нацыянальны пераплятаецца з соцыяльным. Гэтае зьявішча мы бачым і ў Машары. Ідучы пад нацыянальным сьцягам Пагоні, будучы песьняром новай Беларусі, у якой закрасуе сонца і свая праўда, Машара адначасна зьяўляецца песьняром „працоўнае эры", песьняром працоўнай Беларусі і працоўнага чалавека агулам.

„Песьні!.. Солад ваш і мукі
пеняць радасьці і боль.
Я хачу пявучым гукам
залаціць мазоль".

(„На сонечны бераг", бач. 27).

Ужо сама соцыяльная прырода Машары, як сына вясковых шэрых хатаў, скланяе яго ісьці шляхам працоўных, „з працоўнымі братамі" („На прадвесьні", бач. 21) і залаціць мазоль.

Соцыяльныя мотывы выражаны песьняром пераважна ў форме агульных заклікаў-зваротаў да вёскі, да ўсіх „пакрыўджаных і лішніх", каб будавалі свой лепшы лёс, жыцьцё.

„Браты, браты Краіны сіняй,
у нашых песьнях многа сьлёз!
Давайце сум-тугу раскінем,
І створым новы лепшы лёс".

Выражаны яны такжа ў мастацкіх абразох, прадстаўляючых, галоўным чынам беларускую вёску, сялянскі быт, працу. Трэба шкадаваць, што ў Машары адносна мала такіх абразоў. Беларуская літаратура ўзбагацілася-б запраўды мастацкімі пэрламі

каб Машара побач з эгоцэнтрыкай лірычнай і патрыётычнымі „дэклярацыямі" даў больш такіх вершаў, як „Ручнічкі", „Бульбу даелі ўчора", „Гора ў вёсцы", „Хата", „Хата бабылькі", гдзе запраўды паэтыцкімі абразамі залоціцца „мазоль".

Характэрным для ідэолёгічнай стараны творчасьці Машары, для яе соцыяльных мамэнтаў, ёсьць тое, што паэту — хоць заяўляе нам, што із „старога сьвету" „руйнуе ўсё, ка зноў тварыць", („На Прадвесьні", бач. 19), і марыць аб тым часе, калі „зямля станецца садам бяз меж, парканаў і тынкоў і жыць пачнем мы іншым ладам, без беднаты і жабракоў", („Падарожжа" — „Калосьсе" № 2, 1936 г., бач. 80), калі „зьнікне зьдзек, прымус і краты" (ібідэм) і людзі „будуць бяз сьлёз і праклянцьця жыць у згодзе вялікай сям'ёй" („На Прадвесьні", бач. 8), — існуючы грамадзка-гаспадарскі лад, з яго сыстэмай індывідуальнай гаспадаркі, здаецца, дагаджае. Чырвонай ніткаю праз творчасьць Машары праходзіць любоў да старой, горам спавітай, вёскі, вёскі індывідуальнай працы і гаспадаркі. Паэт, здаецца, нават супроць хутарызацыі, якая, хоць не нарушае прынцыпу індывідуальнай уласнасьці, зьмяняе аднак твар вёскі, зьмяняе яе вонкавую структуру, і не дае селяніну палепшаньня долі („Гора ў вёсцы"—„З пад стрэх саламяных", бач. 39, і „Поле, межы"...— тамжа, бач. 47). Адно кепска ў соцыяльна-гаспадарчых адносінах, гэта тое, што „цяжка на нашай зямліцы жыць без зямлі батраку" („Бульбу даелі ўчора" — „З пад стрэх саламяных", бач. 40), што эксплёатуецца наемніцкая праца „вясковага пралетара" („З траплом у руцэ" — ібідэм, бач. 14), што гарue бядняк на панскім полі („За плугам" — ібідэм, бач. 79), і што яшчэ ў XX веку вясковаму мужыку, які корміць „сытых і тлустых" — „голад сушыць грудзі" („На сонечны бераг", бач. 77).

Істотнай прычынай сацыяльнай крыўды і соцыяльнай несправядлівасьці ёсьць тое, што людзі, грамадзянствы і народы забыліся аб „Вялікім Слове", што спачатку ў Бога было („Новаму Году" — „З пад стрэх саламяных", бач. 88), забыліся аб тэй праўдзе, „што на крыжу" („Падарожжа" — „Калосьсе", № 1, 1936 г., бач. 8) і аб прыказаньні добрага Бога — бачыць „у браце брата" (ібідэм, бач. 12).

Так нацыянальная доля Беларусі, за якую трэба змагацца, як і грамадзкі лад, адносіны паміж людзьмі, галоўным чынам узалежнены ад выпрабленьня этычнага людзей.

У нашага песьняра вельмі паважнае месца займае прырода. Прыродаапісальныя матывы, побач з грамадзкімі — нацыянальнымі і соцыяльнымі, твораць тэматычную домінанту ўсяе лірыкі Машары. Зразумелая рэч, Машара, будучы сынам вёскі, узгадаваны на ўлоньні прыроды, найбольш беспасрэдна адчувае яе красу, творчыя ў ёй працэсы і зьмены. Прырода, з рознымі ў ёй зьявамі, для паэта зьяўляецца крыніцай творчага захапленьня, родзіць у ім настроі радасьці, часамі суму, а так жа глыбейшыя рэфлексыі. Паэт амаль у арганічнай залежнасьці ад пры-

роды. Часта, і пераважна, даючы малюнкі прыроды паэт адначасна выражае ў іх ідэі беларускага грамадзкага ўтылітарызму, патрыётычныя настроі, прадстаўляе сялянскі быт, а так-жа выражае асабістыя перажываньні і розныя дачыненьні да жыцьця і сьвету. Вось чаму прырода ў Машары ня мае такога „чыстага" выражэньня, якое мы спатыкаем нпр. у Арсеньневай.

Каб скончыць з агаворкай тэматыкі творчасьці Машары, трэба зазначыць, што апроч успомненых ужо намі тэмаў, знаходзім у Машары крыху лірыкі каханьня, вершаў прысьвечаных месту, крыху рэфлексыяў над рознымі зьявамі жыцьця і быту, — пры чым усё гэта, зразумела, ня мае спэцыяльна беларускага аспэкту і набірае характару агульна-чалавечага.

Характэрнай і галоўнай асаблівасьцю творчасьці Машары, разглядаючы яе з псыхолёгічнае стараны, гэта тое, што пераважаюць у ёй тоны бадзёрасьці, радасьці, оптымізму. Гэтай асаблівасьцю Машара рэзка адрозьніваецца ад нашых паэтаў „нашаніўцаў" і іх эпігонаў, якіх творства агулам кажучы вытрымана ў тонах суму і жалю.

Гэтая асаблівасьць яшчэ тым цікавая, што прыватныя абставіны жыцьця паэта, а так-жа об'ектыўныя ўмовы жыцьця беларускага народу не ствараюць для яе адпаведнага грунту.

Галоўнымі крыніцамі оптымізму Машары ёсьць глыбокая вера ў сілы народу і ў адраджэнскую справу, а так-жа беларуская прырода.

Праўда, хоць рэдка, але спатыкаем у Машары зьявішчы, калі на ягоныя „вясёлыя песьні паклаў нехта сум", калі замест свае песьні „купаць у сонцы" „і пра сонца пяяць заўсягды" сум агартае сэрца і душу песьняра. Таксама, як крыніцамі оптымізму зьяўляюцца грамадзкія мамэнты і прырода, — галоўным чынам гэтыя самыя дзейнікі выклікаюць і сум у паэта.

З гледзішча фармальна-мастацкага, творы Машары прадстаўляюцца розна. Ёсьць творы вялікай мастацкай вартасьці, ёсьць так-жа і слабыя. Агульным недахопам зьяўляецца ў Машары даволі вялікая ўбогасьць стылю і мовы, а так-жа ў многіх выпадках няўважныя адносіны да апрацаваньня тэхнічнага твораў. Машара піша згодна з канонамі старой паэтыкі.

Дасюлешняя творчасьць нашага Юбіляра дзеля сваей ідэолёгічнай вартасьці, а так-жа дзеля многіх мастацкіх вартасьцяў, ёсьць значным укладам у сучасную беларускую літаратуру.

У адным з вершаў паэт кажа:

Мінець жыцьцё!.. Ня шкода, што ня ўбачу
Йзноў красачны расквіт вясны,
Адно жадаў-бы знаць, ці сьлед адзначу
Пражытых дзён тут на зямлі.

(„На сонечны бераг", бач. 68).

Сьлед свой у беларускай літаратуры ўжо паэт адзначыў і то вельмі позытыўна. Зычым Яму далейшага разьвіцьця таленту і ўзбагачэньня нашай літаратуры новымі творамі.

Я. СТАНКЕВІЧ

Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг. „Аль кітаб"

Фонэтычны й морфолёгічны разбор

ПЕРАДМОВА

Разгляданы далавàх рукапіс „Аль кітаб" напісаны пакрывіцку*) (пабеларуску) арабскімі літарамі і належыць да даволі багатай беларускай ці — ляпей кажучы — крывіцкай літаратуры арабскім пісьмом (рэлігійнай літаратуры крывіцкіх мусульман). Я апісаў яго ў „Slavii" XII, 3 — 4, там-жа надрукаваў веданьні аб крывіцкай літаратуры арабскім пісьмом наагул, надрукаваў так-жа прынцыпы транскрыпцы „Аль кітабу" з арабскага пісьма на лацінскае ды кароценька падаў гісторыю крывіцкіх мусульман.**) У тым-жа нумары „Slavii" надрукавана мною ў лацінскай транскрыпцы поэма „Мэрадж" з „Аль кітабу". Гэтта паўтараць напісанага ў „Slavii" ня буду, бо ў „Калосьсю" ня будзе друкавацца тэкст „Аль кітабу", але толькі разбор мовы ягонае. Адно мушу каротка паведаміць аб прынцыпах транскрыпцы „Аль кітабу", бо бяз гэтага былі-б незразумелыя прыводжаныя ў працы прыклады.

Гэтай працы маёй станаўко ня шчасьціць. Напісана яна была ў 1925 г. ў Празе. У 1927 г. да мяне зьвярнуўся Інстытут Беларускае Культуры ў Менску з пропозыцай выдаць тэкст „Аль кітабу" і маю языкаведную працу аб ім. Але тымчасам адносіны да Крывічан (Беларусаў) у З.Р.С.Р. пагоршалі. Каб друкаваць у Б.Р.С.Р. навуковую працу беларускую, трэ было быць

*) Назоў „Крывіч, крывіцкі" і пад. ўжываецца ў гэтай працы, як і ў іншых, у значэньню не пляменным, але агульна-нацыянальным, значыцца замест няправільнага назову „Беларус, беларускі" і г. д. Назоў „Крывіч, Крывія" і г. д. адзіне правільны ў вадносінах да нашага народу. Ён ужываўся як агульна-нацыянальны ад XII да пал. XIV стаг., калі быў выцісьнены новым назовам „Літва, Ліцьвін" і г. д. Назоў „Крывіч" і г. д. просьле сьветнай (сусьветнай) вайны памалу аднаўляецца і асабліва быў пашырыўшыся ў 1923 — 1928 г.г. у межах радзянае Беларусі. У 1928 г. ён быў забаронены Масквою.

**) Шырэй аб гісторыі крывіцкіх мусульман і аб іх літаратуры падана мною ў „Гадавіку Беларускага Навуковага Т-ва", Вільня, 1933 г.

у ласцы маскоўскае комуністычнае партыі. Дайшло да таго, што за надрукаваньне ў „Працы клясы філёлёгіі“ т. II. Беларускае Акадэміі Навук майго артыкулу былі звольнены із свайго становішча віцэ-старшыня й сакратар Акадэміі. Ведама, што пры таковых адносінах не магло быць мовы аб друкаваньню мае працы. У 1930 г. на пропозыцу проф. Станіслава Шобэра я паслаў тэкст „Аль кітабу“ ў рэдакцу „Prac filologicznych“, дзе ён меў друкавацца разам із маёю працаю. Калі аднак із прычыны агульнага крышу (крызысу) наступны том „Prac filologicznych“ доўга ня выходзіў, а Языкаведная Сэкца Навукова-Дасьледавальнага Інстытуту Усходняе Эўропы (Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodniej) у Вільні пастанавіла надрукаваць маю працу аб мове „Аль кітабу“ разам із транскрыбаваным тэкстам ягоным, я тэкст „Аль кітабу“ ўзяў назад ад проф. Шобэра. Аказалася аднак, што я пасьпяшыўся, бо нягледзячы на пастанову такое высакакомпэтэнтнае ўстановы, як Языкаведная Сэкца менаванага Інстытуту, у каторую ўходзілі найвыдатнейшыя прадстаўнікі польскае языкаведы, як профэсары — Ян Атрэнбскі, Ян Развадоўскі, Казімер Ніч, Эрвін Кошмідэр,—галоўны рэдактар выдавецтваў Інстытуту, проф. Сьцяпан Эрэнкройц, ня гледзячы на абяцаньні, не знайшоў дагэтуль грошаў на выданьне мае працы. Дзеля таго ў 1937 г. мела друкаваць маю працу аб мове „Аль кітабу“ бібліётэка Ўрублеўскіх у Вільні. Але, заняты працаю на чорны кавалак хлеба, я ня меў часу перакласьці яе на польскую мову.

Пачынаючы цяпер друк свае працы ў „Калосьсю“, я не магу ня ўспомнець словамі шчырае падзякі свайго Дарагога Вучыцеля, спад. проф. Ольдрыха Гуера за ўсю тую веду, каторую я здабыў у яго, спад. Антона Луцкевіча дырэктара Крывіцкага музэю ім. Івана Луцкевіча ў Вільні, за прысланьне ў свайм часе „Аль кітабу“ ў Прагу і спад. Марыю Тауэр'анку за транскрыпцу яго.

Аўтар

Ад Рэдакцыі: друкуючы артыкул гр. д-ра Я. Станкевіча, рэдакцыя, згодна з воляй аўтара, пакідае ўсе асаблівасьць мовы артыкулу, хоць з нікаторымі з іх не згаджаецца.

Прытарнаваньне арабскае абэцэды да крывіцкага языка і прынцыпы транскрыпцы

Крывіцкія пісьменьнікі, пішучы арабскім пісьмом, мусілі арабскую абэцэду прытарнаваці да крывіцкага языка.

У варабскай абэцэдзе ёсьць па тры літары дзеля абазначэньня гукаў *з*, *с* і *к*. Гэта давала магчымасьць абазначаць розныя крывіцкія сугукі сычачыя ды цьвярдое й мяккое *к*. Арабская літара, абазначаючая *д* заднепаднябеннае, ужываецца дзеля абазначэньня крывіцкага *з* цьвярдога; транскрыбавана яна праз ***z***, прыкладам ***zaraz***. Дзьве другія араб. літары для *з* абазначаюць крывіцкае *з* мяккое; транскрыбаваны яны адна праз ***ź***, другая праз ***z'***, пр. ***źmeniŭśe, z'emla***. Араб. літара, абазначаючая войстрае заднепаднябеннае *с*, ужываецца дзеля абазначэньня крывіцкага *с* цьвярдога; транскрыбавана праз *s*, пр. *sad*. Дзьве іншыя арабскія літары дзеля *с* абазначаюць беларускае *с* мяккое, яны транскрыбаваны праз *ś* і *s'*, пр. *śeḫośvetnij, s'oj*.

З трох літараў дзеля *к* у крывіцкім тэксьце ўжываюцца тольні дзьве: заднепаднябенная дзеля цьвярдога *k* і пярэднепаднябенная дзеля ***k*** мяккога; транскрыбаваны яны: першая праз *к*, другая праз *к* із значком мякчыні. Прыклады: ***kazac, k'idac***. Зь дзьвюх літараў дзеля гуку *т* у крывіцкім языцэ ўжываецца толькі адна, абазначаючая арабскае заднепаднябеннае *т*; транскрыбавана праз *t*., пр. *tabe*.

Дзеля ўсіх іншых сугукаў у варабскай абэцэдзе ё толькі па аднэй літары. Па аднэй яны асталіся і ў языцэ крывіцкім, хоць тут апрача *р, д, т, дж, ж, ч, ш,* што заўсёды цьвярдыя, усе іншыя сугукі, залежна ад месца ў слове, бываюць цьвярдыя або мяккія. Значыцца, апрача *зь, сь, к'* мякчыня ўсіх іншых крывіцкіх сугукаў у „Аль кітабе“ не абазначана. Трэба, значыцца, дагадацца, дзе прачытаць мякка, а дзе цьвёрда, што зусім ня трудна. Зусім накшая вымова крывіцкіх сугукаў *дз, ц* прынучыла прыдумаць дзеля іх у варабскай абэцэдзе апрычоныя значкі, каторыя, як бальшыня іншых літараў, ужываюцца, як дзеля *дз, ц* цьвярдых ((ludzkoha, pričinca), так дзеля мяккіх (chadzic). Літары, каторых мяккая вымова не абазначаецца ў рукапісе, так-жа транскрыбаваны без абазначэньня іх мякчыні. Толькі арабскае *лям*, абазначаючае *л* і *ль*, транскрыбавана залежна ад вымовы праз *ł* ці *l* (hołas, kali). Арабскае *ваў* перададзена часткава літараю v (перад самагукамі, пр. vada), а часткава літараю ŭ (між самагукам і сугукам ды на канцы слова, прыкл. voŭk, biŭ).

Крывіцкі гук *е* абазначаецца ў „Аль кітабе“ пры помачы значка для арабскага *а* кароткага.

Крывіцкае *а* абазначана ў рукапісе пры помачы арабскага значка дзеля *а* даўгога, або часткава — згодна з арабскай абэцэдаю—на пачатку слова пры помачы айн (транскрыбуецца знач-

ком ‘) і арабскага значка дзеля *a* кароткага. У варабскім пісьме па *k*, *ch*, *t* значок дзеля кароткага *a* вымаўляецца як *a* (а не як *e*); дзеля таго і ў беларускім тэксьце часта дзеля абазначэньня *a* па k, ch, t ня ставіцца значок даўжыні. Транскрыбавана: араб. кароткае *a* пераз *e* (śedzec), араб. даўгое *a* пераз *a* (sad, śadz). Хоць арабскае кароткае *a* па k, ch, t і з ‘ (айн) вымаўлялася як *a*, то аднак транскрыбаваны яны пераз *e* (у другім прыпадку з ‘), бо нярэдка ў крывіцкім тэксьце па k, ch, t і з айн пішацца так-жа *a* даўгое. Прыклады: ‘ebačimśe, ketorij, matke (=абачымся, каторы, матка).

У бальшыні прыпадкаў крывіцкае *o* абазначаецца пры помачы значка дзеля арабскага *y* даўгога, а *y* пры помачы значка дзеля арабскага *y* кароткага, але нярэдка бывае наадварот: араб. *y* даўгое ўжываецца дзеля крывіцкага *y*, а *y* кароткае дзеля крывіцкага *o**). Транскрыбавана: араб. *y* кароткае пераз u (u ‘ahnu=у агню, ‘ułava=олава), араб. *y* даўгое, калі абазначае крывіцкае *o* — пераз *o* (hołas), а калі абазначае крывіцкае *y* — пераз ū (z dimū=з дыму).

Крывіцкія *i*, *y* абазначаюцца аднолькава, пры тым блізу заўсёды значком дзеля арабскага *i* кароткага, адно напару значком дзеля араб. *i* даўгога. Транскрыбаваны: першая літараю *i*, другая літараю ī. Ведама, што ў транскрыпцы перад *e* і *i* могуць стаяць, як мяккія, так і цьвярдыя сугукі, начай кажучы *e*, *i* не абазначаюць мякчыні папярэдніх сугукаў.

Дзеля таго што пры транскрыпцы перапісавалі літара ў літару, дык перапісалі так-жа айн (‘) перад *y* (na‘uka), хоць у такім палажэньню айн нічога не абазначае.

Знакоў прыпынку ў рукапісе нямашака, у транскрыпцы паставіў іх я. Вялікія літары таксама я паставіў.

Бачыны й радкі транскрыпцы адпавядаюць бачынам і радком „Аль кітабу“. Панумаравана подле захаванае часьці рукапісу, каторы нумарацы ня мае.

Дзе быў напісаны „Аль кітаб“?

Уперад, чымся прыступіць да граматычнага разбору мовы „Аль кітабу“, важна даведацца на прасторы якога крывіцкага (беларускага) дыялекту ён быў напісаны. „Аль кітаб“ мусіў быць напісаны там, дзе жылі крывіцкія мусульмане, а гэтыя ў XV—XVII стаг. жылі сярод крывіцкага насяленьня хрысьцянскага там, дзе й цяперака, значыцца ў цяперашніх паветах: Віленска-Троцкім, Ашмянскім, крышку ў Валожынскім, далей у Наваградзкім, Слонімскім і Горадзенскім. Як бачым, менаваны прастор вялізны, на

*) У пазьнейшых рукапісах крывіцкіх арабіцаю араб. у даўгое ўжываецца толькі дзеля крывіцкага **о**, а кароткае дзеля крыв. **у**. Хістаньне ў ужываньню ў нашым рукапісе араб. значкоў дзеля араб. кароткага й даўгога **у** паказуе на ня поўнае яшчэ скрысталізаваньне крывіцкага правапісу арабіцаю ў справе абазначэньня крывіцкага **у** і **о** і сьведчыць аб даволі раньнім напісаньню „Аль кітабу“.

ім ё колькі крывіцкіх дыялектаў. З другога боку чыста народная мова „Аль кітабу“ дае магчымасьць азначыць месца яго паўстаньня подле адных асаблівасьцеў языковых. Дык да мовы й зьвернемся.

Каб азначыць месца напісаньня „Аль кітабу“, даволі зьвярнуць увагу на гэткія асаблівасьці мовы ягонае:

1) Ненацісьненае *o* заўсёды пераходзіць у *a* з выняткам канцавога *o* ў канчатку gen. sg. (родн. скл. адз. л.) прыметаў і прыметных займёнаў із націскам на карані. Прыклады: kažnahu 8a2, naŭčonahu 13a15, adzinahu 14b6 (= кажнаго і пад.), sūdnaho 4a. А калі націск на канчатку, дык на канцы ё - *a*: śvetoha, dna 26a3, złoha 65b2, jakoha 63b13. Аднолькава gen. sg. займёнаў *ніхто, нішто*: nikoha 48b11, 52a5, ničoha 54a2 і інш.

2) *a*-, *ja*- асновы і мускія *o*-, *jo*- асновы маюць у nom.—ac. pl. (наз.— він. мн. л.) толькі канчатак *-i*, *-ы*: vałasi 110b5, 131a1, kupci 60b3, hałavi 72b1, starani 75b8.

3) 1 praes. pl. (1 ас. мн. л. цяп. ч.) дзеясловаў тэм. мае канчатак — *м* (‘adpośnikajemśe 94b6, vidzim 95b11, ’ebačimśe 96b12.

4) Дзеясловы із захаваным самагукам асновы маюць перад канчаткам *-це* ў 2 pl. imp. (2 ас. мн. л. загаднага ладу) самагук *-i* (*-ы*): śceražiceśe 20a3, razijdziceśe 28b6, hledzice 84b15 і інш.

У аканьню мова „Аль кітабу“ згаджаецца з крывіцкім дыялектам паўднёва заходнім (тачней: з паўночна-ўсходняй часьцю дыялекту паўднёва-заходняга) і зь віленска-ашмянскімі гутаркамі. Іншымі трыма менаванымі асаблівасьцьмі згаджаецца з крывіцкім дыялектам цэнтральным і ўзноў із віленска-ашмянскімі гутаркамі. Усімі менаванымі асаблівасьцьмі мова „Аль кітабу“ згаджаецца зь віленска-ашмянскімі гутаркамі. Іншыя асаблівасьці мовы „Аль кітабу“ не пярэчаць напісаньню яго ў мове віленска-ашмянскіх гутаркаў. Значыцца „Аль кітаб“ паўстаў на прасторы віленска-ашмянскіх гутаркаў крывіцкага языка.*)

*) Віленска-ашмянскія гутаркі (названы гэтак подле большых местаў іхняга прастору — Вільні й Ашмяны) апісаны мною ў варт. „Narzecza języka białoruskiego” („Sprawy narodowościowe“ № 5, Варшава 1928 г.,) і ў варт. „Stan badań nad klasyfikacją dialektów języka białoruskiego“ (Balticoslavica“ II, Вільня 1936 г.). Граніцы віленска-ашмянскіх гутаркаў гэткія: Калі ад вусьця р. Іслачы ў Бярэзіну (Нёмнаўскую) правядзём на заход ля мест. Вішнева (Валожынскага, ля станцы Багданава) лінію да языковае граніцы зь Ліцьвінамі ля мест. Варанова, дык азначым граніцу паўднявую нашых гутаркаў. На поўн. й зах. граніца віленска-ашмянскіх гутаркаў зыходзіцца зь языковаю граніцаю крывіцка-літоўскаю. На ўсходзе граніца праходзіць ад р. Бярэзіны на поўнач да літоўскае граніцы блізка Гадуцішак так, што ў цэнтральным беларускім дыялекце астаюцца Валожына, Забярэзьзе, Гародзькі, Пруды, Залесьсе, Смаргоні, Данюшава, Жойдзішкі, Вішнева (Вялейскае, ля Сьвіра), хіба Сьвір, далей Мядзел, Пастаўе, а да віленска-ашмянскіх гутаркаў адыходзяць: Вішнева (Валож. пав.), Крэва, Гальшаны, Солы. Значыцца прастор, займаны віленска-ашмянскімі гутаркамі, складаецца з гэткіх цяперашніх паветаў: Віленска-Троцкага, Ашмянскага, бяз воласьці Смаргонскай ды невялічкіх часьцеў паветаў Валожынскага, Лідзкага й Сьвянцянскага. Пры гэтым трэба зацеміць, што точныя граніцы гэтых гутаркаў у пав. Валожынскім, Лідзкім і асабліва Сьвянцянскім дагэтуль не ўстаноўлены.

Фонэтыка

Самагукі

Аканьне

Найвялікшай асаблівасьцяй крывіцкіх самагукаў ёсьць аканьне, г. зн. пераход ненацісьненых *о, е,* а напару і іншых самагукаў у *а* (*я*). Наш рукапіс мае мноства прыкладаў аканьня. Разгледжу асобна прыклады на пераход *о* ў *а* і асобна на пераход *е* ў *а* (*я*).

Пераход ненацісьненага о ў а. Прывяду некаторыя прыклады на пераход ненац. *о* ў *а*. Дзеля таго што, як *о* спачатнае, пераходзіць у *а* так-жа ненацісьненае *о* з даўнейшага *ъ*, прыклады на іх будуць прыведзены разам. *А* на месцу этымолёгічнага *о* ненацісьненага ў 1-м складзе перад націскам: Prarok 13a17*), daždžu ibid., ʻadzinamu 42b9, pačaŭ 41a2, pa dześec 17a9, pa razu 17a8.

У другім складзе перад націскам: ʻAd stvaricela 38b16, dakranūūšiśe 32b16, panižaŭ 12a13, ʻadpūsklivij 3b14, pa čirvonam załatom 17a16, ʻaddaliūši 2b14, vałasi 133a1, ʻaśminaccać 38b17, neʻabrakajučiśe 40a9, daždžavoha 47b16.

У трэйцім і дальшых складох перад націскам: ʻabdaravaŭ 19b7, pad hałavuj 19b7 (= пад галавой), da ʻadpūśčene 23a11, ʻaśmidześat 47b8, da saraku 57a6, bahatiri 130a5, ʼad ʻaśmidześat četiroch hod 14a10, ʻad perehavuru (=voru) 41b1.

У складох па націску. У першым складзе па націску: sustavaŭ 1a16, pomači 4b1, ʻudzačnaści 9a9, małaku (=-o) bełaje i smačnaje rajśkaje 22b10-11, čełevekaŭ 31b1, nad cełam, pravaj 55b15.

Так сама *а* на месцу ненацісьненага канцавога *о* маюць у nom. - ac. sg. (наз. - він. адз. л.) усе йімёны ніякага роду — назоўныя, прыметныя, парціціпіяльныя, займёны ніякага роду ды прыслоўі, паўсталыя скасьцяненьням nom. - ac. sg. сярэдніх прыметаў: chełopstva i paddanstva činiš 4a12, tvaju (=-o) słova 61b3, svaju (=-o) cela 60a11, ʻadzinostva 4b2, mnoha 14a12, ʻuśo cela naha, hrešna 129b3, choc bliska, ʻa hliboke (=-ka) 73b1, bahamołstva činiŭ 14b2.

Аднолькава ў другім складзе па націску: moŭčikam 9b10, nevulnikaŭ (=-vo-) 12a5, kłopataŭ 52a2, pitalnikaŭ 79b2, patničnaj 33a9, nevernikaŭ 13a6, dzeravam 44b2, 73b3, hułasam (= ho-) 19a2, 42b10, słova stvaricelśkaje 57b2, pošepkam 81b14, na toje dzerava 75a8, skažu, što śe dzejała 108a3.

Згодна з асаблівасьцьмі арабскага пісьма па *k, ch, t* арабскі значок дзеля *а* кароткага абазначае крывіцкае *а* (а ня *е*, як па іншых сугуках). Значыцца ў прыкладах — chełop 4a3, kerona 40a12, pachevali 18b13, kolke (adv.) 43a1, tevari 60b3, da kelen 58b3, cherošich 96a3 і ў мностве іншых падобных — *е* па *k, ch, t* трэба чытаць як *а*. Транскрыбаваны падобныя прыклады пераз *е*, а ня *а*, бо пісар „Аль кітабу“ ў тых самых словах піша такжа па *k, ch, t,* хоць у меншыні прыпадкаў, *а* (значыць ставіць арабскае *а* даўгое), прыкл.: chałop 79b10, charošija 90a1, chavanem 51a4, karona 26a17, kaleni 84a1, kolka (adv.) 40b15, 42a1, tavariši 61b7, katorije 130a5, łokac 73b9.

Так-жа згодна з асаблівасьцьмі арабскага пісьма, араб. *а* кароткае з айн абазначае крывіцкае *а*. Аднак такое *а* з айн транскрыбавана пераз *е* із значком ʻ, бо ў тых самых словах аўтар нярэдка перадае крывіцкае *а* (як із ьз ненацісьненага *о*, так і спачатнае) пры помачы араб. *а* даўгога з айн. Калі-б у вабодвых прыпадках транскрыбаваць аднолькава пераз *а*, дык быў-бы зацерты ў даным прыпадку правапісны стан рукапісу. Дык таковыя прыклады ў транскрыпцы, як ʻedna, ʻebaraniŭ, трэба чытаць таксама, як ʻadna, ʻabaraniŭ, значыцца з *а* на пачатку слова.

а *ў прыймёнах-прыстаўках.* Гэтта будзе на месцу зацеміць, які самагук зьяўляецца ў рукапісе на месцу вакалізаванага *ъ* ў прыймёнах-прыстаўках. Найбалей прыкладаў ё ў прыймені *з*, паўсталым зьліцьцём съ і jьz. Гэтае прыймя ў справе *ъ* прыняло функцу спачатнага прыймені съ. Прыклады з *а* на месцу даўнейшага *ъ* ў прыймені *з*: s'ohodne i z*a* mnoj pan hutariŭ 5a4, zapsūje 43a17, 43b8, 84b9, 74a3, 84a10, zapsūješ 49a3, 59a2, nechaj i za mnoj vidzicca 59a8, nezapsūje 74a4, 84b2, 84b11, štob za mnoj muviła (= -mo-) 96a13. Але блізу гэтулькі ё прыкладаў із *е* ў гэтым прыймені, прыкл.: zetne 1b7, zebraciśe 20a1, ze snū parvaŭśe 84b17, zebranije 88b14, iz' neba zešle 96b17, pleči s krištału, kapita ze srebra 110b4, ze mnoj vidzeŭśe 132a4. У прыпадках, дзе аўтар піша *зэ*, на яго відавочна ўплываў польскі правапіс.

Аўтар, значыцца, нярэдка пізаў *зэ* замест *за* із *зо*, хоць вымаўляў *за*, аб чым сьведчаць прыклады із *за*. Адгэтуль лёгка было абмыліцца й напісаць *е* на месцу спачатнага *а* ў прыймені *за*, на што ё таксама прыклады: ze kažnij dzen postu 24b3, zebaŭlaliśe 24b12, 34a2, побач zabaŭlaliśe ibid., zenechaŭ 40b8, zevuć 40a16 побач zavuc ibid.

Гэтак аканьне зьдзейла ў дадзеным прыпадку зьліцьцё прыймені *з* (*зо*) з прыйменям *за*.

Аднолькава ё із самагукам у прыймёнах *перад, пад, ад*: pereda mnoj 76b7, 81a17, Pada ūśe pakoji 124b4, ʻadarvecca 126a3.

Апрычоныя прыпадкі. Мускія й сярэднія прыметы, дзеяпрыметы, лічбы парадкавыя і займёны, калі маюць націск на карані, канчаюцца ў gen. sg. (родн. адз. л.) на — *аго*. Прыклады: chmelnahu 1b1, velikahu 2a15, łaskavahu 5a10, padobnahu 7a3, kažnahu 8a2, 13a8, 13a15 і г. д., naŭčonahu 13a15 (= хмельнаго і г. д.), naŭčonaho 13a17 і інш., miłościvaho 24b1, pateho 16b17; прыкладаў мноства.

*) Першая лічба ля кажнага прыкладу паказуе бачыну рукапісу, другая — радок.

Тыя самыя хормы, калі маюць націск на канчатку, канчаюцца ў gen. sg. на — *ога*: złoha 8a8, 76b12, 65b2, małoha 17b5, takoha 16b15, staroha 13a7, śvetoha 26a3, 75b12, 89a1, 'ad złoha 42a16, daždžavoha 47b16, živuha 48a3, čūžoha 58b1, jakoha 63b13, drūhoha 106a4, 108b9, 122b1, 123b4, darahoha 123a7, 132a5 і інш. Аднолькава gen. sg. займёнаў *ніхто, нішто* (з nikъto, ničьto): nikoha 48b11, 52a5, 78a9, 89a14, ni 'ad koha 52a8, ničoha 54a2, 74a7, 84a11, 87a16, 94b11, 96a10, 104b15, 120a6, 'astatnahu śvetoha dna 26a3, śem rečej złoha, sabe škadlivahu (= -ho) maje mec 65b2, ničoha śveckahu 74a7 (= -ho). Прыкладаў мноства. У трох апошніх прыкладах побач із канчаткам —*аго* прыметаў із націскам на карані маем канчатак — *ога* ў прыметаў і займёнаў із націскам на канчатку.

Колькі адхінаў: levoho 131a8, 126a7, pravohu ibid зам. levaho і пад., а так-жа živuho 98b14, ničoho 71a10, зам. živoha і пад. Нельга відзець у гэтых прыкладах адбіцьцё вымовы аўтаравае. Гэткаму адбіцьцю пярэчыць мноства прыкладаў накшых, вышпрыведзеных, каторыя зьяўляюцца нормальнымі ў рукапісе, як і ў цяперашніх віленска-ашмянскіх гутарках. Менаваныя водхіны мусілі паўстаць у ваўтара ґрафічна з прычыны ймкненьня ягонага да некаторае „правільнасьці", што ўзноў зьявілася пад уплывам тых-жа хормаў із іншым націскам. У вапошнім прыкладзе можна бачыць недагляд пад уплывам папярэдняга *о*.

Ё два прыклады з *-а* на канцы ў gen. sg. прыметаў із націскам на карані: posła božeha 52b16, pereścerehajučeha 82b10. Можна было-б падумаць, што ў гэтых прыкладах адбілася вымова суседняга крывіцкага дыялекту цэнтральнага, дзе гэтыя хормы цяпер заўсёды ўжываюцца. Але аўтар ня мог гукаць двума рознымі дыялектамі. Дык і гэтыя хормы адно ґрафічныя, паўсталыя пад уплывам хормаў з *-а* на канцы ў gen. sg. прыметаў із націскам на канчатку, як *малога* і пад.

Канцавое *-о* gen. sg. прыметаў і пад. із націскам на карэнным самагуку паўстала з ранейшага *а* аналёгіяй gen. sg. займёнаў *яго, таго, майго* і г. д. Што гэткая аналёгія магла дзеіць, бачым із таго, што ў дыялекце цэнтральным уплыў аналёгіі пайшоў у кірунку адваротным: пад уплывам канцавога *а* gen. sg. прыметаў там паўстала *а* пад націскам на канцы gen. sg. займёнаў (*кага, чага, яга, майга* і г. д.). Але чаму аналёгія ня дзеіла на канцавое *-а* ў gen. sg. прыметаў із націскам на канчатку, значыцца такіх, як *маладога* і інш? Прычына гэтае розьніцы можа быць адно ў тым, што відавочна *а* зь ненац. *о* ў складзе беспасярэднім па націску было мацнейшае за *а* ў другім складзе па націску.

Іншы запраўдны (а не адно ґрафічны) адхін ад аканьня знаходзім у словах: poŭhoda 106b7, 106b8, poŭšasta 49b13, poŭdna 106b14, poŭstane 96b15, 34b8. Гэтта *о* зьявілася—пад уплывам наступнога вусьнянага гуку *ў*,—з *а*, паўсталага зь ненац. *о* таксама, як у некаторых гутарках этымолёгічнае, на'т націсьнае *а* пад уплывам *ў* перайшло ў *о*, прыкл. *доў, зоўтра* зам. *даў, заўтра*.

Слова „чалавек" аўтар блізу заўсёды піша з *е* па *л* (čełeveke 13a17 і інш.) і адно вельмі рэдка з *а* (čełavečej 18a2, čełavek 11a1, 28b2, čełavekam 44b8). Ведама, вымова была толькі з *а* па *л*.

Разгледжу прыклады зь ненацісьненым *о* ў рукапісе. Наўперад тут маем полёнізмы, прыкл.: spełno 109a1, oto 110a2, stvoril 118a6 (*ł* паказуе на полёнізм), velkości 88a13 і некаторыя іншыя.

У суфіксах і ў склонных канчатках на месцу ненацісьненага этымолёгічнага *о* або *ъ* звычайна ё *а*, але нярэдка сустракаецца і *е* (араб. *а* кароткае), прыкл.: padarek 35b8, sorek 30b4, pred Panem Bohem 39a10, mus'ulmaninem (dat. pl.) 31a17, iz dubrej (= do-) vuli (= voli) 52b13, pravej rukoj інш. Гэтыя і да іх падобныя прыклады паўсталі ґрафічна пад уплывам пісаньня *е* папольску ў падобных прыпадках.

Зь іншых словаў і хормаў, каторыя ў „Аль кітабе" сустракаюцца зь ненацісьненым *о*, вялізная бальшыня ё такіх, каторых этымолёгічнае *о* так ці накш зварочавала на сябе ўвагу аўтара. Гэтак, прыкладам, слова „міласьць" і твароныя ад яго найчасьцей пішуцца з *о* (miłośc 82a12, 82b9 і інш.), бо аўтар у сучасным літаратурным языццэ беларускім (крывіцкім) часта бачыў дый й сам, пішучы альфабэтам крывіцкім, мусіў пісаць яго з *о*. Калі якое слова часта сустракаецца ў хорме з націсьненым *о*, ё балей даных, што аўтар напіша яго з *о* і ў палажэньню бяз націску.

На першых дзесяцёх (1а — 5b) бачынах рукапісу я палічыў усе прыклады, дзе ненацісьненае *о* перайшло ў *а*, і прыклады, дзе такога пераходу ня было. Аказалася, што на менаваных бачынах ё 280 прыкладаў на пераход ненацісьненага *о* ў *а* і 12 прыкладаў такіх, дзе ненац. *о* асталося не перайшоўшы ў *а*. Ад гэтых 12-ёх прыкладаў трэба адняць 2 відавочныя полёнізмы — гэта miłośerdnij (пакрывіцку было-б miłosernij — з *с* цьвярдым і бяз *д*) і povelbena (= повельбеня). Гэткія балей меней адносіны будуць і ў цэлым рукапісе. Да менаваных 12-ёх прыкладаў непераходу ненац. *о* ў *а* я не залічыў канцавога *о* gen. sg. прыметаў і пад. з націскам на карані (novaho), бо ў гэтай хорме, як паказана вышэй, мы маем пазьнейшы пераход *а* зь ненац. *о* ў *о* з прычыны *аналёгіі* (падобнасьці).

З усяго вышсказанага, як і прыведзеных прыкладаў, ясна відаць, што ў мове „Аль кітабу", а тым самым у віленска-ашмянскіх гутарках XVI стаг., з выняткам дзьвюх катэгорыяў — канцавога *о* ў gen. sg. прыметаў і інш. з націскам на карані і *о* перад *ў* — усякае іншае ненацісьненае *о* пераходзіла ў *а*.

Невялічкую колькасьць прыкладаў у рукапісе зь ненацісьненым *о* лёгка выясьніць наступным спосабам. Аўтар праўда ненац. этым. *о* перадаваў наагул фонэтычна (подле вымовы), значыцца пераз *а*. Але ці з гэтага маем судзіць, што ў ваўтара было сьвядомае ймкненьне да фонэтычнага правапісу? Ані ён, ані ягоныя папярэднікі рэформатарамі правапісу ня былі, бо,

калі-б так было, дык іхняя рэформа мусіла-б адбіцца на крывіцкім правапісе кірыліцаю, чаго аднак ня сталася. Ён пісаў у даным прыпадку фонэтычна, бо накш пісаць не патрапіў, ня будучы навытырыўшыся ў правапісе этымолёгічным, як пісьменьнікі крывіцкім (кірыліцаю) альфабэтам.

Апіраючыся адно на вышразгледжаным матар'яле, ня можна сказаць, каб аўтар, прыступаючы да свайго твору, імкнуўся пісаць этымолёгічна. Але на'т у такім прыпадку гэткае ймкненьне да этымолёгічнае „правільнасьці" мусіла зьявіцца ў часе самога пісаньня, калі аўтар абярняся сустракаўся, што тое самае слова ці хорма пад націскам мае *о*, а не пад націскам *а*. Вось у сувязі з гэтым і паўстала-б у „Аль кітабе" гэная невялічкая колькасьць прыкладаў з этым. ненац. *о*. Прыймаючы аднак пад увагу тагачасныя культурныя варункі ў Крывіі (Беларусі), трэба прызнаць, што некаторае ймкненьне да этымолёгічнасьці правапісу мусіла быць у ваўтара ўжо адразу. Як чалавек інтэлігентны, ён, калі й ня пісаў, дык мусіў чытаць тагачасную крывіцкую літаратуру кірыліцаю, пісаную й друкаваную правапісам этымолёгічным. Правапіс агульна-крывіцкае літаратуры ня мог ня ўплываць на аўтара, тым балей, што гэны правапіс меў аўторытэт урадовасьці, гаспадарсьцьвенасьці.

М. І. Забэйда-Суміцкі ў Вільні

Выдатным здарэньнем у музычным жыцьці Вільні зьявіўся 10.XII 1938 г. канцэрт нашага тэнара-сьпевака Міхала Іванавіча Забэйды-Суміцкага і выступіўшага разам зь ім беларускага хору Рыгора Раманавіча Шырмы. Як бачым, канцэрт, ужо па адным гэтым, можна было-б назваць наагул *беларускім*. На гэта складалася яшчэ і тое, што праграма канцэрту ў пераважаючай частцы зьмяшчала творы беларускай музычнай душы. Аднак, выдатнае ўчасьце ў праграме канцэрту ўкраінскіх кампазытараў, Кошыца і Гайворонськага, робіць зьмест і значэньне канцэрту яшчэ глыбейшым і шырэйшым, дый ня толькі ў галіне яго чыста музычнай цэннасьці, але і ў сэнсе культурнага братаньня двух суседніх, найбольш адзін да аднаго блізкіх і падобных народаў — беларускага і ўкраінскага. Можна пайсьці яшчэ далей. У праграме былі творы літоўскага і польскага музычнага генія, былі, праўда найслабей, прадстаўлены і расейскія кампазытары. Дык канцэрт меў характар абраза таго мірнага і згоднага сужыцьця ў высшым, сьветлым і радасным сьвеце мастацкай культуры ўсіх пералічаных народаў, якога, нажаль, няма ўсьцяж у яго рэальным жыцьці.

У цэнтры канцэрту, як заўсёды, стаяў артыст Забэйда. Ён сьпяваў з вялікім мастацкім уздымам. Апроч дзьвюх невялічкіх, але цудоўных пэрлінак Моцарта і Бэтховэна, красу якіх артыст адцяніў запраўды-ж мастацка-тонкай аддзелкай дэталяў, блізу ўся рэшта праграмы была ахвяравана народнай музыцы, пераважна, як сказана, беларускай. Бо-ж дзьве песьні Манюшкі стаяць, як блізу ўсё яго творства, на граніцы народнай і „культурнай" музыкі. Блізу чыста народнымі, нават пахнуўшыя яшчэ сьвежа паднятай ськібаю літоўскай зямлі, былі дзьве песьні літоўскага кампазытара Шымкуса. Усё гэта выканаў артыст з уласьцівай яму мастацкай тонкасьцю і блескам. Але ўсё гэта не захоплівала глыбей — ані самога артыста, ані, як вынік гэтага, — і слухача. Слухачы, ведаючы ўжо добра, чаго можна спадзявацца ад мастака, чакалі з нецярплівасьцю далейшага. І вось — дачакаліся. Калі сьпявак запяяў пабеларуску беларускія народныя песьні ды новастворыныя на іх аснове, дый на словы нашых паэтаў, рамансы, — і ён сам „прэабразіўся", быццам узышоў на гару „Фавор", і слухачы адразу пачулі над ім і ў ім ласку Божую... Ён увесь зазьяў, засьвяціўся, паміж ім і слухачамі адразу перакінуліся залатыя ніці-коскі, якія злучылі ўсіх, што былі ў салі, у адну духоўную істоту — амаль як у сьвятыні. Бо-ж так заўсёды дзеіць запраўднае мастацтва, якое, як даводзяць сучасныя філёзафы рэлігіі, зьяўляецца як быццам „сенцамі", якія вядуць у харомы апошняй...

Родная песьня захапіла ўсю істоту артыста, а ня толькі яго высокі музычны інтэлект і яго віртуозную тэхніку мастака першае клясы. І гэта, як сказана, адразу перадалося аўдыторыі. У выкананьні беларускай песьні наш мастак ня толькі ня мае канкурэнтаў, але зьяўляецца сам запраўднай „рэвэляцыяй". Беларуская песьня, беларускі романс — запраўдная „рэгалія" артыста. Тут — запраўдная творчая яго арыгінальнасьць. Бо-ж кожны мастак, ці тварэц, ці выканаўца, які таксама мае нешта ад тварца, калі ён — запраўдны мастак, — заўсёды, у сваіх вышэйшых узьлётах, неадарвана зьвязаны з найглыбейшымі нетрамі роднае народнае стыхіі. Адсюль плыве тая сьветлая пэўнасьць сябе і радасьць, якую адчувае кожны мастак дый якой заражае ён другіх моцна абапёршыся на глыбокія карэньні, якія — праз родную Матку-Зямлю — лучаць яго з апошнімі асновамі самога сусьвету. Мастак можа сьмела расьці ў вышыню, каб у сваіх найвышэйшых узьлётах, як быццам зірнуць у твар Самога Бога, дый ад Яго несьці людзям нізіны і цяжкай працы найвышэйшую радасьць сьвятога мастацтва... Ня дзіва, што артыста з Божае ласкі прымалі з захопленьнем... Дый ня толькі Беларусы, якіх, зразумела, было найбольш у прасторнай, але поўнай да краёў залі ўнівэрсытэту. Саля была напоўнена ўсімі тымі, каго прыцягівала наагул жывая творчая душа народнага масыву, якая з такім хараством адбілася ў красуні-песьні беларускага народу... Артыста выклікалі без канца, паднясьлі яму кветкі.

Дзякуй яму за тое, што ён даў, за тое, што ён усьцяж робіць для пашырэньня і славы беларускай песьні — для падняцьця жывой душы беларускага народу.

Ул. Чэмер

Хроніка

— 27 лістапада Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні зарганізаваў вечар літоўскай літаратуры. У праграму вечару ўходзілі рэфэрат аб літоўскай літаратуры і дэклямацыі перакладзеных на беларускую мову твораў літоўскіх паэтаў. Рэфэрат дужа хораша і рачова, даючы ў ім усю гісторыю літоўскай літаратуры, як старой так новай і сучаснай, прачытала віленская літоўская паэтка Она Міцюте. Дэклямаваліся вершы з віленскіх літаратараў: О. Міцюте, А. Жукаўскаса, Ё. Кекштаса, з ковенскіх—Ё. Коссу-Александравічыуса і К. Боруты.

— 10 сьнежня адбыўся ў Вільні канцэрт з удзелам слаўнага нашага сьпевака Міхала Забэйды-Суміцкага і хору Бел. Студэнцк. Саюзу пад кіраўніцтвам гр. Р. Шырмы. Канцэрт прайшоў вельмі ўдачна. Арганізаваў яго Белар. Студ. Саюз.

З нястачы месца, падаём у гэтым нумары часапісу толькі рэцэнзыю на выступленьне Міхала Забэйды-Суміцкага, аб хору і выкананых ім песьнях зьмесьцім артыкул у наступным нумары.

— 6 і 7 сьнежня выступаў у Вільні ведамы варшаўскі балет Таццяны Высоцкай. У праграму выступленьня між іншым уваходзіў уложаны Высоцкай і аснаваны на беларускіх народных матывах балет „Юр'я".

— Нядаўна ў Мюнхене выйшла кніжка А. Сандэрс'а — „Um die Gestaltung Europas" (Аб перабудове Эўропы), у якой нямала гаворыцца і аб Беларусі.

— Т-ва Навуковае Помачы ім. Ўрублеўскіх у Вільні выдала друкам папольску магістэрскую працу Хведара Ільляшэвіча п. з. „Drukarnia Domu Mamoniczów w Wilnie", у якой аўтар шырока прадставіў гісторыю і дзейнасьць гэтай слаўнай беларускай друкарні (1575—1622).

— Беларускі паэт і пісьменьнік Вінцук Адважны (Марыянін кс. Я. Гэрмановіч), пасьля высяленьня а.а. Марыянаў з Друі, улетку выехаў з Вільні. Пражывае цяпер у Рыме.

— 27.XII. 1938 г. выехалі з Вільні, выселеныя з прыгранічнай паласы на 5 год рашэньнем віленскага ваяводы, беларускія культурныя дзеячы: кс. Адам Станкевіч, кс. Уладыслаў Талочка і інж. Адольф Клімовіч. Пражываюць яны цяпер (за прыгранічнай паласой): першы—ў Слоніме, другі — ў Беластоку, трэці — ў Варшаве. Высяленцы ад рашэньня ваяводы злажылі рэкурс да Міністра Унутраных спраў.

— Кс. Адам Станкевіч яшчэ перад высяленьнем пасьпеў выдаць друкам сваю чарговую, вельмі вартасную, кніжку „Беларускі хрысьціянскі рух".

У наступным нумары нашага часапісу падамо на яе рэцэнзію. Кніжка фармату 8⁰ налічае 280 бачын і каштуе ўсяго 2 зл.

Паважаны Аўтар піша цяпер новую кніжку „Хрысьціянства і Беларускі народ".

— У Беларускім Навуковым Т-ве. Гістарычная сэкцыя пасьвяціла дзьве свае зборкі — 13 і 20 лістапада — выслуханьню абшырнага рэфэрату свайго сябры мгра С. Паўловіча на тэму „З гісторыі беларускае царквы" і дыскусіі аб ім. З увагі на вельмі цікаўныя мамэнты, закранутыя дакладчыкам — добрым знаўцам свайго прадмету,—узьнялася жывая дыскусія, у каторай было адзначана шмат іншых мамэнтаў, вартых распрацоўкі нашымі дасьледчыкамі на ніве беларускае гісторыі.

10 і 12 сьнежня адбылася другая ўжо за 1938 год урадавая праверка дзеяльнасьці і маемасьці Беларускага Навуковага Т-ва. Праверка была зроблена па загаду віленскага гарадзкога старасты. Рэвізоры не знайшлі ніякіх адхіленьняў ад статуту Т-ва і дзеючых законаў. Каса і маемасьць знойдзена ў поўным парадку.

— У Беларускім Музэі ім. Ів. Луцкевіча за 1938 год лічба аглядаўшых Музэй дасягла 5285 асобаў (у тым 113 экскурсіяў). Дагэтуль гадавая фрэквэнцыя не дасягала 5 тысяч у год, і сёлетняя цыфра паказвае сталы ўзрост зацікаўленьня грамадзянства Беларускім Музэям.

За той-жа 1938 год Белар. Музэй атрымаў ад розных асобаў ахвяр і дэпозытаў рэчамі 165, да таго-ж 331 манэту і 78 банкнотаў.

Даведываемся, што Музэй атрымаў ад старога беларускага дзеяча з Коўна інж.-арх. Кляўдыюша Душэўскага паведамленьне, што з сваіх заробкаў ён пастанавіў выплачваць даволі значную суму штомесячна на дапамогу Музэю.

Як ведама, Музэй, пазбаўлены дзяржаўнае дапамогі ад чэрвеня 1938 году, утрымліваецца выключна за складкі сяброў і прыхільнікаў Музэю. Сума, здабываная што-месяц гэтым шляхам, пакрывала дагэтуль толькі выдаткі на аплату музэйнага памяшчэньня ў дзяржаўным гмаху і на неадкладныя бягучыя патрэбы. Дапамога інж. Душэўскага дасьць магчымасьць хоць мінімальнае аплаты ахвярнае працы музэйных работнікаў.

Гожа адзначыць, што інж. Душэўскі ўжо каля 20 гадоў жыве ў Коўне і сваей фаховай працай здабыў для сябе паважныя матар'яльныя падставы быту, каторыя далі яму магчымасьць ня толькі пабудаваць для сябе пекны дом у сталіцы Літвы, але, як бачым, і дапамагчы із сваіх заработкаў беларускай культурнай установе. Пажадаем, каб за ягоным прыкладам пайшлі і другія заможныя Беларусы, лічба каторых з году ў год узрастае.

— У канцы кастрычніка ў сталіцы Савецкай Беларусі — Менску — адбылася трэцяя ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасьці. Удзел у выступленьнях на алімпіядзе прыняло звыш 1,500 лепшых сьпевакоў, танцораў, музыкантаў, якія рэпрэзэнтавалі шматтысячную армію ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасьці беларускага народу. Сярод удзельнікаў алімпіядыстаў была ня толькі моладзь, але, хоць у малым ліку, і старэйшыя асобы, з якіх адрозьніваліся здольныя мастакі-самадзейнікі: напр. 70 гадовы калгасьнік Кірэй Запатылак, які памастацку выконывае беларускія народныя танцы, 75 гадовы калгасьнік Міхал Панцялеенка, выканаўца беларускіх народных мэлёдыяў на жалейцы.

Мастацкая самадзейнасьць паказала, які багаты беларускі народ талентамі.

— 2-га сьнежня закончылася усебеларуская выстаўка народнага выяўленчага мастацтва. Выстаўка трывала месяц часу і яе адведала 43 тыс. асоб.

Асаблівую ўвагу наведывальнікаў зварочвалі абразы — вышыўкі. Пасьля выстаўкі спэцыяльнае журы раздало 96 асобам-мастакам прэміі. Першую прэмію ў суме па 1000 руб. атрымалі мастакі-самавукі Павaрыч і Ліпай. Лепшыя экспанаты гэтай выстаўкі будуць высланы на ўсесаюзную выстаўку ў Маскву.

— У лістападзе ў Менску адбылася выстаўка работ маладых мастакоў Беларусі. Вызначылася творчасьць наступных мастакоў: Зайцава, Пашкевіча, Ціхановіча, Гаўрыленкі, Монасзона, Дакальскай і Тарасіка. Мастак Тарасік праявіў нязвычайны талент; крытыкі варожаць Тарасіку вялікую мастацкую будучыню. Таксама вельмі абяцаючым мастаком паказаўся Красоўскі.

— У кастрычніку адбылася ў Менску нарада драматургаў Савецкай Беларусі. На нарадзе прысутнымі былі і госьці з іншых рэспублік Савецкага Саюзу.

На нарадзе абгаварывалі плян працы драматургаў на будучыню і справы арганізацыйнага характару. Між іншым на нарадзе прысутныя даведаліся, што: З. Бядуля мяркуе напісаць новую п'есу на тэму калгаснага жыцьця, К. Крапіва прыступіў да напісаньня новай сатырычнай камэдыі на сучасную тэматыку, Я. Колас піша п'есу аб Крычаўскім паўстаньні.

— Радыёкамітэт Савецкай Беларусі паміж 1—10 кастрычнікам правodзіў радыёконкурс на лепшую мастацкую самадзейнасьць. У конкурсе прымалі ўдзел лепшыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы мастацкай самадзейнасьці з дваццаці раёнаў Беларусі. Да конкурсу прыступіла 20 харавых і музычных калектываў

і 25 індывідуальных выканаўцаў. Агульная колькасьць удзельнікаў — 524 асобы. Пасьля конкурсу радыёкамітэт выбраным выканаўцам і калектывам раздаў каля 20-ці прэміяў на суму 4 тыс. руб.

— Ад 12 да 30 лістапада ў Менску адбылася дэкада савецкай музыкі. У праграму дэкады былі ўключаны творы старэйшых савецкіх кампазытараў і кампазытарскага маладняка. Беларускіх савецкіх кампазытараў рэпрэзэнтавалі: Аладаў, Цікоцкі, Туранкоў і Залатароў.

Спэцыяльны канцэрт быў прысьвечаны творчасьці кампазытараў Савецкай Украіны. У дэкадзе бралі ўдзел хор і аркестр беларускіх народных інструмэнтаў.

— 23 сьнежня адбыўся ў Менску выпуск слухачоў 3-х месячных курсаў на кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасьці пры доме народнай творчасьці Б.С.С.Р. Курсы скончылі 106 удзельнікаў, з іх: 28 кіраўнікоў драматычных гурткоў, 15 харавых, 32 танцавальных і 31 музычных.

— У сьнежні адбылася ў Менску дэкада Акадэміі Навук Б. С. С. Р. На паседжаньнях былі абгаварываныя справы выключна гаспадарчага характару (Эканоміка Беларусі). Справы гуманістычных навук зусім не разгляданы.

— Кіностудыя „Савецкая Беларусь" выпусьціла поўнаметражны навукова папулярны фільм „Геаграфія Б.С.С.Р.". Фільм гэты паказывае багацьці Савецкай Беларусі і празначаны ў дапамогу школьнікам.

— Пісьменьнік Адвард Самуйлёнак напісаў новую п'есу п. заг. „Пагібель ваўка". Крытыкі і пісьменьнікі ацанілі твор, як высока мастацкі і арыгінальны ў беларускай літаратуры. Арыгінальны ён тым, што глыбака філёзофічны.

Гэты твор ставіць Самуйлёнка, як кажуць крытыкі, у рады лепшых пісьменьнікаў Савецкага Саюзу.

— Беларускія пісьменьнікі З. Бядуля, П. Броўка і М. Клімковіч езьдзілі ў Кіеў з рукапісам — перакладам „Кабзара" Т. Шэўчэнкі на беларускую мову, дзеля сконфрантаваньня з арыгінальнымі выданьнямі ўспомненага твору.

— Нядаўна выйшаў з друку новы твор—п'еса М. Клімковіча „Кацярына Жарнасек". Гэты твор ужо ставіцца на сцэнах тэатраў Савецкай Беларусі.

— Ад 6 да 9 сьнежня адбываўся ў Менску першы зьезд мастакоў Савецкай Беларусі. На зьезьдзе прысутнымі былі дэлегаты з усіх куткоў Беларусі.

На зьезьдзе абгаварываліся справы арганізацыйныя і творчыя.

— У лістападзе ў дзяржаўным выдавецтве Беларусі адбылася нарада актыву выдавецтва разам з прадстаўнікамі пісьменьнікаў, кнігагандлю, прысьвечаная абмеркаваньню праекту тэматычнага пляну Дзярж. Выд. Беларусі на 1939 год. Паводле намечанага пляну мае быць выдрукавана Д.В.Б. у 1939 г. 600 назоваў кніг. З гэтага на беларускую арыгінальную літаратуру празначана толькі 16 назоваў!

Як бачым, беларускае арыгінальнае творства зводзіцца ў „незалежнай" Беларусі да нуля. Затое 584 кніжкі будуць перакладзеныя, зразумела, з „об'щепонятнаго" расейскага языка.

Супрацоўнікі «Калосься»: *В. Багдановіч, А. Бужанскі, А. Бярозка, М. Васілёк, Ст. Грынкевіч, А. Дубровіч, Хв. Ільляшэвіч, А. Іверс, С. Каліна, А. Клімовіч, Я. Крыга, М. Машара, М. Пяцюкевіч, С. Сахараў, Кс. А. Станкевіч, Я. Станкевіч, П. Сірата, П. Сергіевіч, М. Танк, С. Хмара, А. Чэмер, Ул. Чэмер, М. Шкялёнак, Р. Шырма.*

Redaktor-Wydawca Jan Szutowicz Рэдактар-Выдавец Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш. друкі

Ad. Stankievič, Biełaruski Chryścijanski ruch. Вільня 1939.
Ateneum Wileńskie, XIII, сшытак 2. Вільня 1938.
Беларускі Летапіс, № 4-5, Вільня 1938.
Богословія, XVI, кн. 4. Львоў 1938.
Droga pracy, № № 8, 9—10. Крамянец 1938.
Orientala christiana periodica, IV, № III.—IV. Рым 1938.
Oriens, сш. 6 і наст. Варшава 1938.
Hrvatska Revija, № № 11—12. Загрэб 1938.
Lietuviškas Baras, № № 11—12, Вільня 1938.
Летопис Матице српска, за ліпень—сьнежань. Новы сад 1938.
Українська книга, І—VII. Львоў 1938.
Kamena, (51—54). Хэлм Люблінскі 1938.
Kuźnica, № 19 і наст. Катовіцы 1938.
Polityka, № № 26—29. Варшава 1938.
Slavia, XVI, сш. 1. Прага 1938.
Sygnały, № № 56—59. Львоў 1938.

У нумары 2 (15) „Калосься" надрукаваны мой інфармацыйны артыкул аб грузінскім паэце Шота Руставелі і ягонай паэме „Віцязь у тыгравай скуры". Не падаў я ў артыкуле літаратуры, з якой карыстаў, і гэта лічу ягоным недахопам. Карыстаў-жа я з наступнай літаратуры, — іменна з адносных артыкулаў, зьмешчаных у часапісах: „Літаратура і Мастацтва" №№ 68 і 69, 1937 г., „Полымя рэвалюцыі" № 12, 1937 г., „Дзвоні" № 1 — 2, 1938 год.

Я. Шутовіч

Ад Рэдакцыі:

Выхад з друку гэтага нумару часапісу, з незалежных ад рэдакцыі прычын, спозьніўся. Друкарскі набор чарговага нумару пачнецца ў першай палавіне лютага 1939 г. Просім дзеля гэтага Паважаных Супрацоўнікаў парупіцца ў пару прыслаць матарыялы.